WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 ЛІПЕНЯ 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 141
(27005)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС БУДЗЕ ПРЫНЯТА КАНЧАТКОВАЕ РАШЭННЕ АБ ВЫХАДЗЕ НА АДЗІНЫ АБМЕННЫ КУРС БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ»

У Беларусі ў бліжэйшы час будзе прынята канчатковае рашэнне аб выхадзе на адзіны абменны курс беларускага рубля. Аб гэтым заявіў 27 ліпеня Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам старшыню праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Надзею Ермакову.

«Думаю, што ў бліжэйшы час нам трэба будзе канчаткова прыняць рашэнне, таму што інфармацыі сёння дастаткова для таго, каб адкрыта сказаць, што мы будзем рабіць, якое рашэнне будзем прымаць», — сказаў Прэзідэнт. Ён папрасіў Надзею Ермакову выказаць свой пункт гледжання аб перспектывах не проста стабілізацыі валютнага рынку, але выхаду на адзіны абменны курс беларускага рубля ў краіне.

Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што ААТ «ААБ Беларусбанк» на рынку банкаўскіх паслуг краіны з'яўляецца не проста вядучым банкам, а мае значную перавагу, пацікавіўся ў Надзеі Ермаковай сітуацыяй, якая складваецца цяпер у банкаўскай сферы, у сферы фінансаў, а таксама тым, якая назіраецца дынаміка. «Часу прайшло дастаткова для таго, каб даваць ацэнкі, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Я размаўляў са многімі банкірамі, але ўсё ж такі Ашчадны банк — люстэрка фінансавага стану краіны. Таму хацеў бы пачуць, якая сітуацыя на сёння і якая дынаміка».

Акрамя таго, Прэзідэнт выказаў жаданне пачуць, як ААТ «ААБ Беларусбанк» выконвае праграму крэдытавання беларускіх прадпрыемстваў. «Якія тут вострыя пытанні? Зразумела, што сітуацыя няпростая, але тым не менш, якая яна ў плане фінансавання, крэдытавання вашых кліентаў, прадпрыемстваў?» — спытаў кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адным важным пытаннем Аляксандр Лукашэнка лічыць тое, як забяспечваецца валютай насельніцтва.

«Мы дамаўляліся аб тым, што Ашчадны банк, цяпер ужо і іншыя гэту функцыю на сябе бяруць, забяспечыць продаж валюты насельніцтву пад неабходныя патрэбы: хвароба, вучоба. І тое — вучоба з якой мэтай, у інтарэсах дзяржавы або для папаўнення пятай калоны, як у нас некаторыя вучацца за мяжой. Гэта дзяржаўная паслуга, і яна павінна аказвацца ў інтарэсах дзяржавы», — адзначыў Прэзідэнт.

Надзея Ермакова, характарызуючы ў цэлым сітуацыю ў банкаўскай сістэме і на фінансавым рынку, адзначыла яе стабілізацыю. Паводле яе слоў, «насельніцтва супакоілася і з 10 чэрвеня ідзе прыток укладаў у банкаўскую сістэму». За 26 дзён ліпеня прырост укладаў у беларускіх рублях у ААТ «ААБ Беларусбанк» склаў Br150 млрд, у цэлым жа па краіне гэта лічба перавышае Br200 млрд. Што датычыцца валютных укладаў, то іх адток у цэлым таксама спыніўся і ўжо ў асобных банках, дзе працэнтныя стаўкі вышэйшыя, ідзе невялікі прыток.

Надзея Ермакова яшчэ раз падкрэсліла, што ў цэлым у банкаўскай сістэме краіны стабільная сітуацыя. Паводле яе слоў, курсы замежных валют, устаноўленыя Нацбанкам, адлюстроўваюць рэальны ўзровень і не стрымліваюцца адміністрацыйнымі метадамі.

Кіраўніку дзяржавы было таксама даложана аб сітуацыі ў ААТ «ААБ Беларусбанк» з крэдытаваннем дзяржаўных праграм, фінансаваннем будаўніцтва жылля.

ААТ «ААБ Беларусбанк» удзельнічае ў крэдытаванні больш як 50 дзяржпраграм, асноўнай з якіх з'яўляецца будаўніцтва жылля, а таксама крэдытаванне сельскай гаспадаркі. Паводле слоў Надзеі Ермаковай, грашовыя рэсурсы па гэтых напрамках прадастаўляюцца своечасова і ў неабходных аб'ёмах.

Прэзідэнт даручыў больш мэтанакіравана выкарыстоўваць крэдытныя рэсурсы ў рамках дзяржаўных праграм, скарачаючы магчымыя расходы і затраты. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, да кожнай сітуацыі неабходны індывідуальны падыход.

Надзея Ермакова назначана старшынёй праўлення Нацбанка Беларусі

ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў Надзею Ермакову старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Беларусі з далейшым узгадненнем яе назначэння з Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 27 ліпеня.

Фота БЕЛТА.

ЕРМАКОВА НАДЗЕЯ АНДРЭЕЎНА нарадзілася ў 1953 годзе ў вёсцы Разальмова Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1978 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава.

Пасля заканчэння ў 1971 годзе Пінскага ўлікова-крэдытнага тэхнікума працавала крэдытным інспектарам, старшым крэдытным інспектарам, намеснікам кіраўніка Хоцімскага аддзялення Дзяржбанка, намеснікам кіраўніка Кіраўскага аддзялення Дзяржбанка, кіраўніком Шклоўскага аддзялення Дзяржбанка, намеснікам старшыні райвыканкама і старшынёй плануючай камісіі Шклоўскага райвыканкама, загадчыкам фінансавага аддзела Шклоўскага райвыканкама, кіраўніком філіяла камерцыйнага банка «Паўночны Захад» у Шклове, кіраўніком аддзялення Белаграпрамбанка ў Шклове. З 1996 года — намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк», старшыня праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі першага, другога, трэцяга і чацвёртага скліканняў. З'яўлялася членам праўлення Нацыянальнага банка Беларусі.

Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ордэнам Пашаны. З 1999 года — старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уга Чавеса з днём нараджэння

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса з нагоды яго дня нараджэння.

«Мне вельмі прыемна адзначыць, што дзякуючы тваёй канструктыўнай палітыцы паспяхова пашыраецца беларуска-венесуэльскі міждзяржаўны дыялог, мацнее сяброўства паміж нашымі народамі», — гаворыцца ў віншаванні.

«Я ганаруся тым, што сумеснымі намаганнямі мы стварылі добрую атмасферу ўзаемаразумення, паглыбілі плённае двухбаковае супрацоўніцтва дзеля дабрабыту і росквіту нашых краін», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Хойніцкія дзеці прызвычаіліся бавіць вольны час на ролікавых каньках і веласіпедах.

«КВАРТЭТ» НА КОЛАХ

ПАЧАЎСЯ ЭТАП АКТЫЎНЫХ ДЗЕЯННЯЎ СУМЕСНАЙ ШТАБНОЙ ТРЭНІРОЎКІ УЗБРОЕННЫХ СІЛ

У 11-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгадзе ўчора пачаўся этап актыўных дзеянняў у рамках сумеснай штабной трэніроўкі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

Раней на першым этапе 103-я гвардзейская асобная мабільная брыгада адпрацавала пытанні пераводу воінскіх часцей злучэння з мірнага на ваенны час. Брыгаду наведаў дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Леанід Мальцаў. Камандаванне злучэння атрымала распараджэнне на правядзенне брыгадай маршу ў раён баявога прызначэння. Пры гэтым аэрамабільнаму батальёну злучэння пастаўлена важная задача выканаць практычныя дзеянні ў якасці перадавога атрада.

Па сігналу трывогі былі прыведзены ў баявую гатоўнасць два падраздзяленні 11-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады — 40-ы гвардзейскі асобны механізаваны батальён і 7-ы гвардзейскі асобны танкавы батальён брыгады са сродкамі ўзмацнення.

Ваеннаслужачыя двух батальёнаў вывелі з парку баявой тэхнікі на марш практычна ўсё ўзбраенне і тэхніку. Усяго ў калонах батальёнаў было пабудавана каля 70 адзінак аўтамабільнай тэхнікі, 60 танкаў Т-72 і БМП-2, а таксама іншая тэхніка, якая забяспечвае перамяшчэнне ўзбраення і боепрыпасаў.

Паводле звестак Мінабароны, цяпер калоны падраздзяленняў праводзяць 40-кіламетровы марш на 230-ы агульнавайсковы палігон. Яны ўжо зрабілі два пераходы праз дарогі рэспубліканскага значэння, а таксама пераадолелі водную перашкоду — раку Шчара — па пантоннай пераправе.

Твае правы

СТРАСЦІ ПА КАНТРАКЦЕ

УЧОРА адбылася чарговая «прамая тэлефонная лінія» і online-канферэнцыя з намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Ігарам СТАРАВОЙТАВЫМ. На працягу 1,5 гадзіны жыхары нашай краіны задавалі Ігару Рыгоравічу пытанні, звязаныя з прымяненнем кантрактнай формы найму. Найбольш цікавыя з іх мы прыводзім ніжэй.

З улікам таго, што ў найбліжэйшай будучыні Беларусь плануе ўвайсці ў Адзіную эканамічную прастору, ці плануе Міністэрства працы ўнесці змены ў Працоўны кодэкс з мэтай уніфікацыі сістэмы заключэння кантрактаў, напрыклад, з расійскім заканадаўствам, дзе кантракты заключаюць не паўсюдна, як у Беларусі, а па строга абмежаваным спісе відаў працоўнай дзейнасці, якія прадугледжваюць непастаянны характар занятасці?

Падрыхтаваны праект Закона РБ «Аб унясенні змяненняў у законы, якія рэгулююць працоўныя і звязаныя з імі адносіны», які ўнесены ва ўрад краіны, патлумачыў намеснік міністра. Праект Закона не прадугледжвае змяненняў існуючага парадку заключэння кантрактаў. У бліжэйшы час рэформа ў заключэнні кантрактаў не плануецца.

Шэраг пытанняў, адрасаваных Ігару Рыгоравічу, тычыўся кантрактаў на перыяд часовай адсутнасці асноўнага работніка. Напрыклад: жанчыну прымаюць на працу на перыяд знаходжання асноўнага работніка ў сацыяльным водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трохгадовага ўзросту. Ці можа наймальнік заключыць з часова нанятай работніцай кантракт на гэты перыяд?

Прымаючы работніка на перыяд знаходжання асноўнага работніка ў сацыяльным водпуску па цяжарнасці і родах, а таксама па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, з ім варта заключаць тэрміновы працоўны дагавор, патлумачыў Ігар Старавойтаў. Аднак канкрэтная дата заканчэння тэрміну працоўнага дагавора пры гэтым не пазначаецца, паколькі ў асноўнага работніка ёсць права перапыніць свой сацыяльны адпачынак і выйсці на працу. У адпаведнасці з Працоўным кодэксам працоўны дагавор, заключаны на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, спыняецца з дня, які папярэднічае дню выхаду гэтага работніка на працу. Звальненне ў гэтым выпадку праводзіцца ў сувязі з заканчэннем тэрміну працоўнага дагавора.

Намеснік міністра звярнуў увагу на тое, што заканадаўства аб працы не ўтрымлівае забароны на заключэнне кантракта з работнікам, прынятым на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, за якім захоўваецца месца працы. Аднак заключэнне кантракта на пэўны тэрмін (адзін, два, тры гады) ні наймальніку, ні работніку не дае гарантыі на падаўжэнне працы на ўвесь тэрмін, прапісаны ў кантракце, паколькі абодва бакі могуць стаць «заложнікамі» сітуацыі (калі жанчына, перапыніўшы свой сацыяльны адпачынак па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трохгадовага ўзросту, у любы дзень можа выйсці на працу). Пры гэтым у наймальніка ў такой сітуацыі не будзе падстаў для звальнення работніка, прынятага па кантракце на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, за якім захоўваецца месца працы.

Такім чынам, падсумаваў прадстаўнік Мінпрацы, пры вырашэнні пытання аб заключэнні кантракта з працаўніком, прынятым на перыяд выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, за якім у адпаведнасці з Працоўным кодэксам захоўваецца месца працы, наймальнік павінен ведаць аб наступствах, якія могуць паўстаць у выпадку датэрміновага выхаду жанчыны з сацыяльнага водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў.

***А вось падобная сітуацыя, якая ўскладнілася нараджэннем немаўляці:* «Са мной быў заключаны тэрміновы працоўны дагавор на перыяд знаходжання асноўнага работніка ў сацыяльным водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў. Да заканчэння тэрміну працоўнага дагавора я нарадзіла дзіця, у сувязі з чым мне таксама прадастаўлены сацыяльны водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў. Асноўны работнік збіраецца выйсці на працу. Ці мае права наймальнік у такой сітуацыі мяне звольніць? Ці ёсць у мяне гарантыі па падаўжэнні працоўнага дагавора?»**

Пры прыёме на працу работніка на перыяд выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, за якім захоўваецца месца працы, з працаўніком заключаецца тэрміновы працоўны дагавор. Пры гэтым невядомая дата яго заканчэння, паколькі асноўны работнік можа ў любы час прыступіць да выканання сваіх абавязкаў. У адпаведнасці з Працоўным кодэксам, працоўны дагавор, заключаны на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, спыняецца з дня, які папярэднічае дню выхаду гэтага работніка на працу. Звальненне ў гэтым выпадку адбываецца ў сувязі з заканчэннем тэрміну працоўнага дагавора. На гэтай падставе можа быць звольнена любая катэгорыя работнікаў, у тым ліку цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія знаходзяцца ў сацыяльным водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў. Гарантыі па падаўжэнні працоўных адносін з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі, якія знаходзяцца ў сацыяльных водпусках па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў, прадугледжаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 180 «Аб парадку прымянення Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 29», на тых, хто працуе па тэрміновым працоўным дагаворы, не распаўсюджваюцца.

Калі адны імкнуцца «заключыцца» кантрактам для атрымання большых сацыяльных гарантый, то многія, наадварот, — намагаюцца яго скасаваць. І, як паказала «прамая лінія», атрымліваецца гэта далёка не ва ўсіх. Напрыклад, спецыяліст, які працуе на кантрактнай аснове, напісаў заяву аб датэрміновым скасаванні кантракта ў сувязі з пераменай месца жыхарства, аднак наймальнік адмаўляецца яго звольніць да заканчэння тэрміну дзеяння кантракта. Ці правамерныя дзеянні наймальніка? Якім чынам можна звольніцца работніку?

Тэрміновы працоўны дагавор падлягае скасаванню датэрміновага па патрабаванні работніка ў выпадку яго хваробы ці інваліднасці, якія перашкаджаюць выкананню работы па працоўным дагаворы, парушэнні наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага або працоўнага дагавора і па іншых уважлівых прычынах.

СТАР. 2

НЕ МЕНШ ЯК 10 ІЛЬНОЗАВОДАЎ У БЕЛАРУСІ МАДЭРНІЗУЮЦЬ ПА ЕЎРАПЕЙСКІХ ТЭХНАЛОГІЯХ

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч у час рабочай паездкі ў Карэліцкі раён, перадае БЕЛТА.

Кіраўнік урада адзначыў, што ў цэлым сур'ёзная мадэрнізацыя закране 12-15 ільнозаводаў. «Не менш як дзесяць з іх будзе абсталявана па еўрапейскіх тэхналогіях», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. У Гродзенскай, Брэсцкай і Віцебскай абласцях з выкарыстаннем сучасных тэхналогій ужо мадэрнізаваны тры ільнозаводы. «Пасля таго, як будуць абсталяваны астатнія, можна будзе рэальна гаварыць аб атрыманні 60 тыс. тон высакаякаснага льновалакна», — дадаў прэм'ер-міністр.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб перспектывах фарміравання ў Беларусі льняных холдынгаў, прэм'ер-міністр сказаў, што аб'яднанні льнозаводаў у буйныя кампаніі — даволі перспектыўныя праекты, аднак яны не павінны быць механічнымі аб'яднаннямі.

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што ўрад трымае пытанне па выхаду льногаліны на рэнтабельную работу на асаблівым кантролі. «Урад хвалюе пытанне рэнтабельнасці з улікам таго, што ідзе даволі вялікая дзяржаўная датацыя і падтрымка льнаводства», — адзначыў прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, прадпрыемствы галіны павінны сёння сур'ёзна працаваць над якасцю выпускаемай прадукцыі, пралічваць эканоміку сваіх праектаў. «Пакуль мы не можам пахваліцца тым, што ў нас вытворчасць ільновалакна і вырабаў з лёну рэнтабельная, нават з улікам росту экспартных цэн не забяспечваецца дадатная рэнтабельнасць вытворчасці. Гэта вялікая задача», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб магчымасцях прыцягнення ў галіну замежных інвестыцый, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што тут няма ніякіх абмежаванняў. Аднак у свеце ўсё менш кампаній займаюцца вытворчасцю ільновалакна. Ёсць канкурэнцыя паміж перапрацоўшчыкамі, каб атрымаць з датацыйнага і адносна таннага валакна высакаякасную прадукцыю, сказаў ён. «Да таго часу, пакуль Беларусь не выйдзе на прадукцыю высокай якасці, аб рэнтабельнасці гаварыць не даводзіцца», — лічыць прэм'ер-міністр.

Міхаіл Мясніковіч азнаёміўся з ходам уборкі ўраджаю збожжавых культур і нарыхтоўкі кармоў аграрыямі птушкафабрыкі «Чырвонаармейская», наведаў ААТ «Карэлічылён», дзе сустрэўся з прадстаўнікамі працоўнага калектыву прадпрыемства.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ў гэтым годзе аграрыі Беларусі атрымалі даволі добры ўраджай збожжавых. «Цяпер галоўнае — узяць гэты хлеб, і для гэтага сфарміраваны неабходныя ўмовы — паліва ёсць, транспарт ёсць, тэхніка ёсць, сушыльныя комплексы гатовы, — сказаў ён. — Цяпер мы ловім кожную хвіліну добрага надвор'я, каб убраць хлеб». Паводле слоў кіраўніка ўрада, якіх-небудзь сур'ёзных праблем, якія маглі б перашкодзіць своечасовай і якаснай уборцы ўраджаю, няма. Ёсць асобныя праблемныя пытанні, але ўсе яны вырашальныя.

У цэлым прэм'ер-міністр даў станоўчую ацэнку рабоце аграрыяў на ўборачнай кампаніі. «Радуе, што яны выконваюць тыя дамоўленасці, якія былі выпрацаваны», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МАГІЛЁЎСКІ ТАВАРНЫ ПАТРЫЯТЫЗМ

У Магілёве з'явіліся паліцы з таварамі, адзначаным спецыяльным знакам «Зроблена на Магілёўшчыне», разам з гербам рэгіёна. Гэта эксперымент абласнога ўпраўлення гандлю, і адна з яго мэт — развіццё таварнага патрыятызму.

Акцыю падтрымалі асноўныя гандлёвыя сеткі ў вобласці. Са спецыяльным знакам цяпер прадаюцца прадукты харчавання — хлеб, мясныя і малочныя вырабы.

— Магілёўскія тавары зарэкамендавалі сябе з лепшага боку, яны карыстаюцца вялікім попытам, — растлумачыў **начальнік упраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама Алег БУЯНАЎ**. — У іншых рэгіёнах «Зроблена на Магілёўшчыне» будзе ўспрымацца як знак якасці.

Ілона ІВАНОВА.

ПАРКОВАЧНАЕ ПЫТАННЕ

У Мінску за студзень—чэрвень гэтага года ў дварах дамоў абуладкавана 3129 дадатковых парковачных месцаў.

За студзень—чэрвень гэтага года ў дварах жылых дамоў, якія знаходзяцца на абслугоўванні ЖРЭА раёнаў, пабудаваны 3129 дадатковых парковачных месцаў, у тым ліку 87 — з прыцягненнем сродкаў жыхароў у памеры 21,1 млн рублёў. Пра гэта паведамілі ў ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» (МГЖГ).

Фота БЕЛТА.

Такім чынам, кожны з аўтаўладальнікаў унёс у сярэднім 241 тыс. рублёў, а ўзамен атрымаў пераважнае права карыстацца аплачаным стаяначным месцам, на якое наносіцца нумарны знак яго машыны.

Такія паркоўкі, удакладнілі ў МГЖГ, маюць лёгкае часовае пакрыццё, якое можна без вялікай цяжкасці разабраць на выпадак правядзення работ па замене або рамонце пракладзеных у зямлі камунікацый.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,
«Мінск—Навіны».

ЗОЛАТА НА ЕЎРАПЕЙСКІМ ЮНАЦКІМ ФЕСТЫВАЛІ

Беларускі дзюдаіст Дзмітрый Мінькоў заваяваў золата на XI летнім Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі ў турэцкім Трабзоне, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе НАК Беларусі.

Гэта першая ўзнагарода беларускай каманды на бягучым Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі. Віншаванне ў адрас спартсмена накіраваў Выканкам НАК Беларусі. У Трабзоне выступіць 61 беларускі атлет. Нашы суайчыннікі прымуць удзел у спаборніцтвах па шасці відах спорту.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Над «кайфам»

Заканадаўцы робяць акцэнт на прафілактыку ўжывання наркотыкаў

Ала МАЧАЛАВА

«Вусцішна бачыць шкляныя вочы свайго сына і адчуваць уласнае бяссілле. Калі ён нарадзіўся і мог харчавацца толькі праз трубкі, урачы не верылі, што ён будзе жыць. Затое я верыла, што выхаджу яго, была ўпэўнена ў сваіх сілах, адчувала сваю мацярынскую моц. А цяпер ён разбурае сябе сам. З наркотыкамі ён губляе чалавечае аблічча». Калі вы думаеце, што гэта нейкая кіношная цытата, то памыляецеся. Гэта не ў Галівудзе — гэта побач з намі. Чаму Лёша, звычайны падлетак, з сям'і, якую прынята называць паспяховай, стаў наркаманам? Магчыма, якраз таму, што сям'я не жыла ў бядоце, а былі б грошы, знойдзецца і «кайф»? Магчыма, думаў, што бываюць лёгкія наркотыкі? Магчыма, быў упэўнены, што разок-другі можна?..

Такіх «магчыма» можа быць колькі заўгодна. Але існуе галоўнае пытанне: як засцерагчы ад гэтага? Бо маштабы бядот ужо не могуць не звяртаць на сябе ўвагі. Пад назіраннем нарколагаў на 1 студзеня 2011 года ў нашай маленькай Беларусі знаходзілася каля 13 тысяч спажыўцоў наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў (у 2002-ім іх было на 5 тысяч менш). І гэта толькі афіцыйныя лічбы. Можна ўявіць, што рэальная колькасць тых, хто бывае «пад кайфам», пераўзыходзіць іх у дзясяткі разоў.

Акцэнт на прафілактыку робяць новыя папраўкі ў закон аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах і іх прэкурсорах. Увосень дакумент, які толькі-толькі паступіў у парламент, плануецца разгледзець у першым чытанні. Ён выбудоўвае цэлую сістэму прэвентыўных захадаў, якія будуць рабіць на падставе дзяржаўных і рэгіянальных праграм.

Чаму так хваткa ўзяліся за прафілактыку?

— На жаль, у нас былі праблемы ў гэтай галіне, — тлумачыць **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Анатоль ВАНЬКОВІЧ.** — І не толькі вышэйназваны дакумент умацоўвае гэты кірунак. У нас ідуць законапраекты, якія датычаць розных аспектаў адной праблемы — прафілактыкі безнаглядснасці непаўналетніх, напрыклад. Усё павінна быць увязана ў адзіную сістэму, тады яно будзе дзейснае. Калі размова ідзе аб прафілактыцы, мы павінны браць не толькі моладзь, але і тых, хто лечыцца, і тых, хто ўжывае.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАВЫШЭННЕ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ Ў РАСІІ ДА 65 ГАДОЎ НЕПАЗБЕЖНА

Павышэнне пенсійнага ўзросту ў Расіі да 65 гадоў пазбегнуць не атрымаецца. Такое меркаванне выказаў намеснік міністра фінансаў РФ Сяргей Шаталаў, паведамляюць інфармагенцтвы.

«Я думаю, што мы нікуды не падзенемся ад вырашэння такога няпростага пытання», — заявіў намглавы Мінфіна ў эфіры радыёстанцыі «Рэха Масквы». Пры гэтым чыноўнік паспяшаўся супакоіць, заявіўшы, што гэты працэс будзе адбывацца паступова, паэтапна. «Будзем дадаваць па паўгода, можа быць, па трэці года штогод і выдаткуем на гэта гадоў 15 для таго, каб выйсці на ўзровень 65 гадоў для выхаду на пенсію», — сказаў Шаталаў.

У ЛЬВОВЕ ЗАБАРАНІЛІ СВЯТКАВАЦЬ УГОДКІ ВЫЗВАЛЕННЯ АД ФАШЫСТАЎ

У Львове забаранілі праводзіць масавыя мерапрыемствы, звязаныя з угодкамі вызвалення горада ад нямецкай акупацыі. Рашэнне пра забарону прыняў Львоўскі акруговы адміністрацыйны суд.

Раней з заяўкамі на правядзенне акцый з нагоды гэтых угодкаў у гарадскую раду звярнуліся тры арганізацыі: «Сокал», Рада ветэранаў, а таксама Кампартыя Украіны. Член КПУ Аляксандр Калінюк, які таксама кіруе мясцовым аддзяленнем Антыфашысцкага камітэта, заявіў, у прыватнасці, што плануецца арганізаваць урачысты мітынг каля помніка воінам-вызваліцелям.

У гарсавеце, са свайго боку, паведамілі, што будуць дамагацца судовай забароны на гэтыя мерапрыемствы. Службоўцы, паводле інфармацыі УНІАН, заявілі, што «правядзенне акцый 27 ліпеня можа выклікаць пагрозу грамадскай бяспекі». Суд, які разглядаў гэтае пытанне, пазіцыю мясцовай улады падтрымаў.

НАРВЕЖСКАГА ТЭРАРЫСТА ЧАКАЕ «САМАЯ ГУМАННАЯ ТУРМА Ў СВЕЦЕ»

Нарвежскага тэрарыста Андэрса Берынга Брэйвіка, які ўвечары 22 ліпеня забіў 76 чалавек, чакае турма Хальдэн Фенгсель, якая атрымала вядомасць як «самая гуманная турма ў свеце». Вышэйшая мера пакарання ў Нарвегіі — гэта пазбаўленне волі на 21 год. Аднак гэты тэрмін можа быць павялічаны ў тым выпадку, калі зняволены ўяўляе патэнцыйную небяспеку для грамадства.

Турма Хальдэн Фенгсель уяўляе сабой размешчаны ў лесе комплекс, дзе ёсць студыя гуказапісу, бегавыя дарожкі і нават асобны катэдж для спатканняў зняволеных са сваякамі. У кожнага асуджанага ёсць паўнавартасны пакой, абсталяваны сучасным тэлевізарам і невялікім халадзільнікам. Па выглядзе ён нагадвае, хутчэй, нумар недарагой гасцініцы.

Асабліва дысцыплінаваным зняволеным дазваляецца мець у нумары DVD-плэер. Акрамя таго, ім прадастаўляецца абмежаваны доступ у інтэрнэт. У будынку турмы ёсць кухня, дзе зняволеных вучаць мастацтву кулінарыі, а на вокнах камер няма кратаў.

Дырэктар турмы Ары Хойдаль адзначае, што ў Хальдэн Фенгсель сядзяць у тым ліку наркагандляры, забойцы і гвалтаўнікі. Аднак нарвежскія меры рэабілітацыі зняволеных аказваюцца эфектыўнымі: толькі 20% асуджаных на працягу двух гадоў пасля вызвалення паўторна трапляюць у турму, тады як у ЗША і Вялікабрытаніі гэты паказчык дасягае 50-60%.

Адной з пераваг турмы Хальдэн лічыцца стаўленне адміністрацыі да зняволеных. Наглядчыкі ходзяць без зброі, займаюцца з асуджанымі спортам і абедаюць разам з імі. Палова наглядчыкаў — жанчыны. Дырэкцыя турмы мяркуе, што гэта змяншае агрэсіўнасць зняволеных.

У НЕМЦАЎ АКАЗАЛІСЯ САМЫЯ ПРАЦЯГЛЫЯ АДПАЧЫНКІ Ў ЕЎРОПЕ

У грамадзян Германіі аказаліся самыя працяглыя водпускі ў ЕС, паведамляе Welt са спасылкай на справаздачу Еўрапейскага фонду па паляпшэнні ўмоў жыцця і працы. У сярэднім наёмныя работнікі ў ФРГ маюць адпачынак у 30 працоўных дзён за год.

Лідарства па колькасці непрацоўных дзён немцам таксама забяспечыла рэкорднае ў ЕС колькасць святочных дзён, якія аплачваюцца: у Германіі іх налічваецца 10. Калі дадаць святы да адпачынку, то атрымаецца 40 дзён у годзе, самы высокі паказчык у ЕС. У сярэднім па Еўрасаюзе адпачынак складае 24,8 дня, да якіх дадаюцца 10,5 дня святаў, разам — 35,3 дня.

Вялікая колькасць адпускных дзён адпаведна адлюстроўваецца на часе, праведзеным на працоўным месцы. Немцы працуюць 1659 гадзін у год, фактычна на тыдзень менш грамадзян у іншых краінах ЕС. Тым не менш, прыведзеныя ў справаздачы лічбы, як адзначае Welt, ніяк не суадносяцца з эканамічным ростам, паколькі не ўлічваюць такі фактар, як прадукцыйнасць працы ў гадзіну. У Германіі яна з'яўляецца адной з найбольш высокіх.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.07.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼ 1 долар ЗША	4 940,00	1 чэшская крона	294,57	USD	27,4439
▼ 1 еўра	7 154,11	1 польскі злоты	1 786,94	10 UAH	34,3263
1 латвійскі лат	10 083,69	▲ 1 расійскі рубель	180,00	10000 BYR	55,4871
1 літоўскі літ	2 071,84	1 украінская грыўня	617,69	EUR	39,7937

Зваротная сувязь

Уладзімір ПАТУПЧЫК намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:

«ВЫЯЗНЫЯ ПРЫЁМЫ І СУСТРЭЧЫ — ДОБРЫ СПОСАБ НАЛАДЗІЦЬ ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ З НАСЕЛЬНІЦТВАМ»

Такое меркаванне выказаў журналістам намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Патупчык учора ў Слоніме. Тут ён правёў асабісты прыём грамадзян, а таксама сустрэчу з калектывам ААТ «Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка», перадае БЕЛТА.

«На такія сустрэчы і прыёмы людзі ідуць з тым, што набалела. Жывая гутарка дае магчымасць з першых вуснаў даведацца не толькі аб канкрэтнай праблеме, але і ў цэлым аб тым, што хвалюе сёння людзей», — сказаў Уладзімір Патупчык.

Ён адзначыў, што ў Слонімскім раёне склалася добрая практыка работы мясцовай улады з насельніцтвам. Старшыня выканкама, іншыя кіруючыя работнікі згодна з адпаведнымі нарматыўнымі дакументамі праводзяць рэгулярныя прыёмы, стараюцца па магчымасці аператыўна вырашаць праблемы тых, хто звярнуўся.

Так, сёння ў Слонімскім райвыканкаме адначасова з намеснікам старшыні Савета Рэспублікі прыём грамадзян ажыццяўляў кіраўнік раёна. Наведвальнікам, якія запісаліся на прыём да мясцовай улады і не задаволены рэагаваннем, было прапанавана звярнуцца і да парламентарыя. Аднак такіх не аказалася. «Гэта значыць, што мясцовая ўлада паспяхова вырашае пытанні на сваім узроўні», — падкрэсліў парламентарый.

Пытанні, адрасаваныя Уладзіміру Патупчыку, у асноўным датычыліся сітуацый, рашэнне па якіх не ўдавалася знайсці доўгі час. Прычынамі таго, магчыма, сталі дапушчаныя раней памылкі і недапрацоўкі, сутыкненне інтарэсаў, розначытанне нарматыўных актаў. Кожнае пытанне ўзята пад кантроль, будзе праведзена неабходная работа, і людзі атрымаюць адказы. Парламентарый адзначыў, што па большасці пытанняў, хутчэй за ўсё, удасца знайсці разумныя кампрамісныя рашэнні, якія задаволяць усе бакі.

Валянцін СУКАЛА, старшыня Вяхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь:

«НА ТАКІХ СУСТРЭЧАХ МЫ ЯШЧЭ РАЗ ПРАВЯРАЕМ ЗАКОННАСЦЬ СУДОВЫХ РАШЭННЯЎ»

РАЗ у квартал Валянцін Сукала праводзіць у рэгіёнах краіны прыём грамадзян па пытаннях, што адносяцца да кампетэнцыі судовых органаў. Як паведамлялася, адрасам чарговай «выязной прыёмнай» стаў будынак Гродзенскага аблвыканкама, дзе старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі прыняў 15 заяўнікаў. Нават больш, паколькі ў шэрагу выпадкаў па адным пытанні звярталіся два, а то і тры чалавекі.

Што ні зварот — дык, так бы мовіць, апошняя надзея. Напрыклад, пажылая жанчына афармляе дагавор дарэння кватэры сваёй унучцы, аднак затым адносіны з ёй і дачкой сапсаваліся. І цяпер, плача пенсіянерка, яна на гэтай, юрыдычна ўжо не сваёй жылплошчы, як «бамжыха». Просіць прызнаць дагавор дарэння несапраўдным. Але навошта было яго заключаць? Чаму замест дарэння не напісала завяшчанне? Кажа, што паверыла дачцэ, а ў натарыяльнай канторы нават не чытала, што падпісвала.

Валянцін Сукала прымае скаргу, вызваляючы заяўніцу ад выплаты дзяржпошліны ў сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам.

— Будзем вывучаць вашы довады, — сказаў ёй старшыня Вярхоўнага Суда.

А пасля завяршэння прыёму на пытанне карэспандэнта «Звязды» аб перспектывах гэтага звароту адказаў так: «З аднаго боку, усё законна, падарыла кватэру ў прысутнасці натарыуса. А з іншага боку — канфлікт, які трэба вырашыць. Жанчына кажа, што яе ўвялі ў зман. Трэба шукаць выйсце».

У адрозненне ад гэтай сітуацыі, яшчэ адзін пажылы чалавек не скардзіцца на сваіх блізкіх, а, наадварот, спрабуе абараніць іх інтарэсы — арыштаванага зяця, а таксама яго жонкі, дзяцей. Паводле слоў пенсіянера, «водгукі» крымінальнай справы ў дачыненні былога кіраўніка аднаго з прадпрыемстваў яго сын адчувае нават у... школе. Няўжо і сапраўды, як кажа Іван Іванавіч, у навучальнай установе ў адрас хлопца былі нейкія зняважлівыя выказванні? Калі сапраўды так, то трэба разбірацца і таксама, як і па гэтай крымінальнай справе, караць.

Наступны зварот — па пытанні падзелу домаўладання, гэтай цяжбе ўжо больш за чатыры гады. А Уладзімір Іванавіч на сёння не згодны з высновамі па факце дарожна-транспартнага здарэння ў... 2002 годзе, у выніку якога быў траўмаваны яго брат. Яшчэ адзін заяўнік, які трапіў у аварыю на дарозе, сцвярджае, што быццам пад схемай ДТЗ — не яго подпіс. Мужчына, атрымаўшы цяжкія траўмы на вытворчасці, не згодны з сумай фінансавай кампенсацыі ...

Дарэчы, на прыёме ў старшыні Вярхоўнага Суда пабывалі і два работнікі праваахоўных органаў, якія лічаць вынесенае ім пакаранне занадта сур'ёзным. Яны лічаць, што яно не адпавядае рэальным абставінам. Ім таксама, як і іншым заяўнікам, Валянцін Сукала нічога паабяцаць не мог, але ён гарантаваў аб'ектыўную праверку звароткаў. У вызначаны законам тэрмін будзе атрыманы адказ, і можна прадбачыць, што задаволіць ён не кожнага. Ды і ўвогуле, ці здараецца перагляд судовых рашэнняў на карысць людзей, якія прыйшлі на прыём да старшыні Вярхоўнага Суда?

— Падобныя сустрэчы вельмі карысныя тым, што мы яшчэ раз правяраем законнасць таго ці іншага судовага рашэння, на якое людзі скардзяцца, аналізуем свае памылкі, — зазначае Валянцін Сукала. — І па выніках практычна кожнай «выязной прыёмнай» у некалькі спраў абавязкова ўносяцца карэктывы, якія могуць быць звязаны са зніжэннем пакарання, змякчэннем адказнасці, змяненнем рашэння па грамадзянскай спрэчцы і нават адменай прыгавору. Таму падобныя сустрэчы — гэта як маніторынг таго, што адбываецца ў судовай сістэме, якасці правасуддзя, якое павінна быць больш эфектыўным, сучасным, эканамічным, простым і зручным для грамадзян.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КУПІЦЬ ЗАМЕЖНУЮ ВАЛЮТУ НА ЛЯЧЭННЕ І НАВУЧАННЕ ЗА МЯЖОЙ БЕЗ ЧАРГІ ЦЯПЕР МОЖНА Ў ПЯЦІ БАНКАХ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ банк Беларусі дазволіў пяці банкам не прадаваць у сваіх абменніках, размешчаных на тэрыторыі ўстаноў адпачынку, замежную валюту, здадзеную насельніцтвам. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.

Размова ідзе аб пунктах абмену валют Беларусбанка, Белінвестбанка, Белагрmaprамбанка, Парытэтбанка і Альфа-Банка, якія працуюць на тэрыторыі санаторыяў, баз адпачынку і г.д., удакладнілі ў Нацбанку. Здадзеная ў іх насельніцтвам замежная валюта павінна накіроўвацца банкамі на продаж фізічным асобам для ажыццяўлення імі сацыяльна значных расходаў за мяжой. Сярод гэтых мэт — лячэнне, аплата навучання і пражывання студэнтаў, выезд за межы Беларусі ў сувязі з хваробай або смерцю сваякоў.

«Улічваючы сітуацыю, што склалася на ўнутраным валютным рынку, звязаную з цяжкасцямі набыцця замежнай валюты фізічнымі асобамі праз абменныя пункты, Нацыянальны банк даручыў галоўным упраўленням Нацбанка па абласцях выдаць дазволы тэрмінам да 1 снежня 2011 года на ажыццяўленне іх абменнымі пунктамі, размешчанымі на тэрыторыі ўстаноў адпачынку, аперацыі толькі па куплі наяўнай замежнай валюты», — расказалі ва ўпраўленні Нацбанка.

Раней па такім прынцыпе працаваў Беларусбанк: валюта, якую насельніцтва прадавала ў яго прыгранічныя абменнікі, накіроўвалася на сацыяльныя патрэбы.

Ва ўпраўленні Нацбанка дадалі, што банкі самі распрацоўваюць падыходы, па якіх будуць прымацца рашэнні аб выдзяленні фізічным асобам замежнай валюты на сацыяльныя патрэбы за мяжой.

Жадаючы купіць замежную валюту павінен будзе падаць заяву і прыкласці да яе дакументы, якія пацвярджаюць неабходнасць у гэтай валюце. У Беларусбанку, напрыклад, такія рашэнні прымаюцца спецыяльнай камісіяй.

СТРАСЦІ ПА КАНТРАКЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пералік уважлівых прычын у выпадку звальнення па патрабаванні работніка заканадаўствам не замацаваны. Іх важкасць ацэньвае найманік. Разам з тым, Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у пастанове № 4 ад 2008 года звярнуў увагу судоў на тое, што датэрміновае скасаванне кантракта магчыма па патрабаванні работніка ў выпадку яго хваробы ці інваліднасці, якія перашкаджаюць выкананню работы па кантракце, парушэнні наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора або ўмоў кантракта і па іншых уважлівых прычынах. Пры ацэнцы ўважлівасці прычын скасавання кантракта па патрабаванні работніка суд павінен улічваць, што названыя істцом прычыны перашкаджалі яму выконваць працу згодна з заключаным кантрактам. Да такіх прычын могуць адносіцца, напрыклад, стан здароўя, выхад на пенсію, змена месца жыхарства, неабходнасць догляду хворых членаў сям'і. Доказы аб уважлівасці прычын датэрміновага скасавання кантракта прадастаўляюцца істцом. Такім чынам, сваёй пастановай Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь аднёс змену месца жыхарства работніка да ўважлівых прычын, якія перашкаджаюць выкананню работы па кантракце. Наймальнік абавязаны звольніць работніка згодна з яго пісьмовай заявай (дата павінна быць указана работнікам). Гэта значыць, што пры скасаванні працоўнага дагавора па гэтай падставе наймальнік не мае права самастойна вызначаць дату звальнення работніка (напрыклад, устанаўліваць перыяд для перадачы спраў, падрыхтоўкі і здачы справаздач і г.д.), гэтае права належыць работніку. Адпаведна дата звальнення можа быць перанесена толькі пры наяўнасці на тое згоды самога работніка.

Многіх грамадзян, якія звярнуліся на «гарачую лінію», турбавалі абавязкі сваіх працадаўцаў. У прыватнасці, ці абавязаны наймальнік у выпадку звальнення работніка ў сувязі з заканчэннем тэрміну дзеяння кантракта паведамляць яму прычыну звальнення?

Увогуле, заканадаўства аб працы не абавязвае наймальніка паведамляць аб прычынах спынення працоўных адносін з работнікам у выпадку скасавання кантракта ў сувязі з заканчэннем тэрміну яго дзеяння, паведамілі ў міністэрстве. Для звальнення на такой падставе неабходна жаданне хоць бы аднаго з бакоў (наймальніка або работніка) спыніць працоўныя адносіны, якое павінна быць выказана ў пісьмовай форме (апавяшчэнне, папярэджанне). Пры гэтым кожны з бакоў, якія заключылі кантракт, не пазней чым за адзін месяц да заканчэння тэрміну яго дзеяння, павінен пісьмова папярэдзіць другі бок аб сваім намеры спыніць працоўныя адносіны.

Акрамя таго, наймальнік, прымаючы рашэнне аб спыненні працоўных адносін з работнікам, павінен улічваць гарантыі дзяржавы, накіраваныя на абарону асобных катэгорый работнікаў. У прыватнасці, пры падаўжэнні або заключэнні новага кантракта з працуючай жанчынай, якая знаходзіцца ў адпачынку па цяжарнасці і родах, з маці (бацькам дзіцяці замест маці, апекуном), якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, тэрмін дзеяння кантракта вызначаецца не менш чым да заканчэння названых адпачынкаў; з работнікам перадпенсійнага ўзросту (жанчынай 53 гадоў, мужчынам 58 гадоў), які добрасумленна працуе і не дапускаў парушэнняў працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны, тэрмін дзеяння кантракта вызначаецца не менш чым да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (жанчына — 55 гадоў, мужчына — 60 гадоў) і атрымання ім права на пенсію па ўзросце.

З якімі катэгорыямі работнікаў наймальнік абавязаны падаўжаць кантракт?

Тэрмін дзеяння кантракта ўстанаўліваецца, а таксама падаўжаецца па пагадненні бакоў — працаўніка і наймальніка. Разам з тым, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 180 прадугледжаны выпадкі, калі наймальнік пры заключэнні ці прадаўжэнні кантракта павінен усталяваць пэўны тэрмін: з працуючай жанчынай, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах, маці (бацькам дзіцяці замест маці, апекуном), якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, — не менш чым да заканчэння названых водпускаў; з работнікам перадпенсійнага ўзросту (жанчыны — 53 гады, мужчыны — 58 гадоў), які добрасумленна працуе і не дапускаў парушэнняў працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны, — не менш чым да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў) і атрымання ім права на пенсію па ўзросце. Наймальнік са згоды маці (бацькі дзіцяці замест маці, апекуна), якая прыступіла да працы да або пасля заканчэння водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, абавязаны падоўжыць (заключыць новы) кантракт на тэрмін не менш чым да дасягнення дзіцем узросту пяці гадоў.

Калі кантрактам прадугледжаны адзін дадатковы дзень водпуску, але працадаўца не дазваляе падоўжыць водпуск на дзень, куды можна звярнуцца і якія санкцыі прыняць?

Прадастаўленне дадатковага захавочвальнага водпуску з захаванням заработнай платы з'яўляецца абавязковай умовай кантракта, падкрэсліў намеснік міністра. Невыкананне наймальнікам умоў кантракта (напрыклад, непрадастаўленне дадатковага заахвочвальнага водпуску) з'яўляецца парушэннем. Факт парушэння заканадаўства аб працы ўстанаўлівае Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны РБ (яго абласныя ўпраўленні, міжраённыя інспекцыі). Працоўныя спрэчкі разглядаюць камісія па працоўных спрэчках, суд. Акрамя таго, за парушэнні заканадаўства аб працы Кодэксам РБ «Аб адміністрацыйных правапарушэннях» прадугледжана адпаведная адказнасць.

З жанчынай, якая працавала ў камерцыйнай структуры, быў заключаны кантракт тэрмінам да верасня, але кіраўніцтва вымусіла перапыніць яго па пагадненні бакоў на 3 месяцы раней. Жанчыне прыгразілі, што інакш яе звольняць па артыкуле, хоць працоўнай дысцыпліны яна ні разу не парушыла. Ці можна прыцягнуць нядобрасумленнага наймальніка да адказу?

Тэрміновы працоўны дагавор, разнавіднасцю якога з'яўляецца кантракт, можа быць у любы час спынены па пагадненні бакоў, патлумачыў Ігар Старавойтаў. Пры прымяненні гэтай падставы для звальнення, яно можа адбыцца толькі ў выпадку двухбаковага пагаднення, г.зн. для звальнення неабходна як згода наймальніка, так і згода работніка. Апроч таго, згода павінна быць дасягнута і ў дачыненні да даты звальнення па азначанай падставе. У выпадку, калі звальненне работніка адбылося без яго жадання (заявы) або пад уплывам якіх-небудзь метадаў уздзеяння на работніка, работнік мае права на працягу першага месяца з дня звальнення звярнуцца ў суд з іскам аб аднаўленні на працы, дзе ён мае права выкарыстаць любыя доказы таго, што звальненне адбылося без яго жадання, у тым ліку паказанні сведак. У выпадку, калі суд прызнае звальненне незаконным, работнік будзе адноўлены на ранейшай працы. Акрамя таго, работнік мае права патрабаваць ад наймальніка выплаты кампенсацыі за час вымушанага прагулу і кампенсаці маральнай шкоды ад незаконнага звальнення.

Як доўга можа знаходзіцца на кіруючай пасадзе чалавек пенсійнага ўзросту? На які тэрмін з ім можна заключаць кантракт?

Абмежаванняў па працягу працоўных адносін з працаўнікамі пенсійнага ўзросту заканадаўства аб працы не ўстанаўлівае. Права спыніць ці працягнуць (і на які тэрмін) працоўныя адносіны і наймальнік, і работнік могуць вырашыць самастойна.

Інга МІНДАЛЁВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ТАКІЯ ВОСЬ «ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ»

У Мінскай вобласці з пачатку года выяўлена 11 фактаў ілжэпрадпрымальніцтва. Па выніках праверак даналічана Br1,8 млрд. плацяжоў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-цэнтры інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінскай вобласці.

Так, інспекцыя МПЗ па Лагойскім раёне вывучыла работу новазарэгістраваных трох ІП, якія нібыта ажыццяўлялі аптовы гандаль санітарна-тэхнічным абсталяваннем. Ілжэпрадпрымальнікі не мелі ўяўлення аб дзейнасці, якой быццам бы займаліся, вялі асацыяльны лад жыцця, у іх не было пастаяннай работы.

У ходзе правядзення кантрольных мерапрыемстваў на разліковых рахунках плацельшчыкаў выяўлены абароты вялікіх аб'ёмаў грашовых сродкаў (да Br4,7 млрд на працягу месяца). Ім прад'яўлена да выплаты ў бюджэт падаткаў у памеры Br705,8 млн. Для далейшага расследавання справы матэрыялы праверак накіраваны ў органы дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі.

МУС абвяргае лжывую інфармацыю аб здароўі асуджанага Д. Бандарэнкі

Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі абвяргае лжывую інфармацыю аб здароўі асуджанага Дзмітрыя Бандарэнкі і яго медыцынскім абслугоўванні, якая апошнім часам з'явілася на некаторых інтэрнэт-рэсурсах. Каб пазбегнуць фальсіфікацыі сутнасці таго, што адбываецца, на афіцыйным сайце МУС размешчана падрабязнае апісанне ходу лячэння Дзмітрыя Бандарэнкі, паведамляе **БЕЛТА**.

Паводле інфармацыі МУС, 26 ліпеня асуджаны Бандарэнка быў паспяхова прааперыраваны ў 5-й клінічнай бальніцы Мінска. «Аперацыя прайшла паспяхова. Такое меркаванне выказалі ўрачы 5-й ГКБ, дзе, уласна кажучы, яна і праходзіла», — адзначылі ў МУС. У медслужбе дэпартамента выканання пакарання упэўнены, што ўсе неабходныя ўмовы для пасляаперацыйнай рэабілітацыі пацыента ў іх ёсць. «Бандарэнка як атрымліваў належную прафесійную медыцынскую дапамогу, так і будзе атрымліваць», — запэўнілі ў МУС. Праваахоўнікі падкрэслілі, што ніхто не прымушаў Бандарэнку рабіць аперацыю, «ён сам прыняў рашэнне на карысць аперацыі, аб чым уласнаручна напісаў заяву».

Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні Каралю Марока

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя Беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Каралю Марока Махамеду VI, а таксама родным і блізкім загінулых пры крушэнні ваеннага самалёта.

«У Рэспубліцы Беларусь з вялікім смуткам успрынялі паведамленне аб шматлікіх чалавечых ахвярах у выніку катастрофы ваеннага самалёта «Геркулес С-130», — гаворыцца ў спачуванні.

Ордэнам Маці ў Беларусі ўзнагароджаны 53 шматдзетныя жанчыны

Адпаведны ўказ 27 ліпеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, гэтай узнагароды за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей удастоены 33 шматдзетныя маці з Брэсцкай вобласці, дзевяць — з Віцебскай, восем — з Гродзенскай і тры — з Магілёўскай.

Сярод узнагароджаных — выхавальнік Навадворскага яслі-сада Пінскага раёна Яўгенія Гузарэвіч, бухгалтар Баранавіцкага хлебазавода Марыя Кузьмінава, хатнія гаспадыні са Столінскага і Іванаўскага раёнаў Наталля Харанека і Алена Чарненка, лабарант Полацкага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Святлана Фядосава і санітарка Воранаўскай цэнтральнай раённай бальніцы Наталля Вінарская.

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў шэраг ваеннаслужачых Беларусі медалём «За бездакорную службу»

За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступені ўзнагароджаны шэраг ваеннаслужачых краіны. Указ аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 ліпеня.

У прыватнасці, сярод удастоеных медаля «За бездакорную службу» I ступені — палкоўнікі Валерый Балута, Ігар Ганчар, Андрэй Міцькін, Андрэй Фёдараў, Барыс Яжоў, падпалкоўнікі Аляксандр Афанасенка і Уладзімір Новік, палкоўнікі міліцыі Уладзімір Галімскі, Алег Кручынскі, Іван Падгурскі, Валерый Палішчук, Васіль Прыбышэня, Аляксандр Рогаў, Генадзь Рыжановіч, Уладзімір Хмялёў, Алег Шаркоў, падпалкоўнік міліцыі Васіль Шумскі, палкоўнік юстыцыі Эрык Чыслоў, палкоўнік унутранай службы Міхаіл Адамчук.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Чыонг Тан Шанга з выбраннем на пасаду Прэзідэнта В'етнама

«У Беларусі ўдзяляюць асаблівую ўвагу ўмацаванню і пашырэнню традыцыйна дружалюбных сувязяў і ўзаемавыгаднага беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва. Упэўнены, што сумесныя намаганні ў самы бліжэйшы час мы значна павысім узровень адносін паміж нашымі краінамі», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Палітыка ў адносінах да Беларусі контрпрадукцыйная для доўгатэрміновага развіцця Еўропы

Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі выступае катэгарычна супраць еўрапейскай ізаляцыі Беларусі. Аб гэтым ён заявіў у час сумеснага брыфінгу з прэзідэнтам Польшчы Браніславам Камароўскім, які знаходзіцца ў Грузіі з двухдзённым афіцыйным візітам, паведамляюць інфармагенцтвы.

Прэзідэнт Грузіі заклікаў Еўропу весці дыялог з Беларуссю. «Палітыка ізаляцыі ў адносінах да Беларусі павялічвае яе шанс трапіць пад кантроль Расіі, што з'яўляецца контрпрадукцыйным для доўгатэрміновага развіцця Еўропы», — заявіў Міхаіл Саакашвілі.

Паводле яго слоў, сцвярджаць, што Расія больш дэмакратычная, чым Беларусь, — абсурд. «Ажыццяўленне палітыкі ізаляцыі з Беларуссю, як гэта часам бывае, азначае прамую спробу, каб суверэнітэт Беларусі скончыўся і краіна трапіла пад поўны кантроль сённяшняга ўрада Расіі. Беларусы — вельмі таленавіты еўрапейскі народ, і такі вынік будзе на шкоду ўсяму рэгіёну. Лічу, што дыялог і адкрытая размова з Беларуссю па ўсіх пытаннях неабходны», — заявіў Міхаіл Саакашвілі.

Абзац

У Гомелі работнікі МНС выратавалі школьніка, якога прыціснула жалезабетоннай плітой. Вучань 8 класа гуляў з сябрамі на пустцы каля дома па вул. Лепяшынскага. Калі ён паспрабаваў залезці на перакулены блок санвузла, на хлопца ўпала пліта памерамі 2 на 2,5 м і прыціснула яго. Выратавальнікі пры дапамозе гідраўлічнага інструмента даслалі пацярпелага і перадалі медыкам. Хлопчык шпіталізаваны з папярэднім дыягназам «адкрыты пералом галёнкі, закрыты пералом тазабедранага сустава».

У Гомелі пры падзенні стралы вежавага крана смяротна траўмаваны рабочы. Трагедыя адбылася ў канцы працоўнага дня на тэрыторыі філіяла Гомельскага завода ЖБВ №3. Машыніст крана пачаў пад'ём крукавой падвескі без грузу. У гэты час нечакана развязаўся адзін з вузлоў мацавання каната. У выніку падзення стралы быў смяротна траўмаваны 30-гадовы фармоўшчык, які праходзіў пад кранам. Па факце праводзіцца праверка.

Поўны абзац

Супрацоўнікі службы бяспекі ізраільскага прэм'ера звярнуліся да трох замежных журналістак з незвычайным патрабаваннем — зняць бюстгальтары. СМІ назвалі гэты эпізод «бра-гейтам» — справай бюстгальтараў. Перш чым апынуцца ў кабінеце ізраільскага прэм'ера ў Ерусаліме для ўдзелу ў прэс-канферэнцыі, журналісткі падвергліся праверцы на ўваходзе, а затым і асабістаму дагляду, пасля чаго ім было загадана распрануцца за шырмай і зняць станікі, каб бялізну можна было прасвяціць промнямі электроннага сканера. «Гэта быў самы прыніжальны вопыт у маім жыцці», — заявіла рэпарцёр Agence France-Presse Сара Хусэйн. Як потым заявіў кіраўнік прэс-службы прэм'ера, гэты ганебны інцыдэнт нанёс урон рэпутацыі Ізраіля. «Урад зробіць усё, каб гэта не паўтарылася», — падкрэсліў ён. Між тым эпізоды такога кшталту здараліся тут і раней.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Мінэканомікі: СЁЛЕТА ЁСЦЬ ШАНЦ ВЫКАНАЦЬ ПЛАН ПА ІНВЕСТЫЦЫЯХ

ВЫСНОВЫ Даклада аб сусветных інвестыцыях, які штогод выпускаецца ЮНКТАД (Канферэнцыяй ААН па гандлі і развіцці), былі апублікаваны 26 ліпеня. У прыватнасці, там адзначаецца, што глабальны прыток інвестыцый летась вырас на 5% і такім чынам дасягнуў адзнакі ў 1,24 трыльёна долараў. Але гэта, тым не менш, на 15% ніжэй за дакрызісны сярэдні ўзровень і амаль на 37% ніжэй за пік 2007 года. У цэлым інвестыцыі па-ранейшаму адстаюць ад глабальнай прамысловай вытворчасці і сусветнага гандлю, якія пражываюць пад'ём і ўжо аднавіліся да дакрызіснага ўзроўню.

Што тычыцца прагнозаў на гэты год, то сёлета патокі прамых замежных інвестыцый працягнуць ажыўляцца:

— Мяркуецца, што сёлета працягнецца павелічэнне патокаў прамых замежных інвестыцый і будзе дасягнуты сярэдні ўзровень дакрызіснага перыяду. Прагназуецца таксама значны рост інвестыцый і ў наступныя 2 гады, — адзначыў **Фарыд КАРАХАНАЎ, прадстаўнік ПРААН у Рэспубліцы Беларусь** на прэзентацыі Даклада аб сусветных інвестыцыях. — У 2010 годзе пераўтварэнне краін з рыначнай эканомікай, якая фарміруецца, у новых буйных гульцоў у сферы прамых замежных інвестыцый таксама становіцца больш відавочна. Упершыню краіны, якія развіваюцца, і краіны з пераходнай эканомікай (гэта тычыцца і большасці краін нашага рэгіёну) прыцягнулі больш за палову глабальных інвестыцыйных патокаў. Калі казаць пра краіны з пераходнай эканомікай, то аўтары даклада выказваюць аптымізм адносна прытоку інвестыцый у гэтыя краіны: гэта будзе звязана з больш спрыяльнымі для інвестараў умовамі і новым раўндам прыватызацыі ў шэрагу краін рэгіёна.

У дакладзе таксама адзначаецца, што па выніках 2010 года прыток прамых замежных інвестыцый у краіны з пераходнай эканомікай (*сюды адносяцца краіны паўднёва-ўсходняй Еўропы і СНД.* — **Аўт.**) некалькі паменшыўся. Калі казаць толькі пра краіны СНД, то тут нават ёсць нязначнае павелічэнне — на 0,4%. Пры гэтым, як адзначаюць аўтары даклада, замежных інвестараў па-ранейшаму прыцягвае мясцовы спажывецкі рынак, які дынамічна расце. Калі казаць пра Беларусь, то летась прыток прамых замежных інвестыцый стаў меншы прыкладна на 28% — з 1,886 мільёна долараў у 2009 годзе знізіўся да 1,35 мільёна долараў у 2010 годзе. Аднак гэта ўсё роўна вышэй, чым, скажам, у 2007-2005 годзе, — тады сярэднегадавы паказчык прамых замежных інвестыцый складаў 0,8 мільярда долараў.

На прэс-канферэнцыі таксама прысутнічаў **начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцый Мінэканомікі Кірыл КАРАЦЕЕЎ**, які мяркуе, што ў Рэспубліцы Беларусь з 2006 па 2010 год назіраецца дастаткова вялікі ўсплёск прыросту прамых замежных інвестыцый:

— Калі казаць пра лічбы прытоку валавых прамых замежных інвестыцый, то павелічэнне назіраецца больш чым у 7 разоў: у 2006 годзе гэтая лічба складала 748 мільёнаў долараў, у 2010 — каля 5,5 мільярда. У першым квартале 2011 года — 2,9 млрд долараў.

Што тычыцца прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове (з вылікам запазычанасці за тавары), то іх аб'ём, па словах Кірыла Карацеева, за пяць гадоў вырас у 10 разоў: у 2006 годзе прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове складалі 112 мільёнаў долараў, у 2009 годзе — 1,7 мільярда долараў, у 2010 — 1,2 мільярда долараў, а за апошнія пяць месяцаў — 743 мільёны долараў.

К. Карацееў нагадаў, што перад урадам і Міністэрствам эканомікі ў сферы прыцягнення прамых замежных інвестыцый пастаўлена задача на сёлета прыцягнуць 6,5 мільярда долараў:

— Мы гэтай лічбы прытрымліваемся і робім усё магчымае, каб яе дасягнуць. Якія меры для гэтага прымаюцца? Па-першае, Беларусь актыўна выкарыстоўвае такі інструмент, як інвестыцыйныя дамовы: іх зараз заключана больш за 700. Вядома, інвестыцыі па іх будуць не толькі ў 2011 годзе: гэты перыяд расцягнуты на некалькі гадоў. Але ацэначная сума паступленняў ад заключаных інвестыцыйных дамоў складае каля 15,3 мільярда долараў. Другі напрамак, які сёння актыўна развіваецца, — гэта прыватызацыя і продаж пакетаў акцый, якія належаць дзяржаве. Сёлета плануецца выставіць каля 180 такіх пакетаў акцый, прычым ацэначная сума — каля 1,2 трыльёна беларускіх рублёў. Безумоўна, тут складана сказаць, будуць гэта замежныя інвестары або нацыянальныя, бо доступ да конкурсаў для ўсіх адналькавы, — патлумачыў Кірыл Карацееў і дадаў, што, тым не менш, уся інфармацыя пра беларускія прадпрыемствы распаўсюджана праз дыппрадстаўніцтвы нашай краіны па ўсім свеце: — Мы чакаем, што калі ў верасні будуць выстаўлены самыя цікавыя актывы, то будзе цікавасць і з боку замежных пакупнікоў.

Дарэчы, што тычыцца пастаўленай задачы па прыцягненні ў гэтым годзе 6,5% мільярда долараў інвестыцый, то Кірыл Карацееў лічыць яе цалкам выканальнай:

— Шанц сабраць 6,5 мільярда сапраўды ёсць. Бо, па-першае, вядуцца перамовы па ААТ «Белтрансгаз», ёсць яго незалежная ацэнка — 2,5 мільярда. А тыя меры, якія я назваў, таксама дадуць пэўны эфект і будзе кумулятыўны эфект ад тых здзелак: інвестары не толькі набываюць пакет акцый, але і потым развіваюць прадпрыемства. Таму шанц ёсць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Открытое акционерное общество «Могилевский завод искусственного волокна» проводит открытый аукцион по продаже неиспользуемого имущества

Аукцион состоится 30 августа 2011 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Собственник, продавец и организатор аукциона: ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

№ лота	наименование	год выпуска	начальная цена с НДС, руб.	в т.ч. сумма НДС 20%, руб.	сумма задатка с НДС, руб.
1	Автомобиль Фольксваген «Passat»	1998	16 149 197	2 691 533	1 615 000
2	Трактор Т-150к	1988	12 000 000	2 000 000	1 200 000
3	Машина бобинорезательная МРБ	2000	43 054 151	7 175 692	4 305 415
4	Бобинорезательная машина для продольного разрезания рулонов	2000	27 999 024	4 666 504	2 799 902
5	Автопогрузчик ДВ-1786.33	2000	7 400 000	1 233 333	740 000
6	Автопогрузчик ДВ-1661	2000	4 700 000	783 333	470 000
7	Цистерна для кислот на 4-х осях ТИП-768	1987	23 497 627	-	2 349 762

Лот № 2 – Трактор Т-150к продается по методу понижения начальной цены. Минимальная цена продажи – 9 000 000 руб. с НДС.

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются не позднее 29 августа 2011 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491088 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 226, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.

Последний день подачи заявок: 29 августа 2011 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона состоится 30 августа 2011 года с 11.30 до 12.00 в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет опла

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

28 ліпеня 2011 г. № 23 (261)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Барыс БАТУРА:

«Усё адразу выканаць нельга»



ФотаБЕЛТА.

За першыя шэсць месяцаў года ў Мінаблвыканкам паступіла 2410 зваротаў грамадзян, што крыху менш, чым за аналагічны перыяд летась. Пры гэтым з шэрагу рэгіёнаў колькасць зваротаў выросла. Гэта Маладзечанскі, Валожынскі, Крупскі і Нясвіжскі раёны. «Лідарскія» пазіцыі займае горад Маладзечна, аб'ём зваротаў адтуль павялічыўся ў разы і за першае паўгоддзе склаў 226 % адносна аналагічнага леташняга перыяду. Такі «ўсплёск» сацыяльнай актыўнасці маладзечанцаў цалкам зразумелы: у горадзе праводзіцца маштабная рэканструкцыя ў сувязі з падрыхтоўкай да рэспубліканскіх «Дажынак», і жыхары імкнуцца скарыстацца сітуацыяй, каб заадно вырашыць і свае прыватныя пытанні добраўпарадкавання, рамонту сваёй жылплошчы, дваровай тэрыторыі і г.д. Многія звароты — цалкам абгрунтаваныя, у чым змог пераканацца старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс БАТУРА, які днямі правёў у Маладзечне асабісты прыём грамадзян.

У прыватнасці, жыльцы дома № 4 па вуліцы Касманаўтаў паскардзіліся на нізкія тэмпературы ў сваіх кватэрах у зімовы перыяд. Сярэдняя тэмпература па доме ў мароз летась складала +14 градусаў па Цэльсію, а ў асобных пакоях апускалася да +10. Усюды сырасць і цвіль. Галоўная прычына — не ўцепленыя тарцовыя сцены. Адпаведныя работы па азначаным доме ў мясцовых камунальных службаў былі запланаваны ажно на 2013 год, аднак старшыня Мінаблвыканкама паставіў задачу правесці ўцяпленне тарцовых сцен сёлета.

Жыльцы дома № 8 па вуліцы Віленская капітальнага рамонту дачакаліся, аднак ніякай радасці ад гэтага яны не адчулі. Шмат нараканняў у іх на якасць праведзеных работ. Напрыклад, афарбоўка фасада праводзіцца без замазвання трэшчын і без замены вокнаў. Пры рамонце даху ўраганам сарвала плёнку, якая прыкрывала раскрытыя секцыі, і дажджом пазалівала верхнія кватэры. Барыс Батура ў чарговы раз звярнуў увагу раённых чыноўнікаў, якія прысутнічалі на прыёме грамадзян, на свае жорсткія патрабаванні да якасці правядзення работ, у тым ліку і капітальнага рамонту жылля, паабяцаў пракантраляваць гэта, а пры невыкананні яго даручэнняў і развітацца з канкрэтнымі адказнымі асобамі.

Пэўная колькасць зваротаў, агучаных маладзечанцамі падчас прыёму, тычылася прадастаўлення сацыяльнага жылля, у тым ліку і ў якасці замены старога, непрыдатнага для пражывання. Увогуле, для таго, каб закрыць гэтае пытанне, гораду неабходна ўзвесці 120 «сацыяльных» кватэр. Паводле інфармацыі старшыні райвыканкама Фёдара Дамаценкі, сёлета распачаліся работы па будаўніцтве аднаго такога 60-кватэрнага дома, здача якога запланавана на наступны год. У 2012-м мяркуецца прыступіць да ўзвядзення яшчэ аднаго — таксама на 60 кватэр. Барыс Батура паставіў задачу: дом, дзе работы ўжо распачаліся, здаць у першым квартале наступнага года, другі — у першым квартале 2013-га. «Фінансаванне пад гэта мы прадугледзім», — запэўніў старшыня аблвыканкама.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

Набытае — эксплуатаваць, новае — не набываць...

Сёлета ў канцы мая ў Міністэрства фінансаў прыйшоў дэпутацкі запыт старшыні Гродзенскага абласнога Савета А. Навумовіча. У ім народны абраннік ўзняў праблему, актуальную для большасці сельскіх Саветаў.

Ніхто не стане аспрэчваць важнасці навядзення парадку ў сельскай мясцовасці. Гэтай тэме сёння надаецца важнае значэнне на ўсіх узроўнях, патлумачыў дэпутат. Старшыням сельвыканкамаў пастаянна даводзяцца і трымаюцца на жорсткім кантролі заданні па навядзенні парадку на сельскіх тэрыторыях, паколькі гэта адзін з фактараў паляпшэння ўмоў пражывання насельніцтва. Кіраўнікі сельвыканкамаў хацелі б мець у сябе на балансе газонакасілкі, каб аператыўна вырашаць пытанні абкосу. Аднак, згодна з пісьмовым тлумачэннем Мінфіна ад 2008 года, з бюджэту пярвічнага ўзроўню могуць набывацца прадметы, неабходныя толькі для ўтрымання органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Такім чынам, сельскія і пасялковыя выканкамы не ў праве ажыццяўляць расходы па закупцы газонакасілак, мотакасілак, кустарэзаў і бензапіл. «Просім узгадніць магчымасці набыцця сельвыканкамамі сродкаў малой механізацыі», — гаворыцца ў звароце.

Сваю пазіцыю па гэтым пытанні Мінфін выклаў у пісьмовым адказе ад 14 чэрвеня 2011 № 02-3-15/142.

— У мэтах павышэння ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва быў прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 21, адной з галоўных задач якога з'яўлялася паляпшэнне інфраструктуры сельскіх населеных пунктаў і іх добраўпарадкаванне шляхам перадачы сістэм водазабеспячэння, водаадвядзення, дарог і іншых аб'ектаў нерухомасці спецыялізаваным арганізацыям.

Правядзенне гэтых мерапрыемстваў было скіравана на павышэнне статуса выканаўчых камітэтаў пярвічнага ўзроўню як дзяржаўных органаў, асноўная функцыя якіх — ажыццяўленне дзяржаўна-ўладных паўнамоцтваў, а не вядзенне гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку дзейнасці па добраўпарадкаванні тэрыторый. На нашу думку, рэалізацыя падыходаў, закладзеных Указам № 21, павінна быць працягнута.

Такім чынам, забеспячэнне добраўпарадкавання і падтрыманне належнага санітарнага стану на адпаведнай тэрыторыі павінна ажыццяўляцца выканаўчымі камітэтамі пярвічнага ўзроўню шляхам заключэння дагавораў са спецыялізаванымі арганізацыямі ці грамадзянамі, якія маюць у сваім распараджэнні неабходныя сродкі малой механізацыі (выключэнне складаюць выпадкі, калі рашэнне аб набыцці газонакасілкі прымаецца на сходзе грамадзян і жыхарамі збіраецца адпаведная сума).

...Сёння асноўная праблема для сельвыканкамаў — не столькі забарона набыцця бензакасілак, колькі недахват грошай, каб заключыць дагавор на абкос тэрыторыі, патлумачылі нашаму журналісту ў Міністэрстве фінансаў. Для таго, каб у далейшым пазбегнуць такой сітуацыі, трэба загадзя, пры фарміраванні бюджэтаў пярвічнага ўзроўню прадугледжваць неабходныя сродкі і адпаведным чынам складаць расходныя паўнамоцтвы сельвыканкамаў (у тым ліку і на добраўпарадкаванне). А магчымасцяў для гэтага стала больш.

У прыватнасці, у Мінфіне нагадалі, што, пачынаючы з гэтага года, бюджэты фарміруюцца з пэўнымі змяненнямі. Зменены парадак размеркавання падаходнага падатку, які з'яўляецца значнай даходнай крыніцай бюджэтаў пярвічнага ўзроўню. Па нарматыве, які вызначае раённы Савет дэпутатаў, устанаўліваецца працэнт адлічэнняў ад паступленняў ад падаходнага падатку ў бюджэты пярвічнага ўзроўню.

Апроч таго, пасля змянення парадку размеркавання падатку на прыбытак у раённых бюджэтаў стала больш магчымасцяў для падтрымкі бюджэтаў нізавога ўзроўню: на працягу года раённыя ўлады маюць права «кропачна» пералічваць мэтавыя трансферы ў бюджэты нізавога ўзроўню.

...А што ж рабіць тым сельвыканкамам, якія раней набылі сродкі малой механізацыі для навядзення парадку на сваёй тэрыторыі і абкосу травы? Для таго, каб набытая тэхніка не прастойвала і затрачаныя бюджэтныя сродкі давалі аддачу, выканкамам па-ранейшаму дазваляецца набываць паліўна-змазачныя матэрыялы і запчасткі, неабходныя для работы касілак. Грошы, некалі затрачаныя на набыццё гэтых газонакасілак, павінны расходавацца эфектыўна, падкрэслілі ў галоўным фінансавым ведамстве краіны.

МЯСЦОВЫ ЧАС

КУП: чатыры пастулаты поспеху

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Любанскі раён.

Раней уся інжынерная інфраструктура на вёсцы ўтрымлівалася за кошт мясцовых калгасаў і саўгасаў. Яны ж дапамагалі вяскоўцам у апрацоўцы прысядзібных участкаў. Пасля рэарганізацыі ў СВК былыя калгасныя гаспадаркі засяродзіліся на сваёй асноўнай задачы — забеспячэнні харчовай бяспекі краіны. Інжынерную інфраструктуру на вёсцы (водаправоды, дарогі) у адпаведнасці з Указам №21, перадалі спецыялізаваным арганізацыям. А для падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак і аказання паслуг насельніцтву ў сельскай мясцовасці вышэйзгаданым Указам №21 было прадугледжана стварэнне КУПаў (камунальных унітарных прадпрыемстваў). Не ўсе сельсаветы адважыліся на такі крок. Далёка не ва ўсіх, хто адважыўся, атрымалася дасягнуць станоўчых вынікаў, а вось у Псышчаўскім сельсавеце Іванаўскага раёна атрымалася. Мяркуйце самі.

Узровень рэнтабельнасці КУПа ў 2008 годзе склаў 24,5%, у 2009-м — 23%, летась —24%. Чыстага прыбытку за 2008 год прадпрыемства атрымала 16 млн рублёў, у 2009-м — 25 млн, у 2010-м — 39 млн рублёў. Пры тым, што падаткаў летась КУП заплаціў 83,2 млн рублёў і яшчэ вярнуў 63 млн рублёў дзяржпазыкі.

Як КУП здолеў дасягнуць такіх выдатных паказчыкаў, мы папрасілі расказаць чалавека, які стаяў ля вытокаў стварэння прадпрыемства, старшыню Псышчаўскага сельскага Савета дэпутатаў Сяргея МЕЛЬНІКА.

— Не сакрэт, што і сёння літаральна ў кожнай вёсцы ёсць такія асобы, якія за бутэльку зробяць усё, што трэба (і плот падновяць, і страху перакрыюць). Але наколькі якасна? І як быць з тэхнікай бяспекі, якую такія «работнікі» не вытрымліваюць? Трэба арыентавацца на цывілізаваны спосаб выканання работ, выкананых граматнымі спецыялістамі, — пераканаў старшыня. — Аднак трэба памятаць, што, згодна з сусветнымі законамі эканомікі, любая камерцыйная арганізацыя (незалежна ад формы ўласнасці) павінна прыносіць прыбытак, інакш яна самаліквідуецца.

Да стварэння камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Псышчаўскае» нас «падштурхнуў» вядомы Указ № 21. Пачалі мы з таго, што «пераключылі» на сельвыканкам закуп лішкаў малака ў насельніцтва, дзякуючы чаму прайшлі пэўную «абкатку» сельскагаспадарчай дзейнасці і атрымалі пэўны дадатковы даход у бюджэт. З 2008 года нас уключылі ў праграму стварэння новых працоўных месцаў, пад якую выдаткавалі 150 мільёнаў рублёў беспрацэнтнай пазыкі — па 10 мільёнаў на аднаго занятага. Менавіта дзякуючы КУПу ў сельсавеце з'явілася 15 новых працоўных месцаў.

Вывучаючы вопыт стварэння аналагічных прадпрыемстваў, мы ўбачылі, што галоўная праблема, рашэнне якой трэба загадзя прадумаць, — гэта загружанасць работнікаў КУПа ў асенне-зімовы перыяд. Маючы на балансе адзін трактар з бараной, пытанне не вырашыш, таму, калі ўжо брацца за стварэнне прадпрыемства, неабходна забяспечыць яго работнікам круглагадовую занятасць.

— Значыць, неабходна было прадугледзець больш шырокі спектр паслуг, якія аказваюцца насельніцтву, а не абмяжоўвацца толькі работамі сельскагаспадарчага кірунку?

— Менавіта так. Яшчэ на папярэднім этапе падрыхтоўкі мы акрэслілі для сябе некалькі пастулатаў, якімі абавязкова павінен быў кіравацца будучы КУП. Першы з іх якраз і прадугледжваў круглагадовую занятасць работнікаў... Другі наш пастулат — перакрываць менш прыбытковыя віды дзейнасці больш даходнымі — для таго, каб у цэлым прадпрыемства заставалася рэнтабельным...Трэці пастулат — прадпрыемства павінна быць канкурэнтаздольным, выступаць у якасці альтэрнатывы прыватнікам, якія раней былі манапалістамі ў гэтым сектары і самі дыктавалі цэны... Чацвёрты — стварыць узорнае прадпрыемства гэтага профілю і даказаць, што КУП можа быць рэнтабельным.

Асабіста я пераканаўся, што да пытання стварэння камунальных унітарных прадпрыемстваў трэба падыходзіць вельмі ўважана. У кожным сельскім Савеце такога роду прадпрыемствы, па вялікім рахунку, не патрэбны. Напрыклад, на наш Іванаўскі раён было б дастаткова двух-трох КУПаў.

— Якія паслугі псышчаўскі КУП аказвае насельніцтву сёння?

— Мы пачыналі з таго, што перадалі КУПу грузавы аўтамабіль ГАЗ-52, легкавы УАЗ-469, бензапілу, газонакасілку — усё тое, што было ў гаспадарцы падраздзялення пры сельвыканкаме. За першы транш пазыкі набылі новы трактар МТЗ-320 і патрыманы трактар МТЗ-80 разам з прычэпам і плугам, зварачнае абсталяванне, дзве шведскія бензапілы, глебаапрацоўчы агрэгат, стужачнапільны станок, аўтагідрапад'ёмнік і г.д. Крыху пазней нам бязвыплатна перадалі яшчэ адзін не новы трактар з прычэпам. Дзякуючы ўсяму гэтаму абсталяванню наш КУП сёння аказвае самы шырокі спектр паслуг — ад сельскагаспадарчых работ да распіловкі аварыйных дрэў. Займаемся апрацоўкай агародаў: узворваннем, культывацыяй, баранаваннем, міжрадковай апрацоўкай бульбы, апрацоўкай супраць фітафторы і каларадскага жука і інш. На сваёй піларараме па заказах насельніцтва мы вырабляем любыя піламатэрыялы. Калі чалавек будуе новы дом, ён, вядома, рыхтуе адпаведную колькасць матэрыялаў. А што рабіць адзінокаму пенсіянеру, у якога дах прадзіравіўся, стойла ў хляве пакасілася, ці карыта рассохлася? Дзе яму ўзяць неабходныя матэрыялы? Калі ласка! Ён можа зрабіць нам заяўку, і мы ўсё даставім, а калі трэба — то і самі адрамантуем. Напрыклад, зараз наша брыгада адной пенсіянерцы мяняе элементы даху, які месцамі прагніў. Апроч таго, адходы вытворчасці піларамы з'яўляюцца выдатным танным палівам, якое мы рэалізуем насельніцтву. Сёння кубаметр такіх адходаў драўніны каштуе 10 тысяч рублёў (для параўнання, дровы, якія рэалізуюцца сістэмай гартопа, каштуюць у разы больш).

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Ініцыятыўнасць заўважана

Старшыні Урыцкага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна і Сіманіцкага сельскага Савета Лельчыцкага раёна названы лідарамі на Гомельшчыне сярод мясцовых кіраўнікоў. Гэта стала вядома пасля падвядзення вынікаў конкурсу сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў і органаў тэрытарыяльнага самакіравання ў сферы вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Па ўзнагароды лепшыя прадстаўнікі прыехалі ў Гомель, на сесію абласнога Савета дэпутатаў.

Старшыня Урыцкага сельскага выканаўчага камітэта і Савета дэпутатаў Любоў БАРАЎКОВА ўпэўнена, што блізкасць іх сельсавета да горада вельмі дысцыплінуе людзей:

— Людзі ў нас вельмі працавітыя, яны жадаюць зрабіць сваю вуліцу, свой дом, сваю малую радзіму больш прыгожымі, пастаянна падтрымліваюць парадак ля сваіх падворкаў. Мы шмат працуем па вырашэнні праблем жыццезабеспячэння людзей. На тэрыторыі аграгарадка Урыцкае і ўсяго сельсавета ёсць неабходная інфраструктура — і водаправод, і газаправод, і вуліцы ўсе асветлены. Вось ужо два гады, як мы сябруем з мястэчкам Гастомель, што ў Ірпенскім раёне Кіеўскай вобласці. На свята вёскі прыязджаем адно да аднаго ў госці, дэпутаты абменьваюцца не толькі падарункамі, але і вопытам працы.

Старшыня Сіманіцкага сельскага Савета дэпутатаў Лельчыцкага раёна Таццяна КАСЦЮКЕВІЧ.

Таццяна КАСЦЮКЕВІЧ узначальвае Сіманіцкі сельскі Савет у Лельчыцкім раёне — бадай, самым аддаленым кутку Гомельшчыны:

— Гэта праца не мая асабістая, гэта праца насельніцтва ўсяго нашага сельсавета, — упэўнена жанчына.

Перадавікі ўзнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі ў памеры 400 і 300 базавых велічынь адпаведна. Таксама вызначаны самыя актыўныя прадстаўнікі тэрытарыяльнага самакіравання, якія займаюцца сацыяльнай дзейнасцю ў сельскіх населеных пунктах на грамадскіх пачатках. Упаўнаважаная вёскі Гусевіца Буда-Кашалёўскага раёна Алена Жарабцова заняла першае месца ў конкурсе, другое месца — у старасты вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна Валянціны Бобрык. На трэцім — Людміла Матузка, староста вёсак Бабруйкі і Ульянаўка Ельскага раёна. Усе яны ўзнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі. Як расказалі ў Гомельскім абласным Савеце дэпутатаў, конкурс закліканы стымуляваць ініцыятыўнасць у дзейнасці сельскіх Саветаў, садзейнічаць развіццю грамадскага самакіравання, а таксама дапамагаць у распаўсюджванні лепшага досведу кіраўнічых рашэнняў на тэрыторыі рэгіёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

ГЛЫБІНКА

МАЛОЧНЫЯ ВОЗЧЫКІ

У Асіповіцкім раёне прадпрымальнікі збіраюць малако ў насельніцтва і лічаць малочную справу не толькі бізнэсам, але і клопатам пра людзей.

Права на малако

Для Магілёўскай вобласці справа прыцягнення прыватнікаў для збору малака — зусім новая. Пакуль што добра ўдаецца гэта толькі Асіповіцкаму раёну, хоць і тут у старшыні раённага Савета дэпутатаў Аляксандра Пузіка, які стаў ініцыятарам новаўвядзення пры падтрымцы абласнога Савета, яшчэ застаюцца пэўныя трывогі наконт дня заўтрашняга.

Вядома, што ўтрыманне кароў і здача лішкаў малака — асноўная праблема для сялян, якія маюць асабістыя падсобныя гаспадаркі. Раней (і сёння ў большасці сельскіх раёнаў) арганізацыя збору малака ляжала на плячах сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. З аднаго боку, расказвае Аляксандр Пузік, у такой сістэме ёсць свае плюсы: напрыклад, традыцыі стымулявання руплівых гаспадароў і добрых здатчыкаў. З іншага, ёсць вялізны мінус — недастатковы ахоп жыхароў, якія хочуць і могуць здаць малако дзяржаве.

— Наўрад ці сёння гаспадарка можа дазволіць сабе ганяць фурманку за пяць кіламетраў у вёску, дзе бабуля здасць слоік малака, праўда? — рытарычна пытаецца старшыня раённага Савета. — Асіповіцкі раён вялікі, яго плошча — 2 тысячы квадратных кіламетраў. У нас больш за паўсотню вёсак, дзе трымаюць да 5 кароў. Гэта трэцяя частка ад агульнай колькасці. Звычайна малако збіраюць у акрузе 2-3 кіламетраў ад фермы, а жыхары аддаленых вёсак застаюцца ні з чым.

Адсюль была і крытыка Асіповіцкага раёна, які да нядаўняга часу займаў толькі 16 месца ў вобласці па закупе малака ў разліку ад адной каровы, хоць рэсурсы для лепшага становішча былі і ёсць.

Справа не толькі ў паказчыках, але найбольш у тым, што кожны чалавек павінен мець магчымасць здаваць малако і зарабляць на гэтым, — гаворыць Аляксандр Пузік. — Трэба забяспечыць рэалізацыю, іначай навошта трымаць тую карову?

Упэўненасць у сённяшнім дні

Лідар асіповіцкіх дэпутатаў летась скарыстаўся вопытам калег у Віцебскай і Гомельскай абласцях, дзе прыватнікі далёка не першы год працуюць па зборы малака. Такім чынам Аляксандр Пузік пазнаёміўся з бабруйскай прадпрымальніцай Аленай Яцко, якая наладзіла працу ў Светлагорскім раёне. Ёй жа прапанавалі ахапіць здатчыкаў малака ў частцы Асіповіцкага раёна.

— Я, шчыра кажучы, баяўся, — прызнаецца Аляксандр Віктаравіч. — Зразумейце мяне правільна: ужо існавала сістэма збору малака, няхай не вельмі дасканалая, але яна працавала. Разбурыць лёгка, а стварыць новае і дзейснае — зусім не проста.

Алена Яцко пачалася працаваць у Асіповіцкім раёне ў кастрычніку мінулага года, і маршрут ахапіў тэрыторыю трох сельсаветаў. Хутка прапанаваў свае паслугі мясцовы прадпрымальнік Сяргей Капчан і атрымаў частку вёсак для збору малака. Сёння гэтыя два прадпрымальнікі ахопліваюць тэрыторыю 8 з 10 сельсаветаў Асіповіччыны.

Улады паставілі перад прыватнікамі асноўную задачу: зрабіць такі маршрут, каб ахапіць па шляху ўсе вёскі, вялікія і малыя, дзе людзі трымаюць кароў і хочуць прадаць малако.

— Вядома, на малочнай справе не разбагацець, але зарабіць можна, — каментуе Аляксандр Пузік. — Асіповіцкі малочны камбінат плаціць прадпрымальнікам 10% ад кошту сабранага малака — гэта, наколькі я памятаю, 194 тысячы рублёў за кожную здадзеную тону. Прадпрыемства таксама задаволена, што новыя партнёры патрабуюць ад людзей дысцыпліны, і якасць малака павысілася.

Безумоўна, кантроль за якасцю малака існаваў і пры ранейшай сістэме, але, можа, не такі сур'ёзны і нават жорсткі, як цяпер. Тым больш што людзі і самі зразумелі: прынцыповасць дае ім вынік у канкрэтных грашовых знаках. Калі раней тлустасць малака магла часам і недацягваць да базавай, то цяпер павялічылася, што аўтаматычна павысіла і плату за малако.

— Людзі сталі больш зарабляць, чым летась, а гэта цяпер, самі разумееце, які бальзам на душу, — падсумоўвае Аляксандр Пузік.

Антыкрызісныя кампенсацыі

Сёння ў Асіповіцкім раёне ў насельніцтва ёсць 770 кароў, больш за 600 ахоплена зборам малака. І што самае галоўнае, паводле вынікаў за першае паўгоддзе, Асіповіцкі раён перамясціўся з 16-га на 10-ты радок у Магілёўскай вобласці па зборы малака ў насельніцтва.

На аўтамабілях прадпрымальнікі заязджаюць у кожную вёску, аднак да кожнай хаты пад'ехаць усё ж не маюць магчымасці. Час бяжыць, а малако — гэта прадукт, які хутка псуецца, асабліва ў спякоту. Таму ў вёсках зрабілі так званыя малочныя сталы, куды гаспадары загадзя выстаўляюць сваю прадукцыю.

У Асіповіцкім раёне гавораць, што вялікую падтрымку новай сістэме збору малака аказаў **абласны Савет дэпутатаў пад кіраўніцтвам Уладзіміра ПАНЦЮХОВА**. Некалькі сур'ёзных нарад, і рашэнне Прэзідыума аблсавета дазваляе вырашаць многія праблемы хутка і на месцы. А якраз цяпер, у сувязі з новымі фінансавымі рэаліямі, на парадку дня паўстала новае пытанне.

Улетку, калі ідзе вялікае малако, прыватнікі зарабляюць, кампенсуючы свае транспартныя выдаткі. Хоць гэта стала рабіць цяжэй пасля павелічэння цэн на паліва. Але напярадзе — восень і зіма, калі надоі памяншаюцца. А людзі ў любы сезон хочуць, каб да іх ехалі, нават нягледзячы на выдаткі, забіралі малако і плацілі грошы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

МАЛОЧНЫЯ ВОЗЧЫКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Што рабіць у такой сітуацыі? — разважае Аляксандр Пузік. — Нам падаецца, што малочнаму камбінату варта хоць бы часткова кампенсоўваць транспартныя выдаткі прадпрымальнікам, якія будуць збіраць малако ў насельніцтва з верасня па сакавік. Гэта было б лагічна. Пакуль справа не вырашана канчаткова, робяцца разлікі, але мы спадзяёмся на лепшае.

Апроч заробку, памятаць пра сумленне

Пакуль падобную сістэму збору малака ў насельніцтва прыватнымі прадпрымальнікамі не ўдаецца ўкараніць у іншых сельскіх раёнах вобласці, нягледзячы на семінары. Гавораць, што пад любую новую справу патрэбны не столькі сродкі, колькі энтузіясты.

— Не, і мы ў Асіповічах яшчэ не схапілі бога за бараду, — шчыра прызнаецца старшыня раённага Савета дэпутатаў. — Мяне, вядома, радуе, што адзін з прадпрымальнікаў хоча далей развівацца, арганізаваць прыватнае прадпрыемства, бо ў нас яшчэ ёсць тэрыторыі двух сельсаветаў (яны, праўда, некалькі ўбаку), якія можна ахапіць зборам малака. Аднак я заўсёды памятаю, што, калі нешта здарыцца, прыватнік можа павярнуцца і пайсці. А мы павінны думаць пра людзей. Калі чалавек хоча працаваць, а не можа зарабіць на выніках сваёй працы, ён проста прадасць сваю карову і ляжа на печ. Што тады рабіць?

Аднак нечакана аказалася, што і прадпрымальнікі — людзі разумныя і свядомыя. Сяргей Капчан цвёрда лічыць, што тут ідзе размова не толькі пра прыбыткі, але пра сумленне, падтрымку сялян і адраджэнне вёскі ўвогуле.

— Не сказаць, што тут грошы з неба падаюць, але на жыццё можна зарабіць, ды і вёску я вельмі люблю, — гаворыць Сяргей. — Тут важная лагістыка, каб выгадныя маршруты перакрывалі не вельмі выгадныя.

Сёння маршрут Капчана складае прыблізна 75 кіламетраў: за суткі цяпер удаецца сабраць і здаць 4-5 тон малака. Ёсць на маршруце аддаленыя вёскі і грунтовыя дарогі. І нечакана чуць ад бізнэсмена, што, нягледзячы ні на якія выдаткі, ён усё роўна паедзе на далёкі хутар да маці 4-х дзяцей, для якой карова — важная крыніца даходу.

— Ведаеце, для мяне малако — гэта не толькі эканоміка, але і клопат пра людзей, — гаворыць Сяргей. — Кароў трымаюць сёння самыя лепшыя, працавітыя людзі. І што, вы хочаце сказаць, што не трэба дапамагаць 83-гадовай бабулі, якая жыве ў кіламетры ад трасы і хоча зарабіць сваю капейчыну на малацэ? Гэта ж нібыта ваша маці! Апроч заробку, у чалавека павінна быць сумленне!

Больш грошай — больш кароў

Старшыня Дараганаўскага сельскага Савета Антаніна СЦЯПАНАВА сёння не мае сумненняў: праца з прадпрымальнікамі па зборы малака — гэта станоўчы вопыт.

— Я ўжо не буду казаць пра ахоп аддаленых вёсак і якасць малака, — тлумачыць яна. — Скажу пра тое, што дзякуючы Капчану здымаюцца ўсе цяжкія пытанні, якія раней былі для нас проста галаўным болем.

Прадпрымальнік мае спецыяльныя апараты, якія дазваляюць на месцы і без лішніх слоў высветліць, што за малако здае гаспадар, — усе сумненні знікаюць. Увогуле прадпрымальнікі і здатчыкі малака супрацоўнічаюць паводле дамовы і, у адпаведнасці з гэтым дакументам, вырашаюць усе спрэчныя пытанні.

— Людзі бачаць, за што яны працуюць, — расказвае Антаніна Сцяпанава. — Ім добра, і прыватнік ставіцца да іх з павагай.

Старшыня Ясенскага сельскага Савета Андрэй ШАЦІЛА прызнаецца, што ў новай малочнай справе яны яшчэ на самым пачатку шляху. Тут у вёсках збіраюць малако ў насельніцтва Алена Яцко і яе сын.

— Да альтэрнатыўнай сістэмы людзі паставіліся спачатку не з самым вялікім даверам, але на сходзе яны ўсё ж прынялі рашэнне пайсці на кампраміс, — расказвае старшыня. — Так падаецца, што аб гэтым не пашкадавалі. Тлустасць сабранага малака пайшла ўгору — да 4-4,5%, што павялічыла і заробкі ўладальнікаў кароў, таму ў вёсках Ясенскага сельсавета сяляне сталі набываць кароў, а не пазбаўляцца ад іх.

У Асіповіцкім раёне ўдалося не выключыць зусім з агульнай малочнай справы сельскія гаспадаркі. Цяпер увесь цяжар па зборы малака ляжыць не на іх, аднак мы ўсё ж папрасілі падтрымліваць сялян. Напрыклад, сенам: тры тоны сена, якія патрабуюцца на карову, дапамогуць скасіць, альбо прададуць гатовыя рулоны. Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы набываюць цялят, мяняюць кароў, прадастаўляюць ветэрынарныя паслугі. Улады спадзяюцца, што гаспадаркі і прадпрымальнікі, якія прыходзяць працаваць у малочную галіну, будуць супрацоўнічаць дзеля карысці людзей.

— Мая пазіцыя такая, — кажа на заканчэнне Аляксандр Пузік. — Гаспадары на вёсцы павінны мець магчымасць зарабіць на сваёй прадукцыі, а мясцовыя саветы павінны быць органам, які назірае за парадкам у гэтай сферы.

Ілона ІВАНОВА,

Асіповіцкі раён.

«УСЁ АДРАЗУ ВЫКАНАЦЬ НЕЛЬГА»

Вымушаная мера

Бацькі школьнікаў з вёскі Вязынка звярнуліся да Барыса Батуры з просьбай адмяніць рашэнне аб закрыцці іх сельскай школы. Па іх словах, школа на вёсцы — культурны цэнтр, неабходны жыхарам. Апроч таго, бацькі непакояцца, што могуць узнікнуць праблемы з падвозам дзетак у школу ў Радашковічах, якая знаходзіцца за 9 км ад іх вёскі.

Старшыня Мінаблвыканкама паабяцаў яшчэ раз вывучыць канкрэтную сітуацыю, але пры гэтым нагадаў, што цяпер па краіне закрываюцца многія школы, размешчаныя ў сельскай мясцовасці. Трымаць выкладчыцкі калектыў для некалькіх дзясяткаў вучняў — нерацыянальна, тым больш што і забяспечыць дзецям паўнавартаснае навучанне ў такой школе немагчыма. Гэта вымушаная мера, патлумачыў старшыня, аднак пры гэтым для ўсіх вучняў, чые школы закрываюцца, дзяржава прадугледзела аўтобусны падвоз да новага месца навучання. Іншая справа — забяспечыць бесперабойнасць руху транспарту. Гэты момант трэба пастаянна трымаць на кантролі.

У адпаведнасці са стандартам

Жыхарка вёскі Літва прыйшла на прыём да кіраўніка Мінаблвыканкама з надзеяй аднавіць стацыянарны магазін райпа, які раней там працаваў. Пасля яго закрыцця 275 вяскоўцаў абслугоўваюцца аўталаўкай, але яна не ў стане замяніць сабой паўнавартасны стацыянарны гандлёвы пункт. У рэспубліканскай праграме развіцця спажывецкай кааперацыі адкрыццё стацыянарнага аб'екта гандлю ў вёсцы Літва запланавана на 2012 год. Да гэтага часу раённыя ўлады паабяцалі адкрыць там «часовы магазін» райпа, аднак такі варыянт Барыса Батуру не задаволіў. Ён даручыў адкрыць стацыянарны магазін у Літве сёлета, з апераджэннем праграмных планаў.

А вось аналагічную просьбу адкрыць стацыянарны магазін у вёсцы Навасёлкі, дзе пражывае менш за сотню чалавек, старшыня абласнога камітэта адхіліў. Ён нагадаў жыхарам аб дзейных сацыяльных стандартах і аб законах эканомікі, згодна з якімі магазін, дзе няма неабходнага таваразвароту, не можа акупіць затрат на сваё ўтрыманне.

Адсутнасць сістэмы

Прыблізна 26 працэнтаў усіх зваротаў у Мінаблвыканкам тычацца дарожнай гаспадаркі. Пенсіянер з аграгарадка Лебедзева прыехаў на прыём да Барыса Батуры паскардзіцца на нездавальняючы стан дарог на вуліцах свайго населенага пункта. А канкрэтна тых, якія не былі заасфальтаваны пры здачы аграгарадка і засталіся грунтовымі. Па словах наведвальніка, пасля дажджу дарогі размываюць ажно да труб газапровада, пракладзенага ўздоўж вуліц. «Пра асфальт я размовы не вяду, — папярэдзіў пенсіянер, — прашу пасыпаць шчэбнем, каб не мець больш праблем з гэтымі дарогамі».

Увогуле, нараканні на дрэнны стан дарог у сельскіх населеных пунктах Маладзечанскага раёна на прыёме грамадзян агучваліся неаднойчы, што дало падставу старшыні абласнога выканаўчага камітэта зрабіць высноў аб адсутнасці сістэмы ў рабоце мясцовых прафільных службаў. «Чаму рэгулярна гэтым не займаецеся? — звярнуўся да іх Барыс Батура. — Інакш людзі не звярталіся б да мяне». Ён запатрабаваў павышэння якасці ўтрымання дарог у рэгіёне і перавядзення ўсіх работ на сістэмную аснову.

...Падводзячы вынікі асабістага прыёму грамадзян, старшыня Мінаблвыканкама яшчэ раз адзначыў вялікі аб'ём зваротаў па тэме капрамонту і добраўпарадкавання:

— у Маладзечне цяпер выконваецца вялізны аб'ём работ, і кожнаму хочацца, каб яго дом адрамантавалі ў першую чаргу. Людзі мяркуюць, што ўсе пытанні па ўсім горадзе і раёне павінны быць вырашаны адначасова. Вядома ж, гэта зрабіць немагчыма. Мы імкнёмся задаволіць просьбы людзей максімальна хутка, але яшчэ раз падкрэслю: усё адразу выканаць нельга. У нашай вобласці распрацавана сістэма: у кожным сельскім, пасялковым выканкаме размешчаны праграмы капітальнага рамонту жылля, абуладкавання вуліц, замены водаправодаў, планы газіфікацыі і г.д., дзе дакладна пазначана: што, дзе і калі будзе зроблена. Некаторыя людзі хочуць апярэдзіць графікі, але гэтыя праграмы складзены з улікам таго фінансавання, на якое мы разлічваем у бягучай пяцігодцы. Іншая справа, калі ўзнікае аварыйная, непрадбачаная сітуацыя (некага затапіла, пацёк дах і г.д.). Такія работы павінны выконвацца неадкладна.

Нагадаем, што ў Мінскай вобласці дзейнічае адзіная даведачна-інфармацыйная служба з кароткім нумарам 142. Па гэтым нумары тэлефона жыхары вобласці могуць атрымаць адказы на ўсе свае пытанні. Акрамя таго, можна звярнуцца і на «гарачую лінію» Мінаблвыканкама.

Інга МІНДАЛЁВА, *Маладзечанскі раён.*

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества	Лот № 1. Автомобиль FordMondeo 1999 г.в., гос. номер 9330 ВК-2
Собственник (владелец) имущества	ЧУП «Стер»
Местонахождение (адрес) имущества	г. Браслав, ул. Ленинская, 46
Стоимость имущества	Лот № 1 – 23 419 200 белорусских рублей (с учетом НДС)
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Браслав, ул. Красноармейская, 8 16 августа 2011 года в 12.00
Справочная информация	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 320, http:// vitebsk.court.by. Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович тел./факс (80212) 49 13 41, (8029) 366 40 11. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 15.08.2011. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

СЕЛЬСКІЯ МОГІЛКІ... ПА-ЗА ЗАКОНАМ

Кантралёры праверылі стан сельскіх могілак і...

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці падчас праверкі дзейнасці Каст-рычніцкага сельскага выканаўчага камітэта Віцебскага раёна назвалі нездавальняючай арганізацыю пахавальнай справы. Усяго на тэрыторыі сельсавета знаходзяцца 16 сельскіх могілак.

Высветлілася, што ў парушэнне адпаведнага закона аб пахавальнай справе для могілак не вызначаны парадак іх функцыянавання; не ўстаноўлены парадак адводу і рэзервавання зямельных участкаў для пахавання; зямельныя ўчасткі для пахавання не маюць уліковых нумароў. Улік пахаванняў сельскім выканкамам не вядзецца, і не ажыццяўляецца кантроль за пахаваннем. Пашпартызацыя могілак і інвентарызацыя пахаванняў не праводзіліся. Гэтая работа не была ўскладзена на якую-небудзь спецыялізаваную арганізацыю.

Сельскія могілкі апынуліся «па-за законам» з усімі адпаведнымі наступствамі. Напрыклад, пры правядзенні аглядаў дзейных могілак у вёсках Шапуры і Барышына кантралёры ўстанавілі, што на іх не выконваюцца патрабаванні элементарных санітарных нормаў.

Па выніках праверкі праблема арганізацыі пахавальнай справы, дарэчы, характэрная для многіх сельскіх Саветаў, абазначана перад Віцебскім райвыканкамам. І зараз вырашаецца пытанне аб перадачы могілак на абслугоўванне прадпрыемству жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На Востраве — малочныя рэкі

Кожны, хто праязджае па трасе Гомель—Мінск, можа заўважыць прыгожы, вялікі статак каля вёскі Востраў, што на Рагачоўшчыне. Сёлета аператары машыннага даення з СВК «Чырвоная Армія» паказваюць высокія вынікі. Таму і дзённая дойка ідзе хутка, спраўна. Яшчэ ў 2009 годзе на Гомельшчыне з'явіліся першыя рабатызаваныя фермы, якія абслугоўваюць тры чалавекі: аператар, заатэхнік і ветурач. Зараз гэта не выключэнне, а правіла. Усё малако — класа «экстра».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Рагачоўскі раён.

19 гадоў працуе Марыя ПАНІЗОВІЧ аператарам машыннага даення. *«Сёлета, калі трава будзе добрая і мае 50 каровак будуць здаровыя, выйду на шэсць тысяч!»* — дзеліцца Марыя Іванаўна.

САМЫХ ЗЛОСНЫХ ДАЎЖНІКОЎ ПЕРАСЯЛЯЮЦЬ У ІНШАЕ ЖЫЛЛЁ

У жыхароў Віцебскай вобласці, паводле інфармацыі ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама, на пачатак ліпеня пратэрмінаваная запазычанасць за камунальныя паслугі складае каля 5 мільярдаў рублёў. А на гэтыя грошы можна было б рамантаваць дахі, старыя дамы, забяспечваць насельніцтва гарачай вадой.

Калі прааналізаваць запазычанасць па рэгіёнах, то можна ўбачыць наступную «карціну». У «лідарах» жыхары Аршанскага раёна, на другім месцы — Полацкага, потым ідуць Віцебскі, Ушацкі, Талачынскі і іншыя.

У якасці станоўчага прыкладу прыводзіцца вопыт вырашэння праблемы ў пасёлку Бароўка Лепельскага раёна, у Наваполацку, Оршы, Віцебску, Паставах, Чашніках.

Камунальнікі, як могуць, «змагаюцца» за грошы, якія запазычыла насельніцтва. Людзей пісьмова папярэджваюць, больш як 4 тысячам даўжнікоў спынілі падачу вады. Пададзены 40 іскавых заяў на высяленне. Шэсць сямей пазбавіліся свайго жылля і цяпер жывуць у больш сціплых умовах.

Адным з эфектыўных метадаў паніжэння ўзроўню пратэрмінаванай запазычанасці з'яўляецца спісанне пені грамадзянам, якія поўнасцю пагасілі суму асноўнага доўгу. Так, у цэлым па вобласці пеня была спісана па адпаведных заявах 188 грамадзянам на суму 241,9 мільёна рублёў. Пры гэтым было пагашана 278,6 мільёна рублёў асноўнага доўгу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КУП: чатыры пастулаты поспеху

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дзякуючы набытаму новаму аўтагідрапад'ёмніку з вышынёй пад'ёму 22 метры мы можам аказваць паслугі па зносе аварыйных дрэў. Гэта нятанная паслуга, але на яе ёсць попыт па ўсім раёне і нават за яго межамі (мы працавалі ў Бярозаўскім і Драгічынскім раёнах). Уявіце дрэва вышынёй метраў пад 30 і шырынёй ствала 1,8 метра, якое вырасла ў межах населенага пункта. Калі яно зваліцца, наступствы могуць быць сумнымі. Толькі на сваёй тэрыторыі мы паспелі ліквідаваць каля 330 такіх небяспечных дрэў. Гэта складаны від работ, нашы людзі прайшлі неабходнае навучанне.

— Хто аплачвае КУПу знос аварыйных дрэў?

— Калі дрэва вырасла ў месцы грамадскага карыстання, то знос праводзіцца за кошт бюджэту сельвыканкама. Калі ж на прысядзібным участку, то работы павінен аплаціць гаспадар. Але ў гэтай сітуацыі да пытання аплаты мы падыходзім індывідуальна. Адзінокім састарэлым мы спілоўваем аварыйныя дрэвы зноў жа за кошт бюджэту. Чалавечае жыццё даражэй.

Апроч іншага, КУП аказвае паслугі па добраўпарадкаванні тэрыторыі сельсавета: абкос тэрыторыі, замена брам і вываз смецця з могілак і г.д. Увогуле, вывазам бытавых адходаў ад насельніцтва па дагаворы займаецца мясцовая ЖКГ, а КУП аказвае аналагічную паслугу — прычым бясплатна — для льготных катэгорый вяскоўцаў (адзінокіх састарэлых, інвалідаў і ветэранаў). Адпаведнае рашэнне на сесіі сельскага Савета было прынята яшчэ тры гады таму.

Сёлета работнікі КУПа задзейнічаны на рамонце дахаў у нашых СВК, у асноўным на збожжаачышчальных комплексах. З сакавіка КУПаўцы паспелі папрацаваць у СВК «Дастоева», у СВК «Дружылавічы», СВК «Машэраўскі», у сваім СВК «Прыясельна». Сёння працуем у СВК «Ляхавічы». Другі год запар наша брыгада на правах субпадрадчыка бярэ ўдзел у аздобных работах на аб'ектах будаўніцтва жылля...

Што тычыцца рытуальных паслуг, без якіх таксама на вёсцы не абысціся, тут КУП пакуль што можа дапамагчы толькі выкапаць магілу, але ў перспектыве плануе прадастаўляць і спецтранспарт.

— Чым загружаны работнікі КУПа ў асенне-зімовы перыяд?

— Восенню, калі ўжо сабраны ўраджай, ідзе масавае перавозванне агародаў на зіму. Мы спецыяльна для гэтых мэт набылі дыскавую барану. Больш ні ў каго з прыватнікаў з ліку нашых суседзяў няма такога абсталявання. Попыт на яе высокі. Падобная барана ёсць у СВК, але яе памеры не дазваляюць развярнуцца на невялікіх агародах.

Зімовы перыяд пачынаецца ў нас з 20 снежня. Увесь студзень — гэта час аплачваемых чарговых адпачынкаў. Але гэта не значыць, што дзейнасць КУПа ў цэлым спыняецца. Зімой мы, як правіла, займаемся рамонтам тэхнікі. Ужо ў лютым (калі надвор'е дазваляе) прыступаем да зносу аварыйных дрэў (гэта найбольш спрыяльны час, бо на галінах няма лісця). Увогуле, задача адміністрацыі КУПа — у летні час арганізаваць працу прадпрыемства максімальна вынікова, каб потым было чым плаціць заробак у зімовы перыяд. Летась увесь сакавік КУП працаваў на рамонтных работах у СВК. Цяпер будзе выступаць субпадрадчыкам на аб'ектах будаўніцтва двух шматкватэрных дамоў (зоймецца распілоўкай і падрыхтоўкай драўляных будматэрыялаў і г.д.).

Напрыканцы года адміністрацыя распрацоўвае графік занятасці на ўвесь год па ўсіх відах работ, заключае дагаворы. Сёння ўвесь раён ведае, што для таго, каб заказаць, напрыклад, наш аўтагідрапад'ёмнік, трэба зрабіць заяўку загадзя, бо план работы ў брыгады распісаны на некалькі месяцаў наперад.

— Не магу не пацікавіцца памерам заробку ў вашым КУПе...

— Сярэдні заробак за 2010 год склаў 650 тысяч рублёў. Фіксаванага акладу ў нас няма. Заробак — здзельны, і ў залежнасці ад канкрэтнага заказу і аб'ёму работ ён можа перавысіць мільён рублёў. Праўда, і патрабаванні да сваіх работнікаў КУП прад'яўляе жорсткія. З тымі, хто не вытрымлівае правілаў дысцыпліны, адміністрацыя развітваецца. А недахопу ў новых кандыдатах няма. Запоўніць рабочыя вакансіі проста. Праблематычна знайсці талковага інжынера, здольнага правільна распарадзіцца перамяшчэнне спецтэхнікі ў межах нашага сельсавета і што пры пераездах на большую адлегласць прыйдзецца даплаціць за лішні кіламетраж. Людзі пачынаюць пагражаць, што, калі мы адмовімся, яны паскардзяцца ў раён ці вышэй. Даводзіцца пераконваць, што ад заяўкі мы не адмаўляемся, але папярэджваем аб большым кошце паслугі па прычыне большай адлегласці і адпаведнага расходу паліва.

— Ці плануеце вы надалей пашыраць спектр паслуг, якія аказваюцца КУПам?

— Абавязкова! Калі ствараўся КУП, мы паставілі перад сабой дзве задачы. Першая — на працягу першых 3 гадоў вярнуць дзяржаве 150 мільёнаў пазыкі. Што мы і зрабілі (апошні плацеж правялі сёлета ў маі). Пакуль вярталі грошы, мы не маглі сабе дазволіць расходаваць сродкі на наша пашырэнне. Сёння наблізіліся да другога этапу дзейнасці, а канкрэтна — да максімальна эфектыўнага выкарыстання кінутых участкаў, якія знаходзяцца ў межах вёскі і не могуць быць вернуты ў прамысловы севазварот. Ёсць надзелы па 20-30 сотак, якія абкружаны дамамі, аднак з-за патрабаванняў пажарнай бяспекі мы не маем права ўзводзіць там новую пабудову (адлегласць паміж суседнімі хатамі павінна быць не меншай за 45 метраў). Атрымліваецца, што на цэнтральнай вуліцы «мазоляць вочы» пустэчы. Сёлета мы ўжо распачалі рэалізацыю сваёй ідэі па выкарыстанні такой зямлі. Варыянтаў шмат. Напрыклад, вырошчваць лекавыя травы (мы якраз разглядаем такую магчымасць). Яшчэ адна ідэя — арганізаваць у сябе міні-ферму для атрымання ялавічыны і свініны: збіраемся набыць парсючкоў в'етнамскай пароды, неперабораліых у ежы, а на пустых участках вырошчваць кармы для іх.

— Сяргей Рыгоравіч, што, на вашу думку, можа паспрыяць больш актыўнаму стварэнню КУПаў у нашай краіне?

— Я лічу, што вельмі карысным і эфектыўным для падтрымкі такога перспектыўнага кірунку як КУПы стала б стварэнне рэспубліканскай Асацыяцыі камунальных унітарных прадпрыемстваў, якая б магла каардынаваць іх працу, распаўсюджваць карысныя напрацоўкі. У краіне ёсць Саветы калгасаў раёна, вобласці, рэспублікі; прамысловыя прадпрыемствы ўваходзяць у склад сваіх профільных міністэрстваў. А КУПы пакуль застаюцца без каардынатара. Самі па сабе...

Увогуле, мне вельмі цікавы вопыт работы КУПаў у іншых рэгіёнах. Ведаю яшчэ, што ў асобных раёнах пытанні аказання паслуг насельніцтву на вёсцы перададзены камунальным службам. Як яны з гэтым спраўляюцца? Наколькі гэта эфектыўна? Запрашаю ўсіх зацікаўленых да дыскусіі на старонках «МС».

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 27 ліпеня 2011 года.

Кватэрнае пытанне

ЧАРГА НА ЖЫЛЛЁ ЁСЦЬ. НА КРЭДЫТ — НЯМА

Мы — маладая сям'я з катэгорыі малазабяспечаных, стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Хацелі стаць у выканкаме ў чаргу яшчэ на льготны крэдыт, нам сказалі, што трэба знайсці забудоўшчыка, заключыць дагавор і толькі тады звяртацца.

Ці праўмерная такая адмова?

Л. З., *Мінскі раён.*

Дзейнае заканадаўства не прадугледжвае вядзенне спецыяльнага ўліку грамадзян, якія жадаюць атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылых памяшканняў.

Палажэннем аб парадку і ўмовах выдзялення грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 2002 г. № 992) вызначана, што ільготныя крэдыты выдзяляюцца грамадзянам, якія знаходзяцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (за выключэннем грамадзян, якія прызнаны асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па дадатковых падставах, прадугледжаных арганізацыямі ў калектыўных дагаворах) і ўключаным у спісы грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і маючых права на атрыманне льготных крэдытаў, якія складзеныя па форме, што прыкладаецца да гэтага Палажэння, з захаваннем чарговасці грамадзян зыходзячы з часу пастаноўкі іх на ўлік (зацвярджаюцца адпаведна раённымі, гарадскімі выканаўчымі і распарадчымі органамі, мясцовымі адміністрацыямі).

Па-за чаргой, у адпаведнасці з падпунктам 1.10 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185, у гэтыя спісы могуць быць уключаны, у прыватнасці, інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і прыраўнаваныя да іх у вызначаным парадку асобы; грамадзяне, якія пражываюць у жылых памяшканнях, прызнаных у вызначаным парадку непрыдатнымі для пражывання; хворыя на актыўную форму туберкулёзу; спецыялісты, накіраваныя дзяржаўнымі органамі на працу ў сельскую мясцовасць; шматдзетныя сем'і; грамадзяне, у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці-інваліды, а таксама інваліды з дзяцінства I і II групы і іншыя льготныя катэгорыі грамадзян.

Маладыя сем'і не аднесены да ліку грамадзян, якія маюць права на ўключэнне па-за чаргі ў спісы на льготнае крэдытаванне.

Што да канкрэтнай працэдуры ўключэння ў вызначаным парадку чаргавікоў у спісы грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў у 2011 годзе, то з ёй можна азнаёміцца ў адпаведных службах мясцовага выканаўчага і распарадчага органа.

Віктар САВІЦКІ.

ЭКАНОМНЫЯ ЖЫВУЦЬ ЛЕПШ

Эканомія і беражлівасць актуальныя ва ўсе часіны, лічаць у КДК Магілёўскай вобласці. Калегія вывучыла, як выконваецца ў рэгіёне Дырэктыва Прэзідэнта № 3.

— У першую чаргу мы звяртаем увагу на рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў і дзяржаўнай маёмасці, — паведамляе пра вынікі праверкі **начальнік упраўлення кантролю галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы КДК Магілёўскай вобласці Юрый ФРАЛОЎ.** — Напрыклад, у Салтанаўскім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце, што ў Магілёўскім раёне, крайне неашчадна паставіліся да бюджэтных грошай, якія выдаткавалі з бюджэту на набыццё мэблі. Грошай было каля 220 мільёнаў рублёў, і чамусьці кіраўніцтва дома-інтэрната набыло ў ЗАТ «Бабруйскмэбля» самую дарагую мэблю з вінілісскуры і натуральнага дубу. Аналагічную мэблю з больш простых матэрыялаў можна было набыць у два-тры разы танней.

На ААТ «ФанДОК» выявілі ўрон на 607 мільёнаў рублёў: куды падзеліся з прадпрыемства піламатэрыялы і шпон на гэтую суму — цяпер будуць высвятляць праваахоўныя органы. Ёсць і яшчэ адзін негатыўны факт, які датычыцца гэтага бабруйскага прадпрыемства: «ФанДОК» набыў драўніну ў Расіі, а калі б яны гэта зрабілі ў Беларусі, то было б танней на 275 мільёнаў рублёў.

— Мы імкнёмся не проста праверыць, але і падказаць, як больш эфектыўна выкарыстоўваць рэсурсы, — расказвае далей Юрый Фралоў. — Пры ранейшай праверцы Магілёўскага металургічнага завода мы звярнулі ўвагу на пыл, які ўтрымлівае жалеза. Ён утвараецца пры апрацоўцы металу, у вытворчасці не выкарыстоўваецца і захоўваецца ў вялікай колькасці менавіта на тэрыторыі завода. Плавіць з пылу метал не атрымалася. Але пасля прапановы Камітэта Міністэрству прамысловасці паспрабаваць рэалізаваць пыл на экспарт, металургічны завод сапраўды знайшоў партнёраў у Грузіі і прадаў 135 тон пылу на 45,9 тысяч долараў. Цяпер рыхтуецца да адпраўкі новая, яшчэ больш буйная партыя. Атрымаўся рэзерв, дадатковы даход.

Паводле Дырэктывы № 3, у КДК сочаць за эфектыўным выкарыстаннем энергіі. Напрыклад, спецыялісты звярнулі ўвагу, што ў інтэрнатах расход электрычнасці большы за расход у звычайных жылых дамах. Прычым істотна большы: у 1,7 — 3,8 раза.

Чаму так адбываецца? Прычыны могуць быць розныя: напрыклад, шырокае выкарыстанне электрычных пліт, адсутнасць энергазберагальных лямпачак альбо незацікаўленасць саміх жыхароў у эканоміі, калі на ўвесь інтэрнат адзін лічыльнік. Што тут праўда, а што не — цяпер высвятляць Магілёўскаму абласному ўпраўленню па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў.

Пакуль вывучаюць праблему з электрычнасцю, іншае пытанне пра зберажэнне рэсурсаў ужо блізкае да вырашэння. Летась КДК Магілёўскай вобласці звярнуў увагу на свідравіны сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Каб вада не здабывалася бескантрольна і плаціліся акуратна падаткі ў бюджэт, вырашылі абсталяваць свідравіны лічыльнікамі вады. Цяпер больш за 90% свідравін маюць лічыльнікі.

— Гэта можа падацца дробяззю, — каментуе Юрый Фралоў. — Але з іх складаюцца вялізныя сумы. Нездарма гавораць, што капейка беражэ рубель. Прымаўка старая, але правільная.

КДК Магілёўскай вобласці штогод разглядае вынікі праверкі ў справе выканання Дырэктывы № 3. Сёлета калегія зноў адзначыла недастатковасць мер, якія прымаюцца, а за выяўленыя парушэнні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 25 юрыдычных і 53 асобы на агульную суму у 94,6 мільёна рублёў, да дысцыплінарнай адказнасці — 27 асоб.

— Рэзервы ёсць, — падсумоўвае Юрый Фралоў. — І спадзяёмся, што ў будучыні людзі будуць разумець важнасць эканоміі без праверак, стануць свядомымі. Трэба навучыцца ашчадна ставіцца да таго, што мы маем. Гэта адзін са спосабаў лепш жыць — навучыцца эканоміць. Што сёння вельмі актуальна.

Ілона ІВАНОВА.

Ну і ну!

СПАЧАТКУ — ТЭХНІКА, ПОТЫМ — ГАРЭЛКА І ШАШЛЫК

У Гродне затрымана злачынная група, якая на дзясяткі мільёнаў рублёў абакрала цэнтр знаходжання інвалідаў.

Супрацоўнікам міліцыі хапіла сутак, каб выявіць зламыснікаў і вярнуць украдзенае. Вось што паведамляе аб гэтым дзёрзкім злачынстве аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Двое беспрацоўных, раней судзімых 22-гадовых гродзенцаў паклалі вока на непрыкметны будынак па вуліцы Лізы Чайкінай, дзе размяшчаецца аддзяленне дзённага знаходжання інвалідаў Кастрычніцкага раёна. Налёт вырашылі здзейсніць увечары, калі дождж з навальніцай практычна вызвалілі вуліцы ад мінакоў, а значыць ад магчымых сведак. Доўга не раздумваючы, пад'ехалі на іншамарцы да гэтай установы, выбілі нагой дзверы і ўзяліся за справу. У лічаныя хвіліны ў машыну перамясціліся пяць вадкакрысталічных маніторaў, чатыры сістэмныя блокі, шматфункцыянальнае ўстройства, тэлевізар, DVD-прайгравальнік і іншая лічбавая тэхніка.

У той жа вечар усё гэта налётчыкі распрадалі знаёмым, а то і зусім чужым людзям. Дарагую тэхніку аддавалі вельмі танна — за сотню-другую «зялёных» і нават пагаджаліся на адтэрміноўку плацяжу. А заява ў міліцыю паступіла раніцай, калі супрацоўнікі цэнтра прыйшлі на працу. І неўзабаве была ўстаноўлена асоба аднаго з верагодных зламыснікаў. Арыенціроўку на яго накіравалі ва ўсе раёны вобласці.

«Чужых» у невялікім райцэнтры Бераставіца заўважыў мясцовы ўчастковы інспектар міліцыі А. Кіган. Вырашыў іх праверыць, выклікаў апергрупу РАУС. І не памыліўся. Праўда, у аўтамабілі зламыснікаў ні маніторaў, ні сістэмных блокаў, ні іншай тэхнікі не аказалася, замест гэтага багажнік быў запоўнены гарэлкай і шашлыком. Аднак адсвяткаваць удалы крадзеж у хлопцаў не атрымалася, бо цяпер трэба адказваць на пытанні следства.

Дарэчы, налётчыкі спрабавалі ўсяляк заблытаць праваахоўнікаў, але ўкрадзеную тэхніку ўсё ж удалося знайсці, і неўзабаве яна вернецца ў цэнтр знаходжання інвалідаў. У бліжэйшы час там адновяцца заняткі, а таксама ўстановяць ахоўную сігналізацыю, каб засцерагчыся ад няпрошаных гасцей.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Кватарант забіў гаспадыню

У Полацку 22-гадовы хлопец забіў 47-гадовую жанчыну, якая здавала яму жыллё. Міліцыянеры ўстанавілі, што перад забойствам кватарант і гаспадыня кватэры выпівалі. Яны пасварыліся, і малады чалавек моцна пабіў яе. Труп жанчыны міліцыянеры знайшлі ў ванным пакоі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Конь знік з возам

Раней судзімыя жыхары вёскі Негаўка, што ў Буда-Кашалёўскім раёне, чарговы раз не ўтрымаліся ад спакусы. Каня разам з возам грамадзяне выкралі ў жыхара суседняй вёскі Рагінь. Выкрадзенае міліцыя знайшла хутка, і злодзеяў затрымала.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Заканадаўцы робяць акцэнт на прафілактыку ўжывання наркотыкаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Распрацоўшчыкі прадугледжваюць тры ўзроўні прафілактыкі. Першасны разлічаны на тое, каб засцерагчы людзей, якія яшчэ не пакаштавалі «кайфа». Другасны — на тое, каб спыніць ужыванне наркотыкаў у тых, хто ўжо хворы на наркаманію. Трэцічны — на змяншэнне рызыкі, што да наркотыкаў вернуцца тыя, хто спажываў іх раней. Уздзеянне на іх, натуральна, павінна быць розным. Для першых узмоцняць антынаркатычную прапаганду. У другіх будуць старацца як мага раней выявіць ужыванне наркотыкаў і аказаць медыцынскую дапамогу. Трэцім дапамогуць у сацыяльнай рэабілітацыі.

— Каб прафілактыка была эфектыўнай, трэба дакладна прапісаць, хто чым павінен займацца. Калі канкрэтыкі няма, магчымыя прарэхі. Трэба дакладна вызначыцца, дзе адказныя медыцынскія супрацоўнікі, дзе школа, дзе міліцыя, дзе грамадскія арганізацыі. Яны ў нас, дарэчы, шмат робяць па прафілактыцы ўжывання наркотыкаў, а таксама распаўсюджвання ВІЧ, які ўжыванне наркотыкаў часта цягне за сабой. Выцягваюць людзей насамрэч.

Галоўны эфект, якога чакае заканадаўца, — «пасля прыняцця гэтага і іншых датычных нарматыўных актаў павінна запрацаваць сістэма, якая не давала б нам страчваць людзей».

Законапраект ужо выклікаў мноства прапаноў і заўваг, асабліва па блоку прафілактыкі. Ёсць нават ідэі ўстанавіць апеку над падлеткамі.

— Улічым усё, асабліва нам цікавае меркаванне тых, хто займаўся гэтым у сваёй паўсядзённай дзейнасці, — адзначае парламентарый. — Будзем далучаць да работы не толькі медыкаў, але і ўсіх спецыялістаў, датычных да гэтай праблемы: супрацоўнікаў і Мінадукацыі, і МУС, і грамадскіх арганізацый. Спадзяюся, у выніку сумеснай працы нам удасца прыняць закон, які насамрэч стане дзейсным інструментам, што не дазволіць распаўсюдзіцца гэтай заразе.

Мэтазгоднасць прыняцця закона парламентарый не схільны тлумачыць трывожнай статыстыкай.

— За кожным такім працэнтам стаіць лёс чалавека, боль яго блізкіх. Што такое, калі ў сям'і раптам такая бяда — ад гэтага церпяць усе хто побач... Нават, калі б гэтыя працэнты былі меншымі, заслона ўсё роўна павінна быць пастаўлена.

А вось ці будзе яна дастатковай у новых абставінах — цяпер, калі з Расіяй і Казахстанам у нас няма мытных межаў, ці не пойдзе вал галоўнага афганскага тавару ў Беларусь?

— Пэўная занепакоенасць з гэтай нагоды, натуральна, ёсць, — не ўтойвае парламентарый. — Мы разумеем, што не ў замкнёнай прасторы жывём, ведаем, з кім Казахстан і Расія мяжуюць. Там праблема наркотыкаў вельмі надзённая. У гэтым плане, натуральна, вялікая нагрузка ляжыць на праваахоўнікаў. У рамках Саюзнай дзяржавы ёсць сумесныя праграмы, якія ўжо дзейнічаюць, прычым досыць эфектыўна. У нас ёсць супрацоўніцтва з Інтэрпалам і замежнымі дзяржавамі ў гэтым кірунку, сістэма адладжаная. Увогуле, ідучы на падпісанне дакументаў у рамках Мытнага саюза, мы загадзя ацэньвалі магчымыя рызыкі і што трэба зрабіць, каб папярэдзіць негатыўны эфект. Успомніце, колькі было затрыманняў, колькі каналаў паставак было перакрыта, колькі наркатычных сродкаў канфіскавана. На што толькі ні схітраюцца злачынцы, каб правезці цераз мяжу наркотыкі. І новыя папраўкі ў законапраект улічваюць гэтыя ўдасканаленні абароту наркотыкаў. Натуральна ж, нельга супакойвацца і думаць, што ўсё беспраблемна. Удасканаленне сродкаў барацьбы павінна быць безупыннym. Сілавы блок у гэтым плане павінен быць заўжды на крок наперадзе.

Распрацаваныя заканадаўчыя новаўвядзенні дапамогуць сілавікам трымаць перамогу над «кайфам» і тым, што папоўняць пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў. Галаўны боль нумар адзін для праваахоўнікаў — распаўсюджванне новых сінтэтычных псіхаактыўных рэчываў (тыпа JWH, CP, HU), што рэкламаваліся ў інтэрнэце як «легальныя наркотыкі» і былі ў свабодным доступе. Аналіз жа іх паказваў, паводле інфармацыі МУС, што амаль усе яны паўтараюць структурную формулу рэчываў, якія падлягаюць абавязковаму кантролю ў краіне — гэта значыць, наркотыкаў самых што ні на ёсць нелегальных — з дабаўленнем аднаго ці некалькіх радыкалаў. Ды эфект ад іх такі ж, як ад амфетаміну, какаіну ці марыхуаны.

— Пастаянна з'яўляюцца новыя рэчывы, якіх проста не было ў нашым пераліку, — расказвае Анатоль Ваньковіч. — А значыць, нельга было і прыцягнуць да адказнасці. Тым часам нашых грамадзян у Расіі спынялі і ледзь не рабілі злачынцамі за прэпараты, якія ў нас не лічацца небяспечнымі. Але калі мы ўжо ў адзінай дзяржаве, трэба заканадаўства прыводзіць у адпаведнасць. Мы не існуем асобна ад ЕўрАзЭС, Саюзнай дзяржавы, іншых структур, гарманізацыя ў гэтым кірунку неабходная. Распрацаваны законапраект улічвае найноўшыя тэндэнцыі ў гэтай галіне.

Наркотыкі прымяняюцца і ў медыцынскіх мэтах. Пры многіх цяжкіх траўмах і захворваннях такія прэпараты становяцца адзіным збавеннем ад нясцерпнага болю. «Памятаю, як пакрысе пачало адпускаць: спачатку пяткі, пасля ступні, ладыжкі, голені, калені, сцёгны», — згадвае свае адчуванні пасля абязбольвальных уколаў Хрысціна, у якой былі моцныя апёкі ног. Аднак не заўсёды такія прэпараты выкарыстоўваюцца па прызначэнні. Здараецца, што яны трапляюць тым жа наркаманам.

— Сустракаюцца злоўжыванні і з боку медыкаў, якія маюць права выпісваць рэцэпты на наркатычныя прэпараты, — канстатуе дэпутат. — Яны дорага каштуюць, і для многіх дактароў гэта спакуса. Нам, заканадаўцам, трэба дакладна прапісаць кантроль за прымяненнем наркатычных сродкаў у медыцыне.

А ці не прывядзе татальны кантроль да таго, што людзей будуць кідаць у турму за тое, што ў гаршчку расце нейкая незнаёмая расліна ці на гародзе знайшлася кветка маку, — вось што цікава.

— Перагібаў не будзе, — абяцае народны выбраннік. — Гэта не проста так, што, убачыўшы ў чалавека дзве кветкі маку ў агародзе, узялі і кінулі яго ў турму на тры гады. Кожны выпадак — гэта судовы разбор. І ўсім зразумела, што 80-гадовая жанчына, якая ўсё жыццё вырошчвала мак і пякла пірагі, — гэта не наркавытворца.

Разам з тым, дэпутат адзначае шкодную сілу няведання:

— Чалавек жа як думае: вось пакаштаваў, атрымаў «кайф», адышоў ад усіх праблем, хораша на душы. Людзі не разумеюць, якую шкоду гэта наносіць. Трэба тлумачыць, пачынаючы з дзцячага садка. Захады па прафілактыцы, няхай недзе будуць і дарагія, але гэта нашмат танней, чым потым лячыць, выцягваць людзей. Колькі гіне ад перадазіроўкі, колькі заражаецца ВІЧ, колькі падрывае здароўе і спыняе працоўную дзейнасць. Дзяржаве лепш усё гэта папярэдзіць, чым пасля змагацца.

Заўжды лепш быць над «кайфам», чым пад ім.

Ёсць нагода? Ёсць пытанне!

ЯК ЖЫВЕШ, СУСЕД?

У інтэрнэце з'явілася паведамленне, што жыхары аднаго са шматкватэрных дамоў у Новасібірску паскардзіліся ў міліцыю на свайго суседа, у кватэры якога жыў... мядзведзь. Суседзяў, дарэчы, абурыў не той факт, што побач жыла дзікая жывёліна, а тое, што гаспадар дрэнна з ёю абыходзіцца. Пасля высветлілі, што гэты мужчына — дрэсіроўшчык у цырку і што ўсе належныя дакументы на жывёлу ў яго таксама ёсць. Калі міліцыя прыехала агледзець кватэру з мядзведзем, звера там уже не было. Аказваецца мужчына жыў са сваім мядзведзем у кватэры, таму што быў у адпачынку. А як толькі адпачынак скончыўся, дрэсіроўшчык разам з жывёлінай паехаў на гастролі.

А якія ў вас стасункі з суседзямі?

Уладзімір НАВІЦКІ, будаўнік:

— Добрыя ў нас адносіны. Не сварымся. А чаго сварыцца, калі я добры і сусед добры. Але ж ёсць прымаўка: «Суседзяў не выбіраюць». Таму, напэўна, бывае рознае паміж людзьмі. Канфлікты бываюць, калі затопяць адно аднаго, альбо музыку хтосьці гучна ўключае.

Арцём ШАЎКОВІЧ, абітурыент:

— З нашымі суседзямі раней вельмі дружна жылі. У госці адзін да аднаго хадзілі. Маці ўвесь час з суседкай каву піла. А потым неяк разладзілася ўсё. Нейкая зайздрасць з'явілася. Пасля гэтага стасункі пагоршыліся.

Уладзімір ВАШКОЎСКІ, таксіст:

— З суседзямі мірна жывём. Сябруем. Нават ключы адно аднаму пакідаем, калі трэба. Каб кветкі, напрыклад, палівалі.

Ганна ЛАРЫЁНАВА, швачка:

— Я ў інтэрнэце жыву, таму ў мяне шмат суседзяў. Але жывём дружна. Канфлікты, калі бываюць, вырашаем мірна. Калі камусьці што-небудзь не падабаецца, шукаем кампраміс. Затапілі — таксама неяк дамаўляемся. Ёсць, зразумела, такія, што і не разумеюць, калі іх, напрыклад, просіш зрабіць цішэй музыку. Тады ўжо, бывае, і міліцыю клікаць даводзіцца.

Аляксей КУШНЕР, студэнт БНТУ:

— Як сказаць, нават не ведаю. Са старымі суседзямі ў нас добрыя адносіны. З новымі — нейтральныя. Неяк мы з імі не ідзём на кантакт.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«МЕТАЛАШУКАЛЬНІКІ» ПОБАЧ

7 чыгунных пліт ад прыватнага дома ў вёсцы Пакалюбічы Гомельскага раёна выкраў невядомы ноччу. А вось вартаўнік КСУП «Звязда» Чачэрскага раёна не стаў чакаць цемры. З трактара МТЗ-82 у вёсцы Нісімкавічы днём грамадзянін зняў задні мост, прычыніўшы шкоду на суму каля Br1 млн. У вёсцы Меркулавічы таго ж раёна мясцовы жыхар спакусіўся на маёмасць 78-гадовай суседкі. З яе веранды мужчына цягнуў алюмініевы бітон ёмістасцю 38 літраў. Нягледзячы на патрабаванні гаспадыні паставіць бітон на месца, 60-гадовы грамадзянін з выкрадзеным з месца здарэння знік і схаваўся. Тым не менш, яго затрымала міліцыя. Яна ж пакуль шукае яшчэ аднаго зборшчыка металалому, які зняў электрарухавік з ліфта шматпавярховага дома ў Светлагорску.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Як яно ёсць

Польшчу захапіў выраб «сінтэтыкі»

Усё часцей у зводках праваахоўнікаў Прыбалтыкі, Расіі, Украіны і Беларусі фігуруе інфармацыя аб спыненні спроб увозу на іх тэрыторыю наркотыкаў польскага паходжання. Польшча становіцца лідарам у Еўропе па падпольным вырабе сінтэтычных наркотыкаў. Еўрапалітыкі не замоўчваюць праблемы, агучваюць яе на шэрагу міжнародных канферэнцый, аднак ніхто пакуль, уключаючы саму Польшчу, не збіраецца пераходзіць ад слоў да справы.

— У бліжэйшай перспектыве наркагроза з краін не толькі Сярэдняй Азіі, але і Прыбалтыкі, і Польшчы, будзе толькі нарастаць, — мяркуе **начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Алег ШАРКОЎ.** — Спрашчэнне візавага рэжыму, развіццё малога прыгранічнага руху з той жа Польшчай пацягне за сабой і больш актыўны «чаўночны» ўвоз наркотыкаў...

Можна прыгадаць, напрыклад, як у пункце мытнага афармлення «Варшаўскі мост» не так даўно была спынена спроба незаконнага ўвозу з Польшчы на тэрыторыю Беларусі дзвюх упаковак таблетак «cirrus» і «sudafed» з небяспечным псіхатропным рэчывам псеўдаэфедрынам. Спыняюцца і спробы ўвозу такіх наркотыкаў, як гашыш і марыхуана.

Наогул, пачынаючы з 90-х гадоў, маштабы злоўжывання сінтэтычных наркотыкаў у свеце значна павялічыліся. Аб'ёмы канфіскаваных стымулятараў-амфетамінаў выраслі з 1990 па 2000 год у дзесяць разоў — з 4 да 40 тон. Камісія ААН па праблеме наркотыкаў прыйшла да высновы, што сярод усіх відаў наркотыкаў менавіта сінтэтычныя становяцца ворагам нумар адзін.

Выраб «сінтэтыкі» мае месца і ў Паўночнай Амерыцы, і ў Акеаніі, і ў Паўднёва-Усходняй Азіі... Падпольныя лабараторыі, якія вырабляюць да 100 кг наркотыкаў на працягу тыдня, існуюць у шэрагу краін свету, пакуль, у адрозненне ад какаіну ці гераіну, вытворчасць якіх у немалой ступені залежыць ад кліматычных умоў, сінтэтычныя наркотыкі можна вырабляць паўсюль. Тым не менш, большая частка амфетамінаў па-ранейшаму вырабляецца ў Еўропе. На яе долю прыпадаюць 53 працэнты канфіскацый. Па-ранейшаму вытворчасць амфетамінаў сканцэнтравана ў Галандыі, аднак у апошнія гады выраб пачаў перамяшчацца ў краіны, якія нядаўна сталі членамі Еўрапейскага саюза або з'яўляюцца краінамі-кандыдатамі на далучэнне да ЕС.

Польшча стала не толькі адным з асноўных маршрутаў кантрабанды наркотыкаў, але і важным цэнтрам іх незаконнай вытворчасці, што назіраецца з пачатку 90-х. Перш за ўсё, Польшча з'яўляецца буйным вытворцам незаконных сінтэтычных наркотыкаў, у тым ліку экстазі.

Толькі Расія за чатыры гады ажыццявіла звыш двух дзясяткаў канфіскацый «сінтэтыкі» польскага паходжання. У буйных расійскіх гарадах у гэты перыяд распаўсюджванне сінтэтычнага зелля і МДМА (экстазі) выраслa ў дзясяткі разоў. У самой Польшчы, дакладней, у польскіх школах, толькі ў 2009 годзе было зарэгістравана звыш 700 злачынстваў, звязаных з наркотыкамі, што на 156 злачынстваў больш, чым у 2008 годзе.

Фактычна кожны трэці польскі школьнік прызнаецца, што хоць бы раз ужываў марыхуану. Паводле прызнанняў польскіх школьнікаў і студэнтаў, набыць наркотыкі ў іх краіне — не праблема, паколькі ў буйных гарадах «працуюць» сотні дылераў. Прадметам жа крытыкі сёння становіцца адсутнасць крымінальнай адказнасці за захаванне наркотыкаў. Любое захоўванне наркатычных рэчываў або псіхатропных сродкаў, нават у вялікай колькасці, з'яўляецца ў Польшчы не злачынствам, а падставай для прымусовага лячэння.

Як вядома, Польшча сёлета стала краінай-старшынёй Еўрапейскага саюза. Паводле інфармацыі ІТАР-ТАСС са спасылкай на словы афіцыйнага прадстаўніка старшынства краіны ў ЕС Конрада Ніклевіча, «Польшча хоча яшчэ раз пацвердзіць, што гэта сучасная, дынамічная, добра арганізаваная краіна, якая можа знаходзіць рашэнні, выгадныя для ўсёй еўрапейскай садружнасці». У прынцыпе, ужо можна пераходзіць ад слоў да справы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

№ Лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок У-261/1	м-н «Погораны-Кошевники»	0,0916	440100000001006633	1 452 523	20 000 000	2 000 000
2.	Земельный участок У-262/1	м-н «Погораны-Кошевники»	0,1013	440100000001006634	1 447 833	22 000 000	2 200 000
3.	Земельный участок У-263/1	м-н «Погораны-Кошевники»	0,1017	440100000001006635	1 443 709	22 000 000	2 200 000
4.	Земельный участок У-264/1	м-н «Погораны-Кошевники»	0,1042	440100000001006636	1 466 576	23 000 000	2 300 000
5.	Земельный участок У-41*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0912	440100000003005134	1 025 752	23 000 000	2 300 000
6.	Земельный участок У-42*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0912	440100000003005135	989 587	23 000 000	2 300 000
7.	Земельный участок У-43*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0928	440100000003005137	993 902	23 000 000	2 300 000
8.	Земельный участок У-45*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0914	440100000003005138	910 628	23 000 000	2 300 000
9.	Земельный участок У-46*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0935	440100000003005139	910 628	23 000 000	2 300 000
10.	Земельный участок У-11*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1010	440100000001006281	1 360 837	25 000 000	2 500 000
11.	Земельный участок У-30*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1005	440100000001006287	1 360 837	25 000 000	2 500 000
12.	Земельный участок У-31*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1005	440100000001006286	1 360 837	25 000 000	2 500 000
13.	Земельный участок У-32*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1009	440100000001006285	1 360 837	25 000 000	2 500 000
14.	Земельный участок У-214*	м-н «Зарица-5»	0,1265	440100000002006369	697 751	26 500 000	2 650 000
15.	Земельный участок У-215*	м-н «Зарица-5»	0,1286	440100000002006370	680 331	26 500 000	2 650 000
16.	Земельный участок У-216*	м-н «Зарица-5»	0,1253	440100000002006371	667 456	26 500 000	2 650 000
17.	Земельный участок У-217*	м-н «Зарица-5»	0,1223	440100000002006372	667 455	26 500 000	2 650 000
18.	Земельный участок У-218*	м-н «Зарица-5»	0,1186	440100000002006373	700 288	26 500 000	2 650 000
19.	Земельный участок У-219*	м-н «Зарица-5»	0,1194	440100000002006374	700 288	26 500 000	2 650 000
20.	Земельный участок У-221*	м-н «Зарица-5»	0,1233	440100000002006376	703 298	26 500 000	2 650 000

*Инженерные коммуникации на участках отсутствуют. Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности для строительства и обслуживания индивидуального жилого дома.

Победитель аукциона обязан приступить к занятию земельного участка в течение одного года. В аукционе могут участвовать только граждане Республики Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно

№ Лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	Условие продажи и целевое использование земельного участка
1.	Право аренды земельного участка сроком на 50 лет	м-н «Вишневец-4» (поз. по генплану №90)	0,0421	440100000003005136	72 000 000	7 200 000	3 006 519	Строительство и обслуживание «Блока торгово-бытового назначения с аптекой»
2.	Право аренды земельного участка сроком на 10 лет	ул. Карского, 2Б	0,4037	440100000001004285	169 000 000	16 900 000	2 620 772	Строительство и обслуживание «Станции технического обслуживания автомобилей с автомойкой и магазином»
3.	Право аренды земельного участка сроком на 10 лет	ул. Соколовского	0,1191	440100000001006272	61 000 000	6 100 000	3 108 804	Строительство и обслуживание кафе на 100 мест

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица, – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона обязан течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 31 августа 2011 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2. Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. №57, в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 28 июля по 25 августа 2011 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42 61 62
ПРОДАВЕЦ: Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. (0212) 36 37 25

№ лота	Предмет аукциона, срок договора аренды, наименование, местонахождение недвижимого имущества	Целевое использование	Начальная цена (бел. руб.)	Размер задатка (бел. руб.)
1.	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 24 кв.м, 6,1 кв.м, 5 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	307 130	30 713
2.	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 25,2 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	220 500	22 050
3.	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 26,9 кв.м, 8,7 кв.м, 11,1 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания усл

МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ДЭПАРТАМЕНТ АХОВЫ

АХОВА

ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 7 (23)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

„НАМ ВЕЛЬМІ ВАЖНА СФАРМІРАВАЦЬ У БУДУЧЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ВЕДЫ І НАВЫКІ, НЕАБХОДНЫЯ ІМ ДЛЯ ВЫКАНАННЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫХ АБАВЯЗКАЎ"

„НАША АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА — ДАПАМАГЧЫ ЛЮДЗЯМ ЗРАБІЦЬ ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР, А ТАМУ, ХТО ВЫБРАЎ ТАКІ НЯЛЁГКІ ШЛЯХ — З ГОДНАСЦЮ НЕСЦІ ГАНАРОВАЕ ЗВАННЕ СУПРАЦОЎНІКА ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ."

«Галоўнае — ніколі не заставацца абыякавым»

Час прад'яўляе асаблівыя патрабаванні да супрацоўніка міліцыі. Каб стаць прафесіяналам, недастаткова быць спецыялістам у адной галіне. Да традыцыйных якасцяў — такіх, як адказнасць, стрыманасць і мужнасць — дадаюцца гібкае мысленне, высокая эрудыцыя і дакладная маральная пазіцыя. Усімі гэтымі якасцямі валодае маёр міліцыі Сяргей Пятровіч Каралёў — начальнік аддзялення ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў аддзела ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

Сяргей Каралёў нарадзіўся ў сям'і служачых. У 1998 годзе скончыў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А.А. Куляшова. У органы ўнутраных спраў прыйшоў дванаццаць гадоў таму. Спачатку працаваў міліцыянерам роты міліцыі Ленінскага (г. Магілёва) аддзела аховы і, падымаючыся па кар'ернай лесвіцы, ад камандзіра аддзялення, пасля даслужыўся да камандзіра батальёна. Сяргея Каралёва заўсёды вылучала тое, што ён ніколі не мог уседзець на месцы і спыніцца ў дасягненні мэты.

— У дзяцінстве я захапляўся ўсходнімі адзінаборствамі, плаваннем і падводным арыентаваннем. Усё гэта спрыяла фарміраванню арганізатарскіх здольнасцяў і дысцыплінаванасці, а працавітасць мне прывілі бацькі, якім я бязмежна ўдзячны!

Менавіта ўпартасць і мэтанакіраванасць дапамаглі Сяргею з раённага аддзела перайсці ў абласное ўпраўленне аховы. У 2003 годзе яго прызначылі на пасаду старшага інспектара штаба, а ўжо ў кастрычніку 2004 ён стаў начальнікам аддзялення ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў Магілёўскага абласнога ўпраўлення аховы.

Пра сваю прафесію маёр Каралёў можа гаварыць вельмі доўга, бо за гэтыя гады ён назапашваў і прымнажаў атрыманы досвед. Арганізатарскія здольнасці, праца з асабовым складам, прынясце валявых рашэнняў, а галоўнае — бачанне перспектыў развіцця кадравага забеспячэння службовай дзейнасці — сапраўды даказваюць, што гэты чалавек — майстар сваёй справы. За час службы Сяргей Пятровіч неаднаразова заахвочваўся прызамі Дэпартамента аховы, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і іншых міністэрстваў і ведамстваў. А літаральна напярэдадні юбілейнай даты — «90-годдзя кадравай службы органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь», Загадам міністра ўнутраных спраў за эфектыўныя вынікі службовай дзейнасці Сяргей Каралёў быў узнагароджаны Ганаровай граматай МУС Рэспублікі Беларусь.

Праца прыцягвае мяне, перш за ўсё, пастаяннай навізной, пастаяннымі зносінамі з людзьмі, магчымасцю дапамагаць ім у розных жыццёвых сітуацыях, прымаць непасрэдны ўдзел у іх лёсах. А галоўнае — ніколі не заставацца абыякавым!

Законнасць. Гонар. Прафесіяналізм

Вось ужо 90 гадоў дэвіз «Законнасць. Гонар. Прафесіяналізм» спадарожнічае кадравай службе органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь. 1 ліпеня кадравікі падраздзяленняў МУС адзначылі гэтую юбілейную дату. За такую доўгую гісторыю гэтая служба зведала шэраг значных арганізацыйна-штатных змяненняў. А вось якія пераўтварэнні адбыліся ў структурным падраздзяленні МУС — Дэпартаменце аховы, раскажа начальнік упраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння, палкоўнік міліцыі Віталь КАЗЛОЎСКІ:

— У першую чаргу, хачу яшчэ раз павіншаваць усіх супрацоўнікаў кадравых апаратаў органаў унутраных спраў з 90-годдзем з дня ўтварэння службы. Гэта сур'ёзны часавы рубеж, на працягу якога прафесіяналізм супрацоўнікаў толькі ўдасканальваўся і мацнеў. Дзякуючы выключнай рабоце кадравікоў аўтарытэт і станоўчы імідж вартавых правапарадку аказваўся на належным узроўні.

Днём утварэння службы кадраў аховы з'яўляецца 20 лістапада 1973 года, калі загадам МУС СССР «Аб устанаўленні лімітаў колькасці і аб'яўленні штата апарату МУС БССР» у склад упраўлення пазаведамаснай аховы пры МУС БССР была ўведзена пасада старшага інспектара па кадрах. У 80-я гады важным арыенцірам у працэсе далейшай перабудовы работы з асабовым складам стала комплексная праграма «Кадры», якая прадугледжвала паляпшэнне работы з рэзервам кадраў, павышэння прафесійнага майстэрства, паляпшэння абучэння супрацоўнікаў, умацавання дысцыпліны і законнасці, дасягнення большай стабільнасці калектываў. У гэты перыяд арганізацыйна-штатны аддзел узначальваў Валерый Іванавіч Маруга.

У чэрвені 1989 года адбыліся змены, і аддзел быў рэарганізаваны ў аддзел арганізацыйнай, кадравай і штатнай работы. Праз два гады зноў пераўтварэнне — аддзел па рабоце з асабовым складам аб'яднання «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь. У далейшым аддзел кадраў быў утвораны ў складзе апарату аб'яднання, у выніку чаго было створана ўпраўленне кадраў, якое ўзначаліў Уладзімір Дзмітрыевіч Несцераў.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 2004 года № 268 «Аб некаторых пытаннях органаў і падраздзяленняў унутраных спраў» зацверджана Палажэнне аб Дэпартаменце аховы МУС Рэспублікі Беларусь, згодна з якім аб'яднанне «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь было перайменавана ў Дэпартамент аховы. Спачатку ўпраўленне кадраў Дэпартамент аховы ўзначальваў Сяргей Яўгенавіч Макарэвіч, затым ... года — палкоўнікі міліцыі Аляксандр Мікалаевіч Пушноў, а з 2009 і па сёння ўпраўленне ўзначальваю я.

— Віталь Іосіфавіч, якія структурныя змены адбыліся пад вашым кіраўніцтвам?

— Па-першае, упраўленне кадраў было перайменавана ва ўпраўленне ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння. Па-другое, застаўся аддзел камплектавання, група арганізацыйна-штатнай работы, а аддзел ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў быў ліквідаваны — на яго базе створаны два падраздзяленні: аддзел ідэалагічнай работы і аддзяленне падрыхтоўкі кадраў.

— Якія асноўныя задачы ўпраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння?

— Вядома ж, у першую чаргу, правядзенне дзяржаўнай кадравай палітыкі, накіраванай на камплектаванне падраздзяленняў аховы высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Мы стараемся дакладна распрацаваць стратэгію і тактыку ўпраўлення кадрамі, вызначыць найбольш аптымальную колькасць асабовага складу і арганізацыйнай структуры апарату Дэпартамента аховы і яго структурных падраздзяленняў. Мае падначаленыя імкнуцца прыкласці максімум намаганняў на рэалізацыю мерапрыемстваў па ўдасканальванні ўстойлівага і эфектыўнага функцыянавання сістэмы адбору кадраў для якаснага камплектавання падраздзяленняў аховы, паляпшэння работы з рэзервам кадраў для фарміравання стабільнай прафесійнай базы.

— Віталь Іосіфавіч, як ідуць справы з камплектаваннем асабовага складу Дэпартамента аховы?

— Як я ўжо гаварыў, мы ўдзяляем пільную ўвагу падбору кандыдатаў на службу. Бо стан дысцыпліны і законнасці ў падраздзяленнях, стан маральна-псіхалагічнага клімату ў кожным калектыве напрамую залежыць ад «навічкоў». Для выканання патрабаванняў кіраўніка дзяржавы і кіраўніцтва МУС Рэспублікі Беларусь па ўдасканальванні дзейнасці органаў унутраных спраў, старанным вывучэнні і падборы кандыдатаў на службу, мы пастаянна ажыццяўляем працаёмкі адбор, каб якасна ўкамплектаваць і абучыць асабовы склад. У нашай ведамаснай установе адукацыі — Вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы — праводзіцца першапачатковая падрыхтоўка для назначэння на пасады міліцыянераў і міліцыянераў-кінолагаў падраздзяленняў аховы.

— Скажыце, калі ласка, якія крытэрыі адбору прэтэндэнтаў на службу ў падраздзяленні аховы?

— Натуральна, мы аддаём перавагу маладым людзям, якія прайшлі службу ў арміі. У сувязі з гэтым нашы супрацоўнікі праводзяць мэтанакіраваныя агітацыйна-растлумачальныя мерапрыемствы ў вайсковых часцях Узброеных Сіл, унутраных войсках МУС, установах адукацыі. Ажыццяўляюць цеснае ўзаемадзеянне з раённымі ваеннымі камісарыятамі па пытанні адбору і накіравання на службу ў органы ўнутраных спраў асоб, звольненых з абавязковай ваеннай службы ў запас. Актыўна прыцягваюць ахвотнікаў пры дапамозе мас-медыя і тэрытарыяльных службаў занятасці. Сёлета за першае паўгоддзе мы прынялі на службу 340 чалавек. Але важна ўлічыць адзін момант: па сваіх асабістых якасцях не кожны чалавек прыгодны для службы ў органах унутраных спраў. Каб не дапусціць у міліцэйскія шэрагі непадрыхтаваных асоб, нашы псіхолагі праводзяць узмоцненую работу, размаўляючы з кандыдатамі і тэстуючы іх. Кожны чалавек індывідуальны, і гэта не значыць, што мы стараемся максімальна зрабіць больш жорсткім адбор прэтэндэнтаў, не. Наша асноўная задача — дапамагчы людзям зрабіць правільны выбар, а таму, хто выбраў такі нялёгкі шлях — з годнасцю несці ганаровае званне супрацоўніка органаў унутраных спраў.

— Віталь Іосіфавіч, як бы вы ацанілі эфектыўнасць працы даверанага вам упраўлення?

— Правядзенне эфектыўнай кадравай палітыкі дазволіла стварыць у службе аховы базіс з прафесійна падрыхтаваных супрацоўнікаў, якія паспяхова вырашаюць пастаўленыя задачы. А пра астатняе можна меркаваць толькі зыходзячы з агульнай ацэнкі мабільнага структурнага падраздзялення Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь — Дэпартамента аховы.

На фота (злева направа): лейтэнант міліцыі А. Рылёў, прапаршчык міліцыі Ю. Налівайка, ст. сяржант міліцыі Д. Янковіч, ст. сяржант міліцыі В. Кісялевіч, сяржант міліцыі І. Клуйшо.

Рызыкуючы жыццём, не забываючы пра абавязак

Каля паўночы па радыёсувязі дзяжурны Смаргонскага РАУС перадаў інфармацыю пра пажар у інтэрнаце, размешчаным на вул. В. Сінкевіч, 7 у горадзе Смаргоні. Для аказання дапамогі ў эвакуацыі людзей на месца неадкладна выехалі два экіпажы Дэпартамента аховы, якія знаходзіліся на бліжэйшых маршрутах патрулявання. У складзе першай групы затрымання былі старшы інспектар групы міліцэйскай, ваенізаванай і вартавой аховы, лейтэнант міліцыі Аляксей Рылёў, міліцыянер-вадзіцель, старшы сяржант міліцыі Дзмітрый Янковіч і міліцыянер-кінолаг, старшы сяржант міліцыі Віктар Кісялевіч. Прыбыўшы на месца здарэння да інтэрната ААТ «Смаргоньсілікатабетон», хлопцы ўбачылі дым, які выходзіў з вокнаў пятага паверха, і, не раздумваючы, кінуліся на дапамогу людзям.

Практычна ў гэты ж час, да ахопленага полымем пяцімавярховіка падаспела яшчэ адна група затрымання ў складзе міліцыянера-вадзіцеля прапаршчыка міліцыі Юрыя Налівайкі і сяржанта міліцыі Івана Клуйшо. Ацаніўшы абстаноўку, ахоўнікі адразу ж пачалі аказваць дапамогу супрацоўнікам МНС: раскручвалі пажарныя рукавы, кантралявалі выхад людзей на вуліцу, не дапускаючы пры гэтым панікі і збірання вялікай колькасці людзей у холе і на лесвічным маршы інтэрната.

Рызыкуючы сваім жыццём, з пакояў пятага паверха, якія палалі, лейтэнант міліцыі Аляксей Рылёў і сяржант міліцыі Іван Клуйшо вынеслі на вуліцу дваіх непаўналетніх дзяцей і вывелі жанчыну. Старшыя сяржанты міліцыі Дзмітрый Янковіч і Віктар Кісялевіч, а таксама прапаршчык міліцыі Юрый Налівайка накіроўвалі людзей да выхаду.

Пасля завяршэння эвакуацыі ўсе жыхары інтэрната засталіся жывымі. Абставіны ўзнікнення пажару высвятляюцца.

КАДРАВЫ «РУХАВІК» БРЭСЦКАЙ АХОВЫ

Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так асновай любой арганізацыі з'яўляецца аддзел кадраў. Менавіта ад гэтых людзей залежыць падбор кандыдатаў на службу. І калі на адным месцы праца супрацоўніка менш эфектыўная, то на іншым — найбольш поўна раскрываюцца яго здольнасці, і менавіта гэту акалічнасць павінен разгледзець у будучым прэтэндэнце работнік кадравай службы.

Кадравым «рухавіком» Брэсцкага абласнога ўпраўлення аховы з'яўляецца аддзел ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння. А вось пра чалавека, які штодзень займаецца гэтай дзейнасцю, хочацца расказаць больш падрабязна.

На працу ў Кобрынскі аддзел аховы Вольга Кіпчанка прыйшла, працягваючы міліцэйскую дынастыю. Яе бацька праслужыў у органах унутраных спраў 25 гадоў і стаў яркім прыкладам для дачкі. Пасля праходжання першапачатковай падрыхтоўкі ў Вучэбным цэнтры МУС Оля стала афіцэрам міліцыі. У гэтай дзяўчыны было так шмат нерастрачанай энергіі і крэатыўных ідэй, што кіраўніцтва Брэсцкага аблупраўлення адразу ж заўважыла яе. Працавітая і спагадлівая Оля стала інспектарам, а праз тры месяцы — старшым інспектарам аддзялення ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў (а цяпер аддзела ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння) Брэсцкага абласнога ўпраўлення аховы. Паводле слоў калег, Оля — своеасаблівая крыніца пазітыўнай энергіі, генератар розных ідэй, — некаторыя з іх часам, здаецца, увогуле нельга ажыццявіць, хоць гэта і не так. Ды і выбраная ёю прафесія прадугледжвае пастаянную самаадукацыю, творчасць і наватарства. Як з усмешкай адзначае сама Вольга: «Хоць праца і патрабуе пастаяннай затраты вялікай колькасці энергіі — гэта не параўнаць з тым, якую аддачу я атрымліваю пасля ўдала выкананай справы».

РАБОТНІК КАДРАЎ — ГЭТА ПРЫЗВАННЕ

Ігар Гарбатка нарадзіўся ў горадзе Магілёве. Закончыўшы школу ў 1989 годзе, свой лёс звязаў з ваеннай службай, паступіўшы ў Тальяцінскае вышэйшае ваеннае будаўнічае камандное вучылішча. Пасля яго заканчэння праходзіў службу ва Узброеных Сілах на розных пасадах камандна складу. На службу ў органы ўнутраных спраў прыйшоў у 1995 годзе і па сёння верны сваёй прафесіі.

За 16 гадоў службы Ігар Фёдаравіч прайшоў доўгі шлях ад інспектара службы кадраў да начальніка службы камплектавання аддзела. Сёння ён з'яўляецца намеснікам начальніка аддзела ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння Мінскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы. Маючы за плячыма вялікі практычны досвед работы і пастаянна павышаючы свае тэарэтычныя веды, Ігар Гарбатка прафесійна будуе работу даверанага яму аддзялення камплектавання, разам са сваімі падначаленымі ён заўсёды дабіваецца станоўчых вынікаў. У адборы кандыдатаў на службу Ігар Фёдаравіч праяўляе прынцыповасць — да кожнага чалавека знаходзіць індывідуальны падыход і ўсе гутаркі праводзіць асабіста. Калектыў аддзялення камплектавання вельмі ўдзячны свайму начальніку за тое, што ён пастаянна ўмацоўвае і падтрымлівае іх здаровы інтарэс да сваёй справы, дзеліцца вялікім досведам у кадравай рабоце і ніколі не адмаўляе ў дапамозе. Пра Ігара Фёдаравіча сапраўды можна сказаць, што кадравая служба — гэта яго прызванне.

Юбілеі

СПОРТ — ПАМОЧНІК У СЛУЖБЕ!

У гэту нядзелю 70-гадовы юбілей адзначыў Міхаіл Пятровіч ГРАМЫКА, які і зараз працуе загадчыкам гаспадаркі Цэнтра прафесійнай падрыхтоўкі і службова-прыкладных відаў спорту Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

Міхаіл Грамыка нарадзіўся 24 ліпеня 1941 года ў вёсцы Сяменчыцы Стаўбцоўскага раёна ў звычайнай вясковай сям'і. Бацька загінуў на вайне, і маленькаму Мішу давялося рана пасталець — адзіны мужчына ў сям'і павінен быў паклапаціцца пра маці і сястрычку. Але бяда не прыходзіць адна, у хуткім часе малодшая сястрычка памерла...

Пасля заканчэння школы Міхаіл адправіўся ў Латвію ў горад Скрунда, дзе асвоіў прафесію ўздымшчыка-зборшчыка (гэта прафесія па здабычы жывіцы — смалы), адначасова ён вучыўся ў вячэрняй школе працоўнай моладзі.

У 1961 годзе Міхаіл быў прызваны ў рады Узброеных Сіл СССР. Ваенная служба радавога Грамыкі пачалася ў ракетных войсках стратэгічнага прызначэння ў Свярдлоўску, а пасля — у заходняй Сібіры. Менавіта войска стала стартавай пляцоўкай для развіцця Міхаіла як спартсмена. Узмоцненыя заняткі спортам (цяжкая і лёгкая атлетыка, лыжы), выступленні на першынствах часці, дывізіі, а пасля і Уральскай ваеннай акругі вельмі хутка прывялі да прызавых месцаў і гучных перамог на спаборніцтвах.

Дэмабілізаваўшыся праз два гады, па путёўцы Стаўбцоўскага райкама камсамола ён быў накіраваны ў органы ўнутраных спраў г. Мінска радавым міліцыянерам спецыяльнага ведамаснага палка міліцыі па ахове партыйных і савецкіх органаў. За сем гадоў службы ў гэтым падраздзяленні Міхаіл даслужыўся да старшага сяржанта. А спартыўныя дасягненні былі яшчэ вышэй: у 1969 годзе ў першай міліцэйскай эстафеце ў складзе каманды яму ўдалося заняць першае месца.

На працягу ўсяго тэрміну службы ў патрульна-паставой службе і канвойным батальёне каманда спартсменаў пад кіраўніцтвам Міхаіла Грамыкі на спаборніцтвах па службова-прыкладных відах спорту гарадскога і рэспубліканскага маштабу заўсёды займала першыя месцы.

Захапленне спортам не дало магчымасці скончыць Магілёўскую школу міліцыі і стаць афіцэрам. Але ўпартасць, мэтанакіраванасць і любімая справа ўсяго жыцця сталі асноўнымі момантамі ў пакарэнні найвышэйшых спартыўных вышынь, і заслужаны пераможны п'едэстал скарыўся: у 1975 годзе Міхаіл стаў чэмпіёнам СССР па службовым пяцібор'і, у якое ўваходзіла хуткаснае манеўраванне на матацыкле, паласа перашкод, плаванне, стральба з пісталета Макарава, крос 10 км з арыентаваннем на перасечанай мясцовасці. На працягу 3 гадзін ён змагаўся за сваю перамогу, ногі зводзіла сутарга, але воля і вера аказаліся мацнейшымі.

У 1980 годзе, у Таліне, Міхаіл Грамыка на Саюзных спаборніцтвах па мнагабор'і выканаў нарматыў майстра спорту СССР.

Сем гадоў ён адслужыў міліцыянерам Цэнтральнага РАУС сталіцы, а пасля быў камандзірам аддзялення патрульна-паставой службы. Наступныя 18 гадоў служба працягнулася ў канвойным батальёне ГУУС Мінгарвыканкама.

У 1995 годзе Міхаіл Пятровіч звольніўся з органаў унутраных спраў у званні прапаршчыка. За час службы, працуючы на грамадскіх пачатках, ён падрыхтаваў 15 майстроў спорту і 20 кандыдатаў у майстры спорту. Звольніўшыся, ён паўнацэнна заняўся трэнерскай дзейнасцю: судзіў розныя спаборніцтвы рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню.

Ужо дзесяць гадоў Міхаіл Пятровіч працуе ў ахове і кожны дзень няспынна працягвае паўтараць: «Спорт — памочнік у службе!»

Кіраўніцтва і ўвесь асабовы склад Дэпартамента аховы віншуюць юбіляра з 70-годдзем. Жадаем Вам, паважаны Міхаіл Пятровіч, моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, дабра, святочнага настрою, удачы, поспехаў, жыццёвых сіл і аптымізму!

«КУЗНЯ» БУДУЧЫХ КАДРАЎ АХОВЫ — ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ДЭПАРТАМЕНТА

Службовы шлях кожнага супрацоўніка падраздзяленняў аховы пачынаецца з праходжання першапачатковай падрыхтоўкі ў Вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы. А больш поўна і падрабязна пра сваю адукацыйную ўстанову нашым чытачам раскажа начальнік Вучэбнага цэнтра, палкоўнік міліцыі Віталь ДЗМІТРЫЕЎ:

— Вучэбнаму цэнтру Дэпартамента аховы вясной гэтага года споўнілася 18 гадоў — мы сталі паўналетнімі *(усміхаецца)*. На момант станаўлення і сталення мы сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцяў, якія змаглі пераадолець толькі дзякуючы эфектыўнай і працаёмкай рабоце, згуртаванаму калектыву аднадумцаў і адной вялікай сям'і — Дэпартаменту аховы.

Асноўным кірункам нашага цэнтра з'яўляецца вучэбная, метадычная і выхаваўчая работа з курсантамі. Нам вельмі важна сфарміраваць у будучых супрацоўнікаў органаў унутраных спраў спецыяльныя веды і навыкі, неабходныя ім для выканання функцыянальных абавязкаў, на аснове якіх будуць базіравацца іх далейшая адукацыя, самаадукацыя, павышэнне кваліфікацыі, г.зн. станаўленне спецыяліста — прафесіянала сваёй справы.

Мы праводзім першапачатковую падрыхтоўку для назначэння на пасады міліцыянераў і міліцыянераў-кінолагаў падраздзяленняў Дэпартамента аховы. Тэрмін навучання ў залежнасці ад адукацыі і наяўнасці службы ва Узброеных Сілах складае тры або шэсць месяцаў. Павышэнне кваліфікацыі інспектараў-дзяжурных АДС, камандзіраў страявых падраздзяленняў, інспектараў міліцэйскай, ваенізаванай і вартавой аховы, міліцыянераў груп затрымання, супрацоўнікаў падраздзяленняў па ахове ведамасных і банкаўскіх аб'ектаў праходзіць у тэрмін ад 5 да 14 дзён. Акрамя таго, за двухтыднёвы перыяд мы прыхтуем работнікаў ваенізаванай аховы. У сярэднім за адзін год падрыхтоўку праходзяць больш за 1200 курсантаў і слухачоў.

— Віталь Аляксеевіч, што адбываецца з прыбыўшымі курсантамі, як працякае працэс навучання і на што вы робіце асноўны ўпор у падрыхтоўцы менавіта супрацоўнікаў Дэпартамента аховы?

— Пасля прыбыцця ў Вучэбны цэнтр курсанты абавязкова здаюць нарматывы па агульнафізічнай падрыхтоўцы і пішуць дыктант. Аналіз вынікаў уваходнага кантролю дае ўяўленне аб узроўні кандыдатаў, дазваляе ўносіць карэктывы ў арганізацыю адукацыйнага працэсу. Пасля заканчэння навучання курсанты здаюць экзамены па профільных дысцыплінах: агнявой, фізічнай, юрыдычнай падрыхтоўцы; вярнуўшыся з вучэбнай практыкі — па тактыка-спецыяльнай падрыхтоўцы.

Адным з галоўных козыраў аховы лічыцца яе мабільнасць і аператыўнасць, таму пры падрыхтоўцы будучых ахоўнікаў асноўны ўпор мы робім на цыкл тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі. На практычных занятках курсанты замацоўваюць тэарэтычныя заняткі, адпрацоўваюць практычныя ўменні і навыкі пры хуткасці рэагавання на сігнал «Трывога», што паступіў з аб'екта, які ахоўваецца, ва ўмовах максімальна набліжаных да рэальных. На занятках выкарыстоўваюцца розныя метады навучання: рашэнне сітуацыйных задач, правядзенне групавых практыкаванняў, вучэнняў, дзелавых і сітуацыйных гульняў, часткова-пошукавы метад, метад праблемных сітуацый. Тактычныя дзеянні адпрацоўваюцца на вучэбных аб'ектах у поўнай экіпіроўцы. Асаблівая ўвага надаецца захаванню мер асабістай бяспекі пры аглядзе аб'ектаў, а таксама памяшканняў, якія знаходзяцца ўнутры аб'ектаў, затыманні правапарушальнікаў, абыходжанні са зброяй.

— Для падрыхтоўкі вартых кадраў патрэбны спецыялісты. Раскажыце, калі ласка, пра тых людзей, якія рыхтуюць будучых міліцыянераў.

— Так, сапраўды, дзякуючы эфектыўнай рабоце прафесійных супрацоўнікаў нашага цэнтра мы забяспечваем годнымі кадрамі падраздзяленні аховы. Калектыў Вучэбнага цэнтра — гэта аднадумцы, якія «хварэюць» за сваю справу, удасканальваюцца, спыняюцца на дасягнутым у працэсе якаснага навучання будучых міліцыянераў.

Прафіліруючым падраздзяленнем цэнтра з'яўляецца вучэбны аддзел, які ўзначальвае маёр міліцыі Андрэй Ілын. Адукацыйны працэс падрыхтоўкі спецыялістаў службы аховы ажыццяўляецца па чатырох цыклах, кожны з якіх уключае дысцыпліны, што даюць спецыяльныя веды рознага накірунку, а ў вучэбным аддзеле вызначаецца стратэгія, тактыка і кантроль адукацыйнага працэсу. Аддзел акцэнтуе ўвагу на правільным падборы і расстаноўцы выкладчыцкага складу, павышэнні яго кваліфікацыі, вызначае найбольш мэтазгодную методыку навучання.

— Акрамя вывучэння абавязковых службовых дысцыплін, якую работу ў вас праводзяць з будучымі міліцыянерамі?

— У мэтах ажыццяўлення прафесійнага выхавання, накіраванага на фарміраванне ў будучых міліцыянераў высокіх маральных якасцяў, неабходных для ўсвядомленага выканання службовага абавязку, захавання прававых нормаў і нормаў прафесійнай этыкі, у Вучэбным цэнтры арганізуюцца і праводзяцца ўрачыстыя рытуалы прыняцця Прысягі. Па добрай традыцыі, гэта мерапрыемства праходзіць у гістарычна значных і памятных месцах — гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна», Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гісторыка-дэманстрацыйным цэнтры Дэпартамента аховы, а таксама музеі гісторыі Міністэрства ўнутраных спраў.

Прафесія супрацоўніка АУС звязана з пастаяннай рызыкай і стрэсавымі сітуацыямі, таму для ліквідацыі праблем, якія ўзнікаюць, у складзе аддзела кадраў функцыянуе група псіхалагічнага суправаджэння. Нашы псіхолагі ў вучэбных узводах праводзяць трэнінгавыя заняткі. Падчас работы аказваецца дапамога ў фарміраванні ў курсантаў першаснага ўспрыняцця вучэбнай групы ў цэлым. Спецыялісты стараюцца стварыць спрыяльную атмасферу ў калектыве і дапамагаюць пераадолець псіхалагічны бар'ер у зносінах паміж курсантамі. На трэнінгах псіхолаг звяртае ўвагу і адзначае навучэнцаў, якія валодаюць лідарскімі, арганізатарскімі і камунікатыўнымі якасцямі, каб затым унесці прапановы курсавым афіцэрам пры падборы кандыдатур на пасады камандзіраў вучэбных узводаў.

Разам з навучаннем азам міліцэйскай службы курсанты маюць магчымасць набыць неабходныя навыкі кіравання аўтамабілем. Для ўсіх ахвотных у цэнтры ажыццяўляецца падрыхтоўка вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў катэгорыі «В». Вучэбныя аўдыторыі, абсталяваныя па апошнім слове тэхнікі, і аўтадром, які ёсць на тэрыторыі Вучэбнага цэнтра, дазваляюць рыхтаваць будучых вадзіцеляў на высокім узроўні.

— Віталь Аляксеевіч, акрамя навучання, чым займаюцца курсанты ў свой вольны час?

— У Вучэбным цэнтры ёсць аддзел ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння, які праводзіць канцэртныя праграмы з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці, экскурсіі, наведванне музеяў, памятных і гістарычных месцаў Беларусі, арганізуе агляды-конкурсы насценнага друку, спаборніцтвы па розных відах спорту. Каб захаваць службовыя традыцыі падраздзяленняў аховы, нашы ідэолагі стараюцца рэгулярна арганізоўваць сустрэчы моладзі з ветэранамі АУС.

— Акрамя супрацоўнікаў падраздзяленняў Дэпартамента аховы, хто яшчэ праходзіць навучанне на базе вашага цэнтра?

— У нашым цэнтры свае заняткі праводзіць спецыяльнае падраздзяленне па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», асобная спецыяльная рота міліцыі Дэпартамента аховы і іншыя падраздзяленні МУС.

— Віталь Аляксеевіч, зыходзячы з 18-гадовага вопыту, што ў першую чаргу ўплывае на станаўленне будучага супрацоўніка Дэпартамента аховы?

— Сёння мы з упэўненасцю можам сказаць, што менавіта першапачатковая падрыхтоўка ў Вучэбным цэнтры дае будучым міліцыянерам падраздзяленняў Дэпартамента аховы неабходную тэарэтычную базу і практычныя навыкі, закладвае аснову свядомасці будучага абаронцы правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, грамадства і дзяржавы.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі: У. ЗДАНОВІЧ, А. ЯРМАЛІНСКАЯ, Я. ТАЛАЙ, А. САЛЯНЮК, Д. ДОЎНАР, А. НОВІК, Д. ЖВАЛІК, Г. ЦЯРПІЛОЎСКАЯ.

Віцебскія прыступкі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

6 ТАБУ ДЛЯ ПРЫВАБНАЙ ЖАНЧЫНЫ

Салон прыгажосці

Як вядома, прызнаць прыгажунямі можна дзвюх зусім не падобных адна на адну жанчын. А ўсё таму, што прыгажосць залежыць ад многіх фактараў, і вельмі важна ведаць, як яе не сапсаваць. Калі вы хочаце заўсёды і ўсюды выглядаць прывабна, пастарайцеся пазбягаць наступных рэчаў.

Брудныя валасы. Яны, нават самыя шыкоўныя, у падобным стане валасы выглядаюць жудасна. І наўрад ці ў бліжэйшы час нам пагражае мода на нямытыя галовы, таму надавайце належную ўвагу падтрыманню чысціні. Прычым форс-мажорныя абставіны ў якасці апраўданняў не прымаюцца! У рэшце рэшт, сёння існуюць сухія шампуні, пры дапамозе якіх можна асвяжыць валасы за пяць хвілін нават у глухім лесе. Дастаткова размеркаваць спецыяльны парашок з цюбіка на паверхні галавы, а затым добра расчасаць валасы, выдаліўшы з іх шампунь разам з тлушчам і брудам.

Недагледжаныя бровы таксама да гэтага часу лічацца маветонам. На жаль, многія жанчыны забываюць пра своечасовую карэкцыю формы броваў, затое налягаюць на касметыку для вачэй. Варта заўважыць, што дагледжаныя, правільнай формы бровы, нават без прымянення макіяжу, могуць зрабіць позірк больш выразным! А яркі макіяж павек, наадварот, здольны прыцягнуць увагу да неакуратных броваў.

Непрыемны пах з рота «знішчае» прывабнасць любой жанчыны. Аднак, змагаючыся за свежае дыханне, не варта захапляцца жавальнымі гумкамі: вы ж не хочаце выклікаць асацыяцыі са жвачнымі жывёламі? Лепш выкарыстоўвайце іншыя сродкі, напрыклад, спецыяльныя аэразолі для асвяжэння дыхання, якія не толькі вельмі эфектыўныя, але і зручныя ў выкарыстанні. І звярніцеся да стаматолага: магчыма, непрыемны пах з рота азначае праблемы з зубамі, а хворыя зубы і прыгажосць несумяшчальныя ў прынцыпе.

«Запушчаны» манікюр. Пазногці заўсёды павінны быць дагледжанымі, незалежна ад таго, фарбуеце вы іх ці не. А калі фарбуеце, то не забывайце своечасова абнаўляць манікюр, асабліва ў выпадку выкарыстання яркіх лакаў. Манікюр павінен быць або ідэальным, або адсутнічаць у прынцыпе — іншага не дадзена.

«Калючыя» ногі. Вы што хочаце, каб мужчына замест гладкіх ножак раптам убачыў стойкую шчаціну? Сёння ж любая жанчына можа падабраць для сябе зручны від выдалення валасоў. Воск, электрычныя эпілятары, спецыяльныя крэмы, разнастайныя брытвенныя прыстасаванні — якое мноства сродкаў для догляду нашых ножак! А яны заўсёды павінны быць вартыя захаплення!

«Баявая размалёўка». Абсалютная большасць мужчын не разумее прычын выкарыстання яркай «размалёўкі». Ліловыя вусны, зялёныя павекі і малінавыя скулы нікога не пакінуць абыякавым: жах абыякавасцю лічыцца ніяк не можа. Акрамя таго, мужчыны не любяць «харчавацца» касметычнымі сродкамі, і калі яны бачаць расфарбаваную дамачку, то ў іх нават думкі не ўзнікае аб тым, каб пацалаваць гэты твар — з-за боязі атрымаць цяжкае харчовае атручэнне. Таму празмерна экстравагантны макіяж падыдзе толькі для балю-маскараду. Ва ўсіх астатніх выпадках — умеранасць, умеранасць і яшчэ раз умеранасць.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ПРУП «Минская фабрика цветной печати» 29 августа 2011 г. проводит конкурсные торги по реализации машин холодильных компрессорных одноступенчатых МКТ 220-2-0 б/у в количестве 3 единиц

Начальная цена — 30,4 млн рублей + НДС (20%).
Условия конкурса: демонтаж оборудования производит за свой счет победитель конкурса, подписавший договор купли-продажи.
Условия покупки: покупка всех 3-х единиц оборудования одним победителем конкурса.
Нахождение предметов торгов и место проведения: г. Минск, ул. Корженевского, 20.
Окончательный срок приема заявлений на участие в конкурсе 22.08.2011 г. по т/ф. 278 08 20, 278 21 20.
Окончательный срок сдачи предложений на покупку 29.08.2011 г. в 14.00 в каб. № 301.
Срок возможного отказа от участия в конкурсе 26.08.2011 г.
Срок подписания договора купли-продажи не позднее 02.09.2011 г.
УНП 100061706

Утерянный бланк строгой отчетности 1СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КВ № 1996539 в количестве 1 шт. Представительства Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным**. УНН 600013344

Утерянный представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району г. Минска **бланк страхового полиса** по добровольному стахованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 0671717 **считать недействительным**. УНП 101883943

Карысна ведаць

ХВАРОБА: ты пазнаеш яе па паху

Абмен рэчываў у чалавечым арганізме сфарміраваны дзіўна! У норме ніякіх непрыемных пахаў няма, але пры тых або іншых захворваннях яны ўзнікаюць. І захворванні гэтыя могуць быць самымі рознымі.

У першую чаргу віноўнікамі непрыемнага паху з рота могуць быць *стаматалагічныя захворванні*.

Яшчэ адна з даволі распаўсюджаных прычын непрыемнага паху — *захворванні дыхальнай сістэмы*. Запаленчыя працэсы ў носе (рыніты, сінуситы), запалёныя міндаліны, бранхіты, а таксама актыўная форма туберкулёзу, абсцэс і злаякасныя новаўтварэнні лёгкіх суправаджаюцца разбурэннем тканак. З-за гэтага паветра, што выдыхаецца, будзе з непрыемным пахам гною.

Крыніцай паху можа стаць і *страўнікава-кішачны тракт*. Пры гастрытах і язвавай хваробе страўніка, а таксама пры захворваннях падстраўнікавай залозы і жоўцевых шляхоў парушаецца ператраўліванне ежы і прасоўванне яе па СКТ. А дрэнна ператраўленая ежа, ды яшчэ калі застаялася, зусім не араматызуе дыханне. Пры гэтым часта чалавека непакоюць яшчэ і абкладзены налётам язык і кіслы або горкі прысмак у роце.

Спецыфічны пах з рота пры некаторых хранічных захворваннях можа сведчыць пра развіццё небяспечных ускладненняў. Так, характэрны гніласны пах *пры хваробах печані* азначае, што пячоначныя клеткі перасталі спраўляцца з абясшкоджваннем таксічных прадуктаў. Пах аміяку сігналізуе аб сур'ёзнай нырачнай недастатковасці, а пах ацэтону пры цукровым дыябеце — аб пагрозе дыябетычнай комы. Дарэчы, непрыемны пах з рота можа з'явіцца і ў прыхільнікаў строгіх дыет.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Градус

БЕЛАРУСЫ ЗЛОЎЖЫВАЮЦЬ І... ГУБЛЯЮЦЬ ІНТЭЛЕКТ

Сярэдні ўзровень інтэлекту дзяцей, бацькі якіх захапляюцца алкагольнымі напоямі, ніжэй, чым у тых, хто нараджаецца ў бацькоў непітушчых. Дарэчы, размова ідзе не толькі пра алкаголь моцнаградусны, але і пра такі «высакародны», як віно. Нездарма яшчэ шмат гадоў таму ў краінах, дзе віно п'юць нібы сок, з'явіўся тэрмін «вінаградныя дзеці». Нарадзіўся, зразумела, не таму, што немаўлят «знайшлі» ў вінаградніку... Як паведамляюць беларускія нарколагі, звесткі, якія збіраліся ў Савецкім Саюзе да 1965 года, сведчаць аб тым, што рост колькасці дзяцей з прыроджанымі парокамі знаходзіўся ў цеснай сувязі з ростам колькасці ўжытага насельніцтвам алкаголю.

— Неверагоднае глупства гаварыць аб тым, што для ратавання нацыі нам сёння неабходна пераключацца з ужывання моцнаградуснай на слабаалкагольную прадукцыю, скажам, віно або піва, — кажа **кіраўнік Цэнтра маніторынгу наркасітуацыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Сяргей ОСІПЧЫК**. — Так званы «міжземнаморскі» тып ужывання алкагольных напояў абсалютна не гарантуе адсутнасці шкоды, якую апошнія наносяць здароўю чалавека любога ўзросту і любой нацыянальнасці. Вядомы шэраг развітых краін, дзе празмернае захапленне півам і віном прывяло да з'яўлення вялікай колькасці «піўных» або «вінных» алкаголікаў.

Алкаголь, у аснове якога, як мы ведаем, этылавы спірт — гэта растваральнік арганічнага паходжання, а значыць, ён заўсёды прыводзіць да таксічнага атручэння, у большай ці меншай ступені. Такім чынам, важна не тое, наколькі высакародныя напоі будзе ўжываць нацыя, а тое, каб агульнае ўжыванне ў папуляцыі знізілася. Толькі так мы зможам знізіць і колькасць шкодных наступстваў, якія звязаны з ужываннем алкаголю.

Немагчыма дасягнуць таго, каб у такой краіне, як наша, наогул забыліся на алкаголь. Не назіраецца гэтага, скажам, і ў Швецыі, дзе дастаткова вялікая колькасць насельніцтва пакутуе ад алкагольнай залежнасці. Аднак у гэтай краіне не гінуць у дарожна-транспартных здарэннях з прычыны п'янства. Гэта праява эфектыўнасці адпаведных дзяржаўных мер... Нам жа пакуль не ўдаецца вырашыць нават пытанне зацікаўленасці хворага на алкагалізм у поспеху лячэння. Кожны трэці алкаголік ухіляецца ад лячэння любымі спосабамі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

БЫТАВЫ ТРАЎМАТЫЗМ І КЛЯШЧЫ

Такім чынам акрэсліваюць актуальную сітуацыю ў Магілёўскім траўматалагічным пункце.

У мінулы панядзелак у траўмапункт, якія абслугоўвае Магілёў і Магілёўскі раён, звярнуліся каля 140 пацыентаў. Гэта больш, чым нават падчас зімовага галалёду. Напярэдадні было 110 і 120 пацыентаў за суткі: таксама больш, чым звычайна.

Медыкі адзначаюць, што людзі атрымліваюць раны, характэрныя для сезона працы на прысядзібных участках і рамонту кватэр і дамоў. Парушэнне тэхнікі бяспекі і ўжыванне алкагольных напояў становяцца прычынамі траўмаў.

Таксама павялічылася колькасць выпадкаў укусаў кляшчоў. Штодзень з гэтай праблемай у Магілёўскі траўмапункт звяртаюцца каля трох дзясяткаў пацыентаў.

Ілона ІВАНОВА.

Віктар ГАНЧАРЭНКА: Футбол

«МЫ ЗАСМУЧАНЫ ВЫНІКАМ»

Барысаўскі БАТЭ ўнічыю завяршыў першы матч 3-га адборачнага раўнда Лігі чэмпіёнаў у гасцях супраць «Экранаса» з Панявежыса — 0:0.

Чэмпіён Беларусі меў перавагу ў матчы, асабліва ў другім тайме, нягледзячы на тое, што гуляў на чужым полі, але галявых дывідэндаў з яе выціснуць не змог. Не дапамагло і выдаленне гульца гаспадароў на 58-й хвіліне за грубы фол супраць Няхайчыка — «Экранас» утрымаў нічыю.

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі, як піша fcbate.by, Віктар Ганчарэнка сказаў: «Мы засмучаны вынікам. Мне здаецца, што злы жарт згуляла з намі выдаленне ў стане «Экранаса». Аднекуль у камандзе з'явілася дадатковая нярвознасць.» Акрамя таго, галоўны трэнер барысаўчан заўважыў, што «некаторыя нашы гульцы заслужылі папрокі за тое, што не давялі да лагічнага канца ні адзін з момантаў, якія былі створаны. А іх было дастаткова, каб хоць бы адзін гол выціснуць». Аднак Віктар Ганчарэнка адзначыў, што напярадзе яшчэ адна гульня, хатняя, да якой каманда будзе рыхтавацца вельмі рупліва.

Вынікі астатніх матчаў аўторка: «Зестафоні» (Грузія) — «Штурм» (Аўстрыя) — 1:1, АПОЭЛ (Кіпр) — «Слован» (Славакія) — 0:0, «Літэкс» (Балгарыя) — «Вісла» (Польшча) — 1:2, «Дынама» (Украіна) — «Рубін» (Расія) — 0:2, «Твентэ» (Нідэрланды) — «Васлуй» (Румынія) — 2:0, «Рэйнджэрс» (Шатландыя) — «Мальме» (Швецыя) — 0:1, «Генк» (Бельгія) — «Партызан» (Сербія) — 2:1.

І ЗНОЎ «РЭАЛ» VS «БАРСА»

Хаві, Ліянэль Месі і Крыштыяну Раналду сталі намінантамі на прыз лепшаму гульцу Еўропы сезона-2010/11 па версіі УЕФА.

За званне лепшага футбаліста Еўропы сезона-2010/11 пазмагаюцца паўабаронца «Барселоны» Хаві, яго аднаклубнік нападаючы Ліянэль Месі, а таксама атакуючы хаўбек «Рэала» Крыштыяну Раналду. Трое кандыдатаў на прэстыжны трафей вызначыліся па выніках галасавання членаў журы, складзенага з 53 спартыўных журналістаў, а пераможца будзе абвешчаны 25 жніўня падчас лёсавання групавога этапу Лігі чэмпіёнаў. Прыз лепшаму гульцу Еўропы быў заснаваны УЕФА ў супрацоўніцтве з асацыяцыяй еўрапейскіх спартыўных выданняў (ESM) на мінулым тыдні па ініцыятыве прэзідэнта арганізацыі Мішэля Плаціні. Узнагарода прыйшла на змену «Залатому мячу», які ўручаўся пераможцам апытання аўтарытэтнага французскага часопіса France Football з 1956 па 2009 год. Падчас чэмпіянату свету ў ПАР было прынята рашэнне заснаваць новы прыз «Залаты мяч FIFA», першым уладальнікам якога летась стаў Месі.

Іван КУПАРВАС.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 28 (407)

Гарачая пара на цыбульнай градцы

Здаўна цыбулю лічаць сродкам ад многіх хвароб: яна і сілы падмацоўвае, і энергію абуджае, і ад прастуды ратуе. Такім сродкам варта запасціся на зіму: надыходзіць тэрмін уборкі цыбулі. Рэзкая перамена надвор'я — удзень гарача, а ўначы холадна — прыводзіць да распаўсюджвання хвароб, таму не спазніцеся ўбраць з градкі такі каштоўны прадукт.

Як толькі пяро цыбуліны замест вертыкальнага прымае гарызантальнае становішча, значыць прыйшоў час разакучваць цыбулю. Калі ж глеба цяжкая, гліністая, моцна збілася ў камяк пасля шчодрых ападкаў, цыбуліны трэба злёгку прыўзняць віламі, каб карані перасталі расці. Убіраюць цыбулю пасля поўнага палягання пёраў. У канцы перыяду выспявання пажыўныя рэчывы з лістоў перамяшчаюцца ў цыбуліны, дзякуючы чаму павялічваюцца яе памеры. Цыбуліна, якая выспела, павінна быць цвёрдай, пакрыта сухой лускай, з мяккай шыйкай, сухімі лістамі і каранямі.

Цыбуліны падкопваюць, абтрэсваюць ад зямлі. Толькі ні ў якім разе не трэба стукаць адна аб адну, таму што яны дрэнна пераносяць нават самыя лёгкія механічныя пашкоджанні — зямлю з цыбулін трэба здымаць рукамі. Пры выбарцы цыбулін без падкопвання ў кожнай з іх траўміруецца донца, што ўплывае на лёжкасць. Выкапаную цыбулю раскладваюць радамі для прасушвання на 10—12 дзён на адкрытым сонечным месцы: цыбуліны ў адзін бок, лісты — у іншы. Расліны пераварочваюць, каб паскорыць працэс прасыхання цыбулін. Сонечныя прамяні таксама выконваюць сваю функцыю: яны забіваюць інфекцыю. У сырое надвор'е цыбулю даспельваюць пад паветкамі або ў памяшканні, якое добра праветрываецца. Выбраную цыбулю аберагайце ад замаразкаў: нават пры нязначным падмарожванні яна захоўваецца горш.

У час уборкі трэба адсартаваць цыбулю з тоўстымі шыйкамі. Цыбулю, якая не выспела як след, неабходна выкарыстаць у ежу ў першую чаргу. Пасля падсушвання ў цыбулін зразаюць лісты, пакідаючы шыйку даўжынёй 4—5 см. Калі пяро абрэзалі нізка (на ўзроўні з шыйкай цыбуліны), гэта можа нашкодзіць. Добра высушаная цыбуля шапаціць, калі яе пераварочваеш рукой. Сухія вонкавыя лускі надзейна засцерагаюць ад выпарэння вільгаці і даюць магчымасць захоўваць цыбулю ў сухім памяшканні. Аднак яе нельга і перасушваць, таму што пры гэтым сухія вонкавыя лускі трэскаюцца, аддзяляюцца. «Голая» цыбуля дрэнна захоўваецца.

Калі ж падчас уборкі цыбулі стаіць дажджлівае надвор'е і яе ўбіраюць з празмерна вільготнай зямлі, то пасля выкопвання цыбулю рэкамендуецца прамыць, пачысціць ад лускі, абрэзаць карані і раскласці для прасушвання ў сухім памяшканні, якое добра праветрываецца.

Для цыбулі, вырашчанай на вільготных грунтах, на моцна ўгнаеных і багатых на азот глебах, аднаго прасушвання недастаткова. Шыйкавай гніллю цыбуля заражаецца на градцы, але калі яна расце, гэта не праяўляецца. Каб засцерагчы цыбулю ад паражэння шыйкавай гніллю і лжывай мучністай расой, у час захоўвання спецыялісты раяць яшчэ раз прасушыць пры больш высокай тэмпературы, 32—33 градусы, на працягу 5 дзён. Пажадана таксама прыпудрыць цыбулю парашком мелу. Клапатліва дагледжаная, яна будзе захоўвацца доўга.

Не задавальняе ўраджай

«Сярод гарбузовых раслін, якія буяюць у агародзе, даволі часта сустракаюцца расліны з пустацветам. Чаму? Цыбулю на градках паразіў шкоднік. Якое выйсце?»
Аліна Іосіфаўна, *г. Смаргонь.*

Наконт першага пытання. Пустацвет бывае на пэўных гатунках. Менш за ўсё — сярод гібрыдных формаў, такое заключэнне спецыялістаў з Інстытута агародніцтва. Каб у наступным годзе не паўтарылася праблема, не брыце насення з раслін такога гатунку.

Наконт цыбулі. З вашага аповеду вынікае, што хутчэй за ўсё расліну паразіла нематода. Нематода сустракаецца пераважна на цяжкіх глебах, асабліва шкодная яна пры моцных ападках і высокай вільготнасці. На сухіх лугах яна не шкодная. Але, калі трапіла ў вільготнае асяроддзе, — тады ёй воля. Нематоды — ніткападобныя паўпразрыстыя чарвякі. Зімуюць у цыбулінах, рэштках лістоў і лускі. У неспрыяльных умовах захоўваюць жыццяздольнасць ад двух да пяці гадоў. Каб змагацца з гэтай немаччу, трэба захоўваць правільны севазварот і вяртаць пасадкі цыбульных культур на ранейшае месца праз 4—5 гадоў. Для аздараўлення глебы ўчастак рэкамендуецца вапнаваць, засяваць шматгадовымі травамі, для пасеву выкарыстоўваць толькі здаровы матэрыял. Паколькі паражэнне нематодай носіць ачаговы характар, пасля знішчэння пашкоджаных раслін глебу трэба апрацаваць карбаціёнам з разліку 200 мл га 1 кв. м.

Лепшым папярэднікам для цыбулі з'яўляюцца культуры, пад якія ўносілі вялікія дозы арганічных угнаенняў, — агуркі, ранняя і квацістая капуста, памідоры, рання бульба, аднагадовыя кармавыя культуры, гарох.

Сама ж рэпчатая цыбуля з'яўляецца добрым папярэднікам для ўсіх агародных культур.

Ратуем сад

Моцныя дажджы, на якія шчодрае гэта лета і асабліва ліпень, небяспечныя для пладаносных яблынь і груш.

Каб хоць неяк падправіць становішча, прыстольныя кругі пладовых дрэў восеньскіх і зімовых гатункаў, на якіх спее ўраджай, пасля ліўневых дажджоў трэба апырснуць слабым (0,5—0,7-працэнтным) растворам бардоскай вадкасці. Больш канцэнтраваны раствор можа выклікаць дадатковы шчодры лістапад і, як вынік, гібель дрэў у марозную зіму.

Што пасеяць пасля ранніх культур

Настае пара, калі ў агародзе адна за адной выслабаняюцца градкі. Што пасеяць на ўчастку пасля ўборкі ранніх культур? Лепш за ўсё гэта, вядома ж, сідэраты. Вельмі добра зарэкамендавала сябе **гарчыца**. Цвіце яна позна і даўжэй за іншыя культуры, прыцягваючы карысных насякомых да глыбокай восені. Калі пасеяць гарчыцу на ўчастку, дзе раней раслі раннія культуры, то вы ўзбагаціце глебу арганічнымі рэчывамі, фосфарам і серай. Акрамя таго, пасевы гарчыцы пасадзейнічаюць ачышчэнню глебы ад драцяніка. **Алейная рэдзька** падаўляе нематоду. Аднак гэтыя сідэраты не могуць быць папярэднікамі для капусты, радыскі, рэпы, рэдзькі.

Бабовыя культуры (бабы кармавыя, віка азімая або махнатая, гарох палявы, канюшына, лубін, люцэрна) — добрыя суседзі, імі можна запоўніць прастору ў радках агародных культур на бедных глебах. Дзякуючы азотафіксуючым матэрыялам яны ўзбагацяць зямлю вашага ўчастка азотам.

Збожжавыя культуры (авёс, азімае жыта) паляпшаюць водна-фізічныя ўласцівасці глебы, узбагачаюць яе арганічнымі рэчывамі, азотам, каліем. Грэчка вызначаецца хуткім ростам, таксама ўзбагачае глебу арганічнымі рэчывамі, фосфарам і каліем, рэкамендуецца для вырошчвання на цяжкіх глебах.

Фацэлія — непатрабавальная расліна. Яна накоплівае вялікую колькасць зялёнай масы, цудоўны меданос. Можа служыць папярэднікам любой агародняй культуры.

Стварэнне кулісы — увогуле карысна для агарода. Пад уздзеяннем кулісных раслін значна паляпшаецца склад глебы, якая становіцца мяккай і рыхлай. Расліны выглядаюць лепш, ды і шкоднікамі і хваробамі паражаюцца менш. Толькі нельга загушчаць пасадкі: паветра, дажджу, ветру і сонца — павінна быць дастаткова ўсім.

Залатая ягада, але не...

Мы прывыклі, што золатам адлівае ў нашым садзе абляпіха, а вось жаўтаплодная маліна для нас крыху навінка. Але яна прыцягвае ўвагу садаводаў-аматараў арыгінальнай афарбоўкай і прыемным своеасаблівым смакам.

Дзякуючы аптымальным суадносінам цукру і арганічных кіслот жаўтаплодная маліна значна саладзейшая за іншыя гатункі маліны — чым яна і прываблівае садаводаў. Да ўсяго, жоўтая маліна — каштоўны дыетычны прадукт, яе рэкамендуюць людзям з алергічнымі захворваннямі, цяжарным жанчынам, дзецям. Ягады змяшчаюць фоліевую кіслату (вітамін B_9), якая дапамае крыві свабодна цыркуляваць у сасудах і ўдзельнічае ў растварэнні дробных згусткаў (тромбаў), стымулюе і рэгулюе крывятварэнне. Але для віна яна непрыдатная, бо мае невялікую шчыльнасць. У параўнанні з іншымі гатункамі маліны, яна менш транспартабельная.

Буракі смачныя і прыгожыя: як гэтага дабіцца?

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 16 чэрвеня.)

Вельмі непрыемна бывае, калі караняплод вырастае з «барадой». Асноўная прычына такой з'явы — абрыў галоўнага кораня пры пікіроўцы. Каранёвая сістэма ў гэтым выпадку са стрыжнёвай ператвараецца ў мачкаватую. Прычым даведацца пра гэта можна толькі пры ўборцы караняплодаў. Пры нармальным доглядзе расліны з абарваным стрыжнёвым коранем даволі добра прыжываюцца, а караняплоды своечасова наліваюцца. У выпадку акуратнага працэсу перасадкі стрыжнёвы корань не абрываецца, а значыць, і бурак вырасце без барады.

І яшчэ пры высадцы расады ў раслін трэба абавязкова распраўляць карані, каб яны не загіналіся, — гэта таксама садзейнічае фарміраванню роўных і прыгожых караняплодаў. Сваю ролю адыгрывае і своечасовы паліў: пры нерэгулярным, але моцным паліве караняплоды растрэскваюцца.

Хочаце, каб у вас выраслі прыгожыя апетытныя сталовыя бурачкі, прыслухайцеся да парад людзей бывалых, і асаблівых праблем не будзе.

г. ВИТЕБСК **06.09.2011**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Неиспользуемая загородная база «Костовье», расположенная по адресу: Витебская область, Витебский район, Куринский с/с, в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, и право заключения договора аренды земельных участков	Характеристика объекта недвижимости: капитального строения с инвентарным номером 200/С-74187 (здание нежилое – сторожка), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, 1/1, одноэтажное бревенчатое, фундамент – железобетонные блоки, перекрытия – деревянные, крыша – металлочерепица, общей площадью 7,5 кв.м, 1999 года постройки; капитального строения с инвентарным номером 200/С-74190 (здание нежилое – баня с сараем и канализационным отстойником), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, 1/2, одноэтажное бревенчатое, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, общей площадью 13,0 кв.м, 1999 года постройки; капитального строения с инвентарным номером 200/С-74188 (здание специализированное для лечебно-профилактических санаторно-курортных целей – спальный корпус № 2 с пристройкой, беседкой, крыльцом, навесом и котельной), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, 1/3, одноэтажное бревенчатое и кирпичное, фундамент – железобетонные блоки, перекрытия – деревянные, крыша – металлическая, общей площадью 38,1 кв.м, 1999 года постройки; капитального строения с инвентарным номером 200/С-74285 (здание специализированное коммунального хозяйства – здание бани № 2 с пристройкой, летним душем, уборной, навесом и вольером), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, 2/1, одноэтажное бревенчатое внутри обшитое вагонкой, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, общей площадью 30,2 кв.м, 2006 года постройки; капитального строения с инвентарным номером № 200/С-74286 (здание жилое специального назначения – здание одноэтажное с отмосткой, подвалом, дымовой трубой, площадкой с лестницей под навесом, пешеходной частью (участок 1, участок 2), ограждением, двумя воротами, двумя калитками, площадкой для установки мусорных контейнеров и канализационным отстойником), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, 2, одноэтажное кирпичное, снаружи облицовано силикатным кирпичом, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, общей площадью 206,6 кв.м, 2001 года постройки; капитального строения с инвентарным номером 200/С-74186 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей – спальный корпус № 1 с мансардой, уборной, душем, вольером, пешеходной частью, двумя воротами, калиткой, крыльцом, ограждением (участок 1, участок 2)), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, 1, одноэтажное дощатое обшитое металлическим сайдингом, фундамент – железобетонные блоки, перекрытия – деревянные, крыша – металлочерепица, общей площадью 104,8 кв.м, 1999 года постройки; капитального строения с инвентарным номером 200/С-76305 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водозабор подземных вод с забором), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково; капитального строения с инвентарным номером 200/С-76312 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – противопожарный водоем с ограждением), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, площадью 300,0 кв.м; капитального строения с инвентарным номером 200/С-76313 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водоем), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, площадью 520,0 кв.м; капитального строения с инвентарным номером 200/С-76314 (сооружение специализированное коммунального хозяйства – водопроводная сеть), в 4-х км северо-западнее д. Кулаково, протяженностью 382,6 м. Земельные участки: с кадастровым номером 221283700010000012, площадь 0,2534 га для использования под базу отдыха, сроком аренды 20 лет. Ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов (озеро Костовье), 0,2534 га; земли, находящиеся в зонах санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения (охранная зона артезианской скважины), площадью 0,1186 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением свыше 1000В, площадью 0,0693 га; с кадастровым номером 221283700010000013, площадью 0,0626 га для использования под противопожарный водоем, сроком аренды 20 лет. Ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в зонах прибрежных полосах водоемов (озеро Костовье), площадь 0,0626 га; с кадастровым номером 221283700010000014, площадью 0,2772 га для расширения базы отдыха, сроком аренды 20 лет. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, площадью 0,2772 га.	**404758296**	**40475820**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ: Витебское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Витебскэнерго», телефон в Витебске (0212) 475299.

Аукцион состоится 6 сентября 2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, а также консолидированные участники – два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

1. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования**; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к заявлению прилагаются: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 05.09.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308.

2. **Заключительная регистрация участников 06.09.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642903027026**, Региональная дирекция № 200 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка, в сумме 3 миллиона рублей; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

ГАНДАЛЬ — ГЭТА СВАЙГО РОДУ МАСТАЦТВА.

Так сцвярджаюць у РДГУП «Металурггандаль»

ХОРАША! ВЫДАТНА!

Прызнацца, нам не так ужо часта даводзілася наведваць аб'екты рознічнай гандлёвай сеткі і грамадскага харчавання названага рэспубліканскага даччынага гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства. Але тое, што мы бачылі і чулі ў Жлобіне ад работнікаў флагмана айчыннай металургіі, якія разам з многімі жыхарамі горада і раёна з'яўляюцца традыцыйнымі пакупнікамі, прыемна ўражвае.

Вось, напрыклад, кавярня адкрытага тыпу «Утульнасць», якая размяшчаецца ў адміністрацыйна-бытавым комплексе сталедротавага цэха № 3 БМЗ. Гартаем кнігу скаргаў і прапаноў, і на кожнай старонцы яе — падзякі, падзякі і падзякі. За надзвычай добрыя адносіны да наведвальнікаў, шыкоўную кухню, культурнае абслугоўванне, уменне персаналу быць «прыгожымі душэўна». Такіх смачных страў, як тут, сцвярджаюць людзі, не знойдзеш ні ў адным прадпрыемстве грамадскага харчавання горада.

Гутарым з загадчыкам вытворчасці кавярні Галінай Пятроўнай Рудкоўскай, заслужаным работнікам гандлю Рэспублікі Беларусь, якая расказвае, што любімай справе яна аддала 35 гадоў жыцця. Ёй, лічыць, пашанцавала ў тым плане, што давялося адкрываць на заводзе пяць аб'ектаў грамадскага харчавання — сталовых і кавярняў. Таму, усміхаецца жанчына, і прарабская справа стала ёй па плячы.

Праходзім па памяшканні, якое пачало сваю работу ў 2008 годзе, і звяртаем увагу на сучаснае энергазберагальнае гандлёва-вытворчае і халадзільнае абсталяванне, прыгожую і зручную мэблю, іншы інвентар. Вытанчанае меню, якое прадстаўлена разнастайным асартыментам фірменных і новых страў, страў рускай і беларускай кухняў, утульны інтэр'ер агульнага і банкетнага залаў, сучасная музычная апаратура са святлоэфектамі ствараюць неабходныя ўмовы для камфортнага адпачынку.

— У нас праходзяць вясельныя і юбілейныя ўрачыстасці, — апавядае далей Галіна Пятроўна, мы прымаем заказы спажыўцоў на рыгатаванне страў у банкетным выкананні на дом.

Кавярня разлічана на 130 месцаў, а на першым паверсе знаходзіцца сталовая № 9, дзе якасць прыгатавання ежы такая ж, як і ў кавярні. Тут харчуюцца не толькі завадчане, але і многія гараджане. Дарэчы, кавярня «Утульнасць» адкрыла ў горадзе два свае летнія філіялы, якія эфектыўна гандлююць рознымі харчовымі таварамі — беляшамі, расцягаямі, блінцамі, маласольнымі агурочкамі і г. д. Цікавы момант: жыхары тых двух мікрараёнаў прасілі кіраўніцтва кавярні «Утульнасць», каб гэтыя летнія філіялы працягвалі гандаль і ў зімовы час.

Дырэктар рознічнай гандлёвай сеткі РДГУП «Металурггандаль» Аляксей ЗЯЗЁТКА.

У выніку другога этапу тут будзе арганізаваны кулінарны ўчастак і з'явіцца магазін будаўнічых матэрыялаў з разлікам на тое, што ў гэтым мікрараёне ідзе актыўнае будаўніцтва жылля і вывучаецца попыт на матэрыялы для яго аддзелкі.

— Я задаволена нашым калектывам, — гаворыць Вольга Адамаўна. — У ім многа моладзі. Усе стараюцца.

Што гэта так, мы ўпэўніліся, калі наведалі нядаўна адкрыты хлебабулачны ўчастак. Там працавалі маладыя кандытары чацвёртага разраду Святлана Цярэшчанка, Таццяна Новікава і Юлія Яроцкая. Яны рыхтавалі да выпечкі булачкі і кефірны хлеб. А ўсю працу арганізоўвала і кантралявала намеснік начальніка вытворчасці Алена Крычко.

Яна паведаміла, што на ўчастку самыя сучасныя печы, набытыя ў Германіі, якія даюць выдатную выпечку. Адной з галоўных задач калектыву, у якім 16 чалавек, з'яўляецца распрацоўка рэцэптур хлеба і хлебабулачных вырабаў, — сапраўдны клопат па арганізацыі здаровага харчавання. Таму выкарыстоўваюцца ў іх такія натуральныя дабаўкі, як аўсяныя шматкі, насенне сланечніка, ільну, гарбузоў, арэхі, кунжут, малатая кукуруза і г. д.

За адну змену выпускаецца тры — тры з паловай тысячы адзінак прадукцыі, у тым ліку і хлеба пшанічнага, жытнёва-пшанічнага і дыетычных гатункаў. Тэхналогія вытворчасці яго заснавана на выкарыстанні гатовых вадкіх закваскак. За май-чэрвень выраблена хлебабулачнай прадукцыі на 278 мільёнаў рублёў. Яна была рэалізавана ў асноўным у гандлёвай сеткі завода і грамадскім харчаванні.

Хлебабулачны ўчастак магазіна «Калі ласка» — Таццяна НОВІКАВА і Ігар ЯШЧУК, кандытары 4 разряду.

Першы этап рэканструкцыі закончыўся ў сёлетнім красавіку. Абноўлены знешні выгляд магазіна, значна пашырана гандлёвая плошча за кошт скарачэння падсобных і складскіх памяшканняў, што дало магчымасць больш рацыянальна выкарыстання плошчаў. Таксама зроблена прыбудова, у якой размясціўся ўчастак па выпечцы хлеба. З пачатку рэканструкцыі асвоена ўжо 2 482 мільёны рублёў.

...І ВА ЎНІВЕРСАМ «ДНЯПРОЎСКІ»

Яго калектыў складаецца з 57 чалавек, і ён заўсёды знаходзіцца на перадавых пазіцыях. Не будзем падрабязна расказваць аб асартыменце тавараў, але падкрэслім, што тут у чэрвені выручка склала 1 400 мільёнаў рублёў, а за ліпень яна павінна павялічыцца яшчэ на сто мільёнаў. У той дзень, калі мы былі на прадпрыемстве, графік апярэджваўся.

Ва ўніверсаме дзейнічае кандытарскі ўчастак, які пастаўляе ў магазіны «Металурггандлю» і сталовыя шырокі асартымент торцікаў, пірожных, булачак і іншыя дробнаштучныя кандытарскія тавары. Кваліфікацыя работнікаў высокая — 4-5 разрады. Палова кандытараў мае стаж работы 20 і больш гадоў. У чэрвені ўчастак вырабіў смакаты на 248 мільёнаў рублёў, у ліпені ён ідзе з плюсам.

ПРЫЕМНАГА АПЕТЫТУ!

— У склад аб'ектаў рознічнай гандлёвай сеткі РДГУП «Металурггандаль» — расказвае яго дырэктар Аляксей Зязётка, — уваходзяць сем магазінаў харчовых тавараў і адзін — прамысловых. У іх шырока прадстаўлены асартымент пакупных тавараў і прадукцыі ўласнай вытворчасці. Гэта — мясныя і рыбныя рулеты, руляды с птушкі, смажанкі, піцы, расцягаі, клёцкі, мясныя кулінарныя вырабы, торты, пірагі і да т. п.

Летась мы яшчэ больш пашырылі асартымент прадукцыі ўласнай вытворчасці. У продажы з'явіліся гароднінныя і мясныя салаты, квашаная капуста з журавінамі, марской капустай, салодкім перцам, салёнае сала з рознымі спецыямі і мясныя паўфабрыкаты, пельмені, варэнікі з тварагом і грыбамі, прыгатаваныя ўручную і па хатніх рэцэптах.

Уся наша кулінарная прадукцыя выгадна адрозніваецца ад прамысловай тым, што не ўтрымлівае дабавак і кансервантаў, а значыць, з'яўляецца натуральнай і карыснай для здароўя.

— А якія, Аляксей Мікалаевіч, зручнасці існуюць для пакупнікоў у вашай сістэме?

— Ва ўніверсаме «Маяк» летась быў падоўжаны рэжым работы і ўстаноўлена аўтаматызаваная сістэма разлікаў, што дазваляе не толькі хутка абслугоўваць людзей, але і прадастаўляць зніжкі ў памеры дзесяці працэнтаў практычна на ўвесь закуплены тавар з 7 да 8 і з 23 да 24 гадзін.

У летні перыяд арганізаваны гандаль дзесяці сезонных міні-кавярняў, што дазволіла жыхарам горада і яго гасцям наталіць смагу квасам, півам, марожаным на свежым паветры. Тут жа можна перакусіць, купіць кулінарную прадукцыю па дарозе дадому, на працу ці ў час прагулак.

— А ці практыкуеце вы зніжкі?

— А як жа? На працягу мінулага года ў прадуктовых магазінах РДГУПа быў прадстаўлены тавар са зніжкамі ад 10 да 20 працэнтаў. Сумесна з пастаўшчыкамі праведзена каля двухсот такіх акцый. Каля 20 акцый прайшло ў магазіне «Дом гандлю» са зніжкамі ад 15 да 30 працэнтаў на абутак расійскіх вытворцаў, гадзіннікі «Прамень», тэлевізары «Гарызонт», бытавую тэхніку «Віцязь». Працягваюцца яны на панчошна-трыкатажныя і трыкатажныя вырабы фірмы «Контэ Спа» (цэны ніжэй рынкавых на 27 працэнтаў), абутак «Марка» (на 30-40 тысяч танней, чым у фірменных секцыях).

— А як з афармленнем тавараў у крэдыт?

— Іх можна афарміць у тым жа магазіне «Дома гандлю» па ўсім асартыменце без аплаты працэнтаў з першапачатковым узносам 30 працэнтаў на тэрмін ад 3 да 12 месяцаў. Указаным відам крэдытавання скарысталіся 322 работнікі завода на 455 мільёнаў рублёў. Дарэчы, на гэтым гандлёвым аб'екце распрацавана такая сістэма зніжак. Пры пакупцы тавару за наяўны разлік на суму ад 400 тысяч рублёў да аднаго мільёна — зніжка складае 3 працэнты, вышэй мільёна — 5 працэнтаў. Пры разліку за пакупку

Кандытары 5 разраду кандытарскага ўчастка магазіна «Дняпроўскі» Людміла ПЯКУРЫНА і Святлана ШКЕДАВА.

харчаваннем на 92 месцы, адзін з якіх знаходзіцца ў заводскім інтэрнаце.

— Як працуюць сталовыя?

— Рэжым іх працы ўстаноўлены з улікам пажаданняў работнікаў БМЗ і забяспечвае магчымасць атрымання паўнавартаснага і якаснага харчавання кругласутачна. Тры сталовыя працуюць па беспарапынным графіку, а ва ўсіх дзевяці рабочыя могуць набыць малочныя і кандытарскія вырабы, сокі, паўфабрыкаты, фрукты і г. д.

Дарэчы, сталовыя працуюць па меню са свабодным выбарам страў і штодня прапаноўваюць не менш чым 15 найменняў халодных страў і закусак, 3-4 — супоў, 15 — гарачых страў. У кожнай з іх можна атрымліваць і дыетычнае харчаванне. Для сталовых і буфетаў выпякаецца пшанічны і жытнёвы хлеб, мучныя, кандытарскія і булачныя вырабы ўласнай вытворчасці.

— А ці могуць работнікі завода рабіць заказы прадуктаў на дом?

— Вядома ж, могуць. У сезон пасяўных і ўборачных работ нашы сталовыя рыхтуюць абеды для работнікаў даччынага сельгаспрадпрыемства «Папаратнае». Гарачае харчаванне наладжана і для працаўнікоў «Жлобінметалургбуда» і «Металургтранса».

— Як бачым, Аляксей Мікалаевіч, праца вашага калектыву накіравана на павышэнне якасці абслугоўвання, пашырэнне асартыменту тавараў і паслуг, зручнасці для наведвальнікаў.

І гэта сапраўды так. Ад нашай работы залежаць здароўе, настрой і прадукцыйнасць працы металургаў. У заключэнне скажу, што з пачатку года прадпрыемства выконвае ўсе параметры, прадугледжаныя бізнэс-планам. Тэмп росту рознічнага тавараабароту склаў за першае паўгоддзе 108,2 працэнта ў супастаўных цэнах да аналагічнага леташняга перыяду, а прадукцыйнасць працы — 107,1 працэнта. Чысты прыбытак склаў 303 мільёны рублёў.

І яшчэ. Ва ўсіх нашых добрых справах мы адчуваем велізарную дапамогу генеральнага дырэктара БМЗ Анатоля Мікалаевіча Савянка.

Адзін такі прыклад. Завод выдзеліў шэсць мільярдаў рублёў для будаўніцтва кавярні «Утульнасць». І такіх прыкладаў нямала.

У гэтую нядзелю наша прафесійнае свята — Дзень работнікаў гандлю. Я з вялікім задавальненнем віншую калектыў прадпрыемства з ім. Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту, упэўненасці ў заўтрашнім дні, сямейнага шчасця. Шчыры дзякуй усім за добрую працу.

УНН 490180974

Выказваем падзяку начальніку бюро грамадскага харчавання Наталлі Мельнікавай за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

Галіна РУДКОЎСКАЯ (злева), загадчыца вытворчасці кавярні «Утульнасць» і сталовай № 9, і Людміла ЗАХАРАНКА, афіцыянт 5 разраду кавярні «Утульнасць».

Гомельская вобласць, г. Жлобін, вул. Прамысловая, 37
тэл. 5-63-61, 5-61-38, факс 5-40-83
mtorg@mail.gomel.by

НАДВОР'Е на заўтра

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.16	21.15	15.59
Віцебск —	4.59	21.11	16.12
Магілёў —	5.06	21.06	16.00
Гомель —	5.10	20.55	15.45
Гродна —	5.32	21.30	15.58
Брэст —	5.40	21.23	15.43

Месяц

Маладзік 30 ліпеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Васіля, Уладзіміра.*

К. *Ады, Ірыны, Віктара, Інакенція, Назара, Уладзіміра.*

28 ліпеня

Дзень хрышчэння Кіеўскай Русі.

1586 год — англійскі астраном, матэматык, этнограф сэр Томпас Хэрыёт першым прывёз у Еўропу бульбу.

1942 год — пасля буйнога паражэння савецкіх войск пад Харкавам, напярэдадні баёў пад Сталінградам народны камісар абароны СССР Сталін падпісаў загад №227 «Ні кроку назад!». Загад узмацняў дысцыпліну ў Чырвонай Арміі, забараняў адыход войскаў без загаду кіраўніцтва, уводзіў штрафныя батальёны ў складзе франтоў і штрафныя роты ў складзе армій, а таксама загараджальныя атрады ў складзе армій.

«Сваіх мужоў заўсёды раўнуюць непрыгожыя жанчыны; прыгожым — не да таго: яны раўнуюць чужых».

Оскар Уайльд (1854—1900), англійскі пісьменнік.

АЛЕШЫНА

Шматлікія рэкі і азёры на землях усходніх славян і сёння пакрыты алешынай — куставой раслінай, якая расце ў нізкіх балотных месцах. Алешыну часцей за ўсё выкарыстоўвалі як дровы. Але каштоўнасць гэтага дрэва — у яго кары, якая дае прыгожы насычаны чырвоны колер, і таму алешыну нарыхтоўвалі для афарбоўкі тканіны.

- Сок і свежая драўніна алешыны пад уздзеяннем кіслароду маюць яркі чырвоны колер. Так нарадзілася паданне аб тым, што «на алешыне схаваўся чорт ад ваўка, якога сам і стварыў. Але воўк разарваў чорта і афарбаваў дрэва, на якім сядзеў чорт, яго ж крывёй».
- У народнай культуры алешыну звязвалі з «тым» светам і вельмі часта выкарыстоўвалі ў ахоўнай магіі.
- Галінкамі алешыны «запарвалі» гліняныя жбаны для малака, каб ніхто не мог сурочыць (пашкодзіць) карову.
- Невялікія кавалачкі кары алешыны клалі ў адзенне маладых як абярэг ад няшчасцяў і хвароб, якія могуць наслаць нядобразычліўцы на вяселлі.
- Галінкі алешыны ставілі па краях палеткаў і агародаў як абярэг ад граду і маланкі;
- Лічылася: калі купацца ў вадзе ручая ці ракі, абапал якіх расце алешына, — можна зняць з сябе шматлікія захворванні і сурокі.
- Лекары выкарыстоўвалі алешыну як вяжучы, загойваючы раны сродак, пры лячэнні грыжы і запаленні скуры.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗАРАБЛЯЮЦЬ І НА КАЦЯНЯТАХ

У Віцебскай вобласці, паводле інфармацыі абласной падатковай інспекцыі, толькі пяцьдзясят грамадзян афіцыйна прадаюць кацянят і шчанят ад кошак і сабак, якіх трымаюць дома. Таксама больш за дзесяць чалавек афіцыйна іграюць на музычных інструментах на вяселлях і юбілеях, тамадою усяго 25. Каля дваццаці чалавек займаюцца фатаграфаваннем.

Усяго з пачатку года грамадзяне, якія не павінны мець дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, заплацілі адзіны падатак на агульную суму 758 мільёнаў рублёў. Усяго такіх, якія самастойна зарабляюць, каля 3,4 тысячы чалавек. І большасць з іх (звыш 2,9 тысячы) рэалізуе тавары на рынках.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Усміхнемся

Дыета — гэта калі пайшла на кухню па яблычак, а раптам зжэрла катлету...

☺

Прафесар філалогіі на занятках:

— Прывядзіце прыклад пытання, каб адказ гучаў як адмова, і адначасова — як згода.

Студэнт:

— Гэта проста: «Гарэлку піць будзеце? — Ай, пакіньце!»

☺

Ёсць у жыцці справядлівасць! Учора на праспекце аўтамабіль, выйграны ў «Ваша лато», урэзаўся ў аўтамабіль, выйграны ў «Суперлато».

☺

Двое сяброў.

— Спрабаваў на адной руцэ адціскацца?

— Ага.

— Спіна не хрусцела?

— Не, нос балеў.

☺

Сын Аршавіна за пераход у другі клас запатрабаваў 5 мільёнаў еўра.

Перамогі

У дзейнасці аб'ектаў рознічнай гандлёвай сеткі і грамадскага харчавання «Металурггандлю» іх было нямала, і кіраўнікі прадпрыемства з гонарам пералічваюць іх.

- Па выніках работы за 2009 год сталовая № 8, удзельнічаючы ў рэспубліканскім конкурсе-аглядзе «За лепшае абслугоўванне грамадскага харчавання ў вытворчых прадпрыемствах» у намінацыі «Укараненне новых тэхналогій прыгатавання ежы і формаў абслугоўвання» прызнана пераможцам і ўзнагароджана дыпломам Міністэрства гандлю РБ і Ганаровай граматай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

***

- **У тым жа годзе калектыў сталовай № 2 стаў пераможцам раённага спаборніцтва сярод прадпрыемстваў грамадскага харчавання.**

***

- У 2009 годзе РДГУП «Металурггандаль» атрымала падзячнае пісьмо Міністэрства гандлю РБ за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні на базе аб'ектаў «Металурггандаль» пасяджэння Міжведамаснай камісіі па арганізацыі грамадскага харчавання ў Рэспубліцы Беларусь працаўнікоў сістэмы Міністэрства прамысловасці.

***

- **Па выніках работы за 2010 год пераможцам раённага спаборніцтва сярод прадпрыемстваў грамадскага харчавання стала кавярня «Утульнасць»**

***

- У красавіку 2011 года ў рэспубліканскім конкурсе кулінарнага мастацтва і сэрвісу першыя месцы ў катэгорыях «Арт-клас» і класах «Работа з шакаладу» і «Цукровыя кветкі» прысуджаны камандзе кандытараў участка ўніверсама «Дняпроўскі» (начальнік участка Ала Мяханікава). Трэцяе прызавое месца ў катэгорыі «Сэрвіс-клас» заняла афіцыянтка пятага разраду Наталля Жалтова з кавярні «Лагуна».

***

- **Калектыў РДГУП «Металурггандаль» узнагароджаны Ганаровымі граматамі Федэрацыі прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства гандлю за ўкараненне перадавога вопыту работы.**

ЯКІЯ ФОРМЫ!..

Імі можна проста захапляцца, а можна шукаць закладзены ў іх змест

Выстава

1

Таму што форма тут — сама па сабе сэнс працы мастакоў, якія працуюць з керамікай. І выставу ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва яны назвалі «Актуальная форма». А што ж у ёй актуальнага?

Што першаснае: форма альбо змест? Гэтае пытанне падобнае на самае вечнае: «Што было раней — яйка альбо курыца?» Таму што адно без другога не існуе ў мастацтве. І часам бывае так, што ў форме праяўляецца змест, а часам зместам творчасці можа быць менавіта сама форма — пошук нейкай новай, якую дагэтуль ніхто не ствараў. Без гэткіх разважанняў не абыдуцца тыя, хто будзе аглядаць выставу, на якой прадстаўлены творы Аляксандра Дзятлава, Леаніда Трацэўскага, Алеся Косткі, Кацярыны Шэінай, Ганны Апалайкі, Ганны Амбросавай. Мастакі розных пакаленняў, але ўсе яны аб'яднаны жаданнем выказацца праз кераміку, і пры гэтым пагуляць з рознымі формамі, пашукаць тую самую, якая ўтварае нейкі цэласны і арганічны вобраз.

Каб нешта зрабіць з гліны, патрэбна не проста фантазія, якая б нараджала вобразы, але і майстэрства працы з гэтым матэрыялам, каб тое, што з яго зробіць аўтар, нараджала ў гледача думкі, абуджала ўяўленне і несла пэўны сэнс. Эксперыменты з формай — важны кампанент сучаснага мастацтва, таксама як і пошукі новага сэнсу.

— Паўтор — гэта ўласцівасць керамічных метадаў адлюстравання (фармоўка, ліццё, штампоўка), — лічыць Ганна Апалайка. — Гэтае ўзаемадзеянне паміж арыгіналам і копіяй стала цудоўнай глебай для мастакоў-керамістаў, якія працуюць у жанры інсталяцыі. Новыя формы адлюстравання, такім чынам, — гэта па-ранейшаму праца з формай.

Ларыса ЦІМОШЫК.
На фота:
1. Алесь Костка. Беларускае.
2. Ганна Амбросава. Ваза.

2

Сварка давяла да несапраўднага мініравання

У судзе будзе разбірацца ўчынак пенсіянера з Клімавічаў. За несапраўднае паведамленне пра мініраванне яму пагражае пакаранне да 5 гадоў зняволення.

Напрыканцы мая, калі ў раённым цэнтры на беларуска-расійскім памежжы праходзіў міжнародны фестываль дзіцячай творчасці, 63-гадовы мясцовы жыхар паведаміў у міліцыю, што ў гарадскім парку рыхтуецца выбух, і нават назваў імя зламысніка. У той час у Клімавічах было шмат гасцей, а парк па традыцыі стаў цэнтральным месцам фестывальных падзей. Туды можна было прайсці толькі праз металадэтэктары, але, тым не менш, праваахоўныя службы яшчэ раз пільна праверылі парк і не знайшлі нічога падазронага.

Затое аўтара ананімнага паведамлення ўстанавілі: мужчына спрабаваў зрабіць знаёмаму, з якім пасварыўся, буйную непрыемнасць. Але атрымалася, што зрабіў яе сабе сам.

Алена КАЗЛОВА.

Без музыкі

засталася моладзь Буда-Кашалёва. Невядомы вырваў дошкі ў аконным праёме дапаможнага памяшканя гарадской летняй танцпляцоўкі, дзе захоўвалася музычнае абсталяванне. Злодзей выкраў мікшэрны пульт «MG 1616 FX YAMAXA», узмацняльнік магутнасці 2500 w, акустычную сістэму, страбаскоп-1500, светлавыя прыборы, DVD-прайгравальнік і іншае. Агульны кошт здабычы «аматара музыкі» — каля Br4 млн.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: rek@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3593. Нумар падпісаны ў 19.30 27 ліпеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12